№ 2 (408) 14 студзеня 2005 www.nn.by

# Наша Ніва

П Е Р Ш А Я Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Э Т А

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

**Гонар і ганьба беларусаў**
Чым нацыя ганарыцца, чаго саромеецца? Апытаньне «НН».
старонка 2

**Леанід Глухоўскі**
Намесьніка Навумава шматзначна адправілі ў адстаўку.
старонка 3

**Як унікнуць разьмеркаваньня**
Старонка студэнта.
старонка 4

**Віктар Юшчанка**
Новы стыль кіраваньня, новая рэзыдэнцыя.
старонка 11

### Адбудова замку ў Любчы

Прадпрымальнік і лясьнічы сваімі сіламі аднаўляюць замак над Нёманам. **Старонка 13**.

### Пануры лятун

У нядзелю ў аўстрыйскім Бад-Мітэрнсдорфе на чарговым этапе Кубку сьвету па скоках з трампліну фін Ян Аханэн можа паставіць рэкорд усіх часоў: 12 выйграных этапаў Кубку за сэзон, што раней нікому не ўдавалася. Новы спорт-ідал ніколі не пасьміхаецца. **Старонка 21**.

### Сьвятло пратэсту

Пратэстанцкія канфэсіі ў сераду выказалі пратэст супраць школьнага падручніка «Асновы бясьпекі жыцьцядзейнасьці», які называе адвэнтыстаў сэктай у адным шэрагу зь «Белым брацтвам». Арышты пастараў, падпольныя друкарні і лясныя служэньні — гэта гісторыя пратэстанцкага руху на Берасьцейшчыне. Памяць пра пакуты савецкага часу дапамагае вернікам сьмялей абараняць свабоду веры. Рэпартаж Веранікі Дзядок з сусьветна вядомых Альшанаў. **Старонка 6**.

### Ёсьць Беларусь, і гэта не абмяркоўваецца

Рэфлексіі пра бягучую палітычную сытуацыю. **Старонка 14**.

### Беларусы абапал Одры

Студэнты ЭГУ ў Нямеччыне. **Старонка 4**.

### Алесь Аркуш

Падборка новых вершаў. **Старонка 18**.

### Найлепшыя фільмы году

Рэйтынг «НН». **Старонка 9**.




# Рукі палітыкаў

## Прадпрымальнік ці крымінальнік?

Знакавы суд у Воршы: дзяржава мусіць прайграць

14 студзеня ў Воршы мае адбыцца суд над мясцовым прадпрымальнікам Яўгенам Бурынскім. Хутчэй за ўсё, яго прызнаюць невінаватым. Гэта калі справа дойдзе да суду — ранейшыя спробы прыцягнуць да крымінальнай адказнасьці прадпрымальнікаў, якія, як Бурынскі, ня сплачваюць страхавых унёскаў у фонд сацыяльнай абароны (прыкладна 40 тысяч рублёў у месяц), заканчваліся яшчэ ў пракуратуры, якая спыняла справу за адсутнасьцю складу злачынства.

«Ва ўладаў гэта ўжо ператвараецца ў звычку — спрабаваць прыцягнуць да судовай адказнасьці індывідуальных прадпрымальнікаў паводле артыкулу 216 Крымінальнага кодэксу (нанясеньне маёмаснай шкоды без прыкметаў крадзяжу), — кажа адвакат Гары Паганяйла. — Падобныя справы ўжо былі ў Барысаве і ў Лепелі — мы выйгралі абедзьве».

Паводле словаў спадара Паганяйлы, калі прадпрымальнік не зарэгістраваўся як платнік адлічэньняў у Фондзе сацыяльнай абароны, дык ён павінен несьці толькі адміністрацыйную адказнасьць — як чалавек, які нясвоечасова зарэгістраваўся. Але ён ня мае аніякіх абавязкаў перад Фондам, як і Фонд — перад ім. Нейкія санкцыі могуць быць прыменены толькі тады, калі прадпрымальнік зарэгістраваны ў Фондзе.

«40—50% прадпрымальнікаў на ўлік дагэтуль ня сталі», — сьцьвярджае Анатоль Шумчанка, старшыня рэспубліканскага грамадзкага аб'яднаньня «Пэрспэктыва». «Чаму іх усіх ня судзяць? Дзяржава дзейнічае выбарачна. У Лепелі прадпрымальнік Алена Буртыль, якая ўдзельнічала ў выбарчай кампаніі незалежнага кандыдата Алега Тычыны, мела такія ж праблемы. Яна зьвярнулася да Гары Паганяйлы, той склаў патрэбныя дакумэнты — і неўзабаве з пракуратуры прыйшоў адказ: справа зачыненая. Выплата гэтых унёскаў — гэта фактычна дадатковы падатак».

Плаціць яго прадпрымальнікі ня дужа ахвочыя. «Ёсьць досыць вялікая катэгорыя грамадзянаў, якія лічаць, што Фонд сацыяльнай абароны насамрэч служыць не для забесьпячэньня іх пэнсіямі, а для фінансаваньня пэўных інвэстыцыйных праектаў, і не жадаюць мець зь ім справы», — кажа Паганяйла.

Працяг на старонцы 3.

### Дык падпісвайся!

Падпісны індэкс «Нашай Нівы» 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку». Цана на месяц — 3820 рублёў на поштах або 3530 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень. Чытай сваё!

## Паблыталі сябе з амёбамі

Шляхам дзяленьня размнажаюцца амёбы. Палітычныя партыі дзяленьнем разбураюцца. Гэтым разам з прасьцейшымі жывёламі клясы караняножак сябе пераблытала Народная грамада. Мінюст падтрымаў Нісьцюка.

Канфлікт у Народнай грамадзе разгарэўся паміж дзьвюма групамі. Першая гуртуецца вакол Міколы Статкевіча, другая — вакол Уладзімера Нісьцюка. Казаць пра партыйныя пасады гэтых асобаў варта цяпер з доляй асьцярожнасьці. 8 сьнежня Менскі гаркам БСДП (НГ) пастанавіў выключыць з партыі Уладзімера Нісьцюка, Віталя Малашку і Юр'я Маркоўскага (намесьнікаў старшыні).

Працяг на старонцы 2.

# Паблыталі сябе з амёбамі

Працяг са старонкі 1.

11 сьнежня Менскі гаркам зноў сабраўся на пасяджэньне (у іншым складзе) і выключыў з партыі Статкевіча.

З такой сытуацыі скарыстала Міністэрства юстыцыі. Яно палічыла правамоцным выключэньне з Народнае грамады Статкевіча і прызнала выканаўцам абавязкаў старшыні партыі Нісьцюка.

Цяпер У.Нісьцюк займаецца падрыхтоўкай да пазачарговага зьезду партыі, які адбудзецца 15 студзеня, а М.Статкевіч вінаваціць улады ў правакацыі і рыхтуецца да сыходу ў падпольле. «Партыя ацаніла гэта так: Лукашэнка прызначыў нам старшыню», — кажа ён.

У той жа час, са словаў Статкевіча складаецца ўражаньне, што ён амаль зьмірыўся са «стратай» партыі. Маўляў, калі не пазбавяць рэгістрацыі ў выніку цяперашняга канфлікту, дык адбяруць пасьведчаньне пасьля 2 лютага, калі ўсе структуры партыі маюць быць пераведзеныя з кватэраў у нежылыя памяшканьні. Паводле падлікаў Статкевіча, толькі 4 з 110 структураў маюць шанцы быць зарэгістраванымі адпаведна з новымі патрабаваньнямі. Але Ўладзімер Нісьцюк спадзяецца, што да лютага мець юрыдычны адрас ці хаця б адпаведныя гарантыйныя лісты будзе нашмат больш мясцовых суполак.

«Мабыць, будзе да лепшага, калі партыя пачне працаваць у неафіцыйным статусе, скажам, у выглядзе партыі, якая ствараецца», — кажа Статкевіч. У гэтым сказе хаваецца яшчэ адзін прадмет канфлікту — ягоны намер стварыць новую Аб’яднаную сацыял-дэмакратычную партыю. Гэтыя праекты «групе Нісьцюка» дужа не падабаюцца, бо ўвесь мінулы год вялася праца па аб’яднаньні БСДП (НГ) зь Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамадой. «Але мы гэта робім год, паступова, а Мікалай Віктаравіч вырашыў за месяц стварыць нейкую аб’яднаную сацыял-дэмакратычную партыю невядома дзеля каго і дзеля чаго. У нашай партыі большасьці за ім няма, а ў новай партыі ён — адзіная вядомая асоба, таму і будзе лічыцца вялікім стваральнікам», — кажа Нісьцюк.

Ідэю яднаньня беларускай сацыял-дэмакратыі Статкевіч ацэньвае пэсымістычна: «Гэта той працэс, да якога трэба імкнуцца, але завершаны ён ня будзе ніколі. З маёй ініцыятывы зьезд БСДП (НГ) летам прымаў адпаведнае рашэньне. Я правёў перамовы з усімі левацэнтрысцкімі партыямі, і з боку большасьці зь іх сустрэў разуменьне — але потым усе гэтыя людзі сутыкнуліся з адной і той жа праблемай — амбіцыямі ня лідэраў, а другіх, трэціх, чацьвёртых асобаў. Праблему намесьнікаў мы ня вырашылі».

«Манархічны стыль кіраваньня» — адзін з закідаў Нісьцюка Міколу Статкевічу. «Мой стыль кіраваньня цалкам дэмакратычны ў межах статуту», — сьцьвярджае Статкевіч. «Я не гуляю ў палітыку і не займаюся імітацыяй. Зараз сытуацыя такая, якая патрабуе рызыкі, ахвяраў, а людзям хочацца захаваць статус, у сэмінарах удзельнічаць, змагацца ў памяшканьнях, калі трэба выходзіць на вуліцы». Цікава, што Статкевіча скінулі неўзабаве пасьля таго, як ён пайшоў на кантакты зь «Пяцёркай+» дзеля вылучэньня адзінага кандыдата на выбары-2006.

Іншы бок абвінавачвае былога старшыню ў «кабінэтнасьці»: «Партыя павінна зьмяніць свой твар, ад партыі, якая ў асобе Міколы Статкевіча клікала людзей на вуліцу, а зараз заклікае да нейкіх незразумелых ахвяраў, да партыі, якая будзе працаваць нагамі, але больш — галавой». Паводле Нісьцюка, у партыі каля 1 500 актыўных сяброў.

Нават палітычнаму аглядальніку разабрацца ў хітрасплятаньнях партыйных дачыненьняў сацыял-дэмакратаў складана — тут хаця б назвы партыяў не пераблытаць! Шкада, што сацыял-дэмакратычнай ідэі ў Беларусі не чуваць за гучнымі «разборкамі» лідэраў.

**Алесь Кудрыцкі**



PHOTO.BYMEDIA.NET

Яшчэ да расколу Ўладзімер Нісьцюк глядзеў праз галаву Міколы Статкевіча.

# Гонар і ганьба беларусаў

Чым ганарыцца, чаго саромецца беларусам? На пытаньне «НН» адказваюць дзеячы культуры.

**Ігар Бабкоў,** філёзаф:

— Беларусы маглі б ганарыцца тым, у чым яны ня бралі ўдзелу: у крыжовых паходах, заваяваньні Амэрыкі і генацыдзе індзейцаў. Або ў прыгнёце і каляніяльнай палітыцы ў дачыненьні да «трэцяга сьвету». Парадокс, але гэтая неприсутнасьць беларусаў у гісторыі цяпер можа выступіць і плюсам. Бо гэтая гісторыя — гэта гісторыя гвалту, прыгнёту, і апошнія 10—20 гадоў адбываецца ва ўсім сьвеце своеасаблівае падсумаваньне крыўдаў.

Але і саромецца мусім таго ж самага — няўдзелу ў справах. Гэтакая адсутнасьць беларусаў у гісторыі. Альбо прысутнасьць беларусаў у гісторыі, але пад маскай іншых. Як, напрыклад, лічыцца, што Маскву заваёўвалі і рабавалі палякі зь літоўцамі...

**Алесь Бяляцкі,** праваабаронца:

— Беларусы шмат чым могуць ганарыцца: і вялікімі культурнымі дасягненьнямі, і дасягненьнямі цывілізацыйнымі, і тэхнічнымі. Гэта красьлюнкі і касьмічных ракет, і падводных лодак. І тое, што беларус першым распрацаваў праект Суэцкага каналу. Мы дастаткова шмат унесьлі ў сусьветную культуру — і духоўную, і матэрыяльную. Урэшце, мы можам ганарыцца паводзінамі беларусаў у Другую сусьветную вайну. Так, наш народ ціхмяны і баязьлівы. Але калі ўжо прыпірае, дык тады ляцяць усе правілы і ўсе моманты стрымліваньня адыходзяць. І сотні тысяч людзей бралі ўдзел ва ўзброеным супраціве, ня ведаючы, чым гэта ўсё скончыцца… Не было ж пэўнасьці, хто пераможа.

А саромецца павінны недаацэнкі сваёй культурнай мінуўшчыны, свайго «я». Тое, што мы цяпер фактычна сваімі рукамі закопваем сваю мову… Гэта проста жахліва.

Працяг на старонцы 16.

# Самая пазытыўная трасянка




«Радыё «Крамбамбуля» 0,33 FM». «Крамбамбуля», «Вэст Рэкардз», 2004

«Крамбамбуля» стварыла ўласную радыёстанцыю, дзе і сочыць за нормай 75% беларускае музыкі. Рэшта — чатыры песьні па-азэрбайджанску ў выкананьні Гюнэш Абасавай і адна па-ўкраінску: «Сусядоў» Вольскі сьпявае дуэтам з Кузьмой з «Скрабіна». Самая пазытыўная трасянка.

Хоць дыск і зьмяшчае 12 трэкаў з кліпамі, фота, рынгтонамі для мабільных тэлефонаў, гэта не нумарны альбом «Крамбамбулі». «Радыё «Крамбамбуля» знаёміць слухача зь песьнямі з будучых праектаў — «Сьвяточнага альбому», «Азіяцкага» ды «Інтэрнацыянальнага».

У запісе кружэлкі ўзялі ўдзел 20 музыкаў! Праўда, гіта калібру «Гасьцей» тут няма.

Беларусь ужо пачула новыя песьні з альбому — пры канцы году «Крамбамбуля» дала калядны тур. Цяпер чарга за Ўкраінай — у лютым—сакавіку гурт мае паказаць свае новыя песьні і там.

**Сяргей Будкін**

## Сьцежкі праз Strangeland



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Сяржук Сокалаў-Воюш напісаў твор пра вампіраў, але разьлічаны зусім не на аматараў гісторый пра вампіраў. Старонка 19.**

САЛІДАРНАСЬЦЬ

## Дапамога пацярпелым ад цунамі

ААН працягвае кампанію дапамогі насельніцтву Азіі, якое пацярпела ад цунамі. Беларусы могуць пераказваць ахвяраваньні на рублёвы або валютны рахункі Прадстаўніцтва ААН у Беларусі:

УНП 102099485, рублёвы рахунак: 3021207010114, валютны рахунак: 3024207015002 у філіі №0111 ААТ «Прыёрбанк», МФО код 228 з пазнакай «Ахвяраваньні пацярпелым ад цунамі».

## Падпіска на «ARCHE»

**На часопіс можна падпісацца на кожнай пошце. Падпісны індэкс 00345. Цана нумару 2360 рублёў.**

# Беларуская зіма



Сёлетні студзень пабіў усе рэкорды па цеплыні. 11 студзеня ў Менску сыноптыкі зафіксавалі 9,2 градуса цяпла — абсалютны рэкорд для гэтага месяца за ўвесь час назіраньня (у Менску мэтэаралягічная станцыя дзейнічае з 1846 году). Дагэтуль самым цёплым лічыўся гэты месяц у 1975 годзе: тады 6 студзеня зафіксавалі 7,8 градуса вышэй за нуль. Уласна для 11 студзеня самым цёплым быў 1991 год (+6,9°С), а самым халодным — 1950 (–34,9°С).

Прычынай сёлетняга пацяпленьня, ад якога папрачыналіся зь зімовай сьпячкі мядзьведзі, барсукі й вожыкі, сталі цёплыя паветраныя масы з Атлянтыкі. Дзе-ндзе ў Беларусі тэмпэратура была нават вышэйшай за сталічную: у райцэнтры Беразіно сягала 10 градусаў.

Пімен Панчанка калісьці пісаў, што беларусы ганарацца не «карэлеўскімі пальмамі», а «партызанскімі соснамі». Яшчэ пару дзесяцігодзьдзяў парніковага эфэкту, і акурат будзе мяняць структуру лесапасадак.

**На фота: менская мэрыя як прадчувала цёплую зіму. Мармур, пацёмкінскія лесьвіцы і... пальмы. Гэтым беларуская сталіца стала падобнаю да эўрапейскіх.**

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Мундзір – у шафу

## Намесьніка Навумава шматзначна адправілі ў адстаўку

Генэрал-маёр міліцыі Леанід Глухоўскі здымае ўніформу — прэзыдэнцкім указам ад 6 студзеня прыпынена ягоная служба ў органах унутраных справаў. Указ таксама вызваліў Глухоўскага з пасады намесьніка міністра ўнутраных справаў — начальніка Галоўнага кіраўніцтва папярэдняга расьсьледаваньня МУС. Прычына гэтых зьменаў у кар'еры генэрала, на першы погляд, банальная — абраньне дэпутатам палаты прадстаўнікоў. Аднак, ёсьць тут і падводныя камяні.

Раней Глухоўскі пасьпяхова спалучаў дэпутацтва ў «палаце» папярэдняга скліканьня са сваімі пасадамі. Ягоная адстаўка насьцярожвае яшчэ і таму, што ў кастрычніку 2002 г. Глухоўскі ўжо быў часова адхілены ад сваёй пасады. Тады Лукашэнка прыняў гэтае рашэньне пасьля нарады зь «сілавікамі». Паведамлялася, што асабліва ўважліва падчас гэтай гутаркі абмяркоўваліся пытаньні расьсьледаваньня крымінальных справаў некаторых камэрцыйных структураў, зьвязаных з цэлюлёзна-папяровай прамысловасьцю на Гомельшчыне. Прэзыдэнту паведамілі, што некаторыя супрацоўнікі праваахоўчых органаў лабіравалі інтарэсы бізнэсоўцаў, а шэраг крымінальных справаў у гэтай сфэры расьследаваўся неналежным чынам.

Тэрмінова была створаная камісія зь неабмежаванымі паўнамоцтвамі, перад якой паставілі задачу выкараніць заганную практыку. Узначаліў камісію старшыня Камітэту дзяржкантролю Анатоль Тозік. Пра непасрэднае дачыненьне Глухоўскага да лабіраваньня ніколі нічога наўпрост не заяўлялі, аднак на час дзейнасьці камісіі ён быў адхілены ад пасады.

У прэсе пачалі нараджацца розныя вэрсіі, якія круціліся вакол ААТ «Гомельшпалеры». Зьявіліся паведамленьні пра тое, што Глухоўскі, адзін з самых набліжаных да Аляксандра Лукашэнкі людзей, нібыта актыўна прабіваў інтарэсы камэрсантаў, якія жадалі супрацоўнічаць з «Гомельшпалерамі». Паводле гэтых публікацыяў, кіраўніцтва «Гомельшпалераў» адмовілася ад сумнеўнага супрацоўніцтва, пасьля чаго прадпрыемствам зацікавіліся сьледчыя органы. Прать нейкі час да іх падключыўся КДК, які заняўся ня толькі



PHOTO.BYMEDIA.NET

«Гомельшпалерамі», але й ягонымі няспраўджанымі партнэрамі. Паводле іншых меркаваньняў, камісія Тозіка «распрацоўвала» ня столькі сувязь Глухоўскага з «Гомельшпалерамі», колькі ягоныя магчымыя інтарэсы ў нафта-газавай галіне. У любым выпадку, Глухоўскага на пасадзе ўзнавілі, а праца камісіі скончылася бяз гучных санкцыяў.

Народжаны ў Чарджоў (Туркмэністан), Глухоўскі сваю кар'еру ў беларускіх органах пачынаў сьледчым УУС Гомельскага аблвыканкаму, дзе даслужыўся да намесьніка кіраўніка. Пасьля пераводу на працу ў цэнтральны апарат МУС Глухоўскі адзначыўся сваімі стрымана-пэсымістычнымі выказваньнямі пра адмену ў хуткім часе пакараньня сьмерцю, асабістай прысутнасьцю на шэрагу масавых акцыяў апазыцыі (у якасьці назіральніка) ды зьедлівымі камэнтарамі наконт працэсу над Міхаілам Чыгіром, якія прывялі да асабістай непрыязнасьці паміж імі. Чыгір казаў, што заявы Глухоўскага, які тады ўзначальваў Сьледчы камітэт МУС, пабудаваныя на «лжы і нянавісьці» да яго. Цікавы факт: Глухоўскі, разам зь міністрам гандлю Аляксандрам Кулічковым, быў у тэндэрнай камісіі, якая летась у сьнежні адбірала пастаўшчыкоў цыгарэтаў у Беларусь на 2005 г.

Ня выключана, што нядаўняя адстаўка Глухоўскага сьведчыць пра чарговы ўсплёск барацьбы за перадзел сфэраў уплыву паміж «сілавікамі» і чынавенствам у цывільным. Прынамсі, расьследаваньні апошняга часу пацьвярджаюць тое, што лабіраваньне бізнэс-інтарэсаў праз сілавыя органы вядзецца досыць актыўна, што выклікае вялікую заклапочанасьць дзяржавы.

**АК**

## СЬЦІСЛА

### У сусьветнай дваццатцы

Беларусь застаецца ў дваццатцы найбуйнейшых экспарцёраў зброі ў сьвеце, заявіў у сераду ў інтэрвію радыё «Свабода» начальнік упраўленьня кампаніі «Белтэхэкспарт», якая займаецца пастаўкамі зброі за мяжу, Вячаслаў Шэйда. Беларускі МЗС у сваёй гадавой справаздачы не падае краінаў, у якія прадаецца беларуская зброя.

### Першае папярэджаньне за 75%

Міністэрства інфармацыі вынесла папярэджаньне радыёстанцыям «Хіт-FM», «Юністар» і «Новае радыё». Яны не дацягваюць да квоты 75% на беларускую музыку.

### Забарона на размовы па мабільніку

МУС ініцыюе ўвядзеньне пакараньня за размову па мабільным тэлефоне падчас руху. Таксама будзе ўзмоцненая адказнасьць за кіраваньне ў п'яным выглядзе. Новыя правілы маюць быць прынятыя ў 1-м квартале 2005 г. Яны будуць адпавядаць нормам Эўразьвязу.

### Марыніч на Валадарцы

Міхаіл Марыніч пераведзены са сьледчага ізалятару КДБ у СІЗА па вул.Валадарскага ў Менску — славуты Пішчалаўскі замак.

### Мабільны тэлефон шкодзіць дзецям

Гэта сьцьвярджаецца ў апублікаваным у аўторак дакладзе брытанскіх мэдыкаў. Асабліва шкодны ён для малых дзяцей ад 3 да 10 гадоў, у якіх яшчэ не сфармаваліся косткі чэрапу й нэрвовая сыстэма. Выклікае галаўныя болі, аслабленьне памяці, клопаты з сном, нават павялічвае лічбу захворваньняў на рак. Прычынай усяму — электрамагнітныя хвалі. Даклад меў шокавы эфэкт. Некаторыя кампаніі ўжо спынілі продаж простых «мабілаў», разьлічаных на дзяцей.

### ТБ для тожа-беларусаў

У лютым распачынае працу спадарожнікавы тэлеканал «Беларусь-ТБ», які будзе трансьлявацца на замежжа. Канал будзе выходзіць па-беларуску і па-расейску.

### Эўрапарлямэнт ухваліў Канстытуцыю

Эўрапарлямэнт у сераду ўхваліў Канстытуцыю Эўропы: «за» — 500, «супраць» — 137, устрымаліся — 40 парлямэнтараў. Працэс ратыфікацыі, якая пакуль ухвалена парлямэнтамі Літвы і Вугоршчыны, можа расьцягнуцца на два гады.

**АШ, МБ, БелаПАН, svaboda.org**

# Прадпрымальнік ці...

**Працяг са старонкі 1.**

Прадпрымальнік Аркадзь гандлюе на адным зь менскіх рынкаў. «Я ў Фондзе не рэгіструюся і ўнёскі плаціць не зьбіраюся, — кажа ён. — Гэта прымус, а чалавек сам мае вырашаць свой лёс: хочаш, атрымлівай дзяржаўную пэнсію, хочаш — у банк адкладай, хочаш — у панчоху. Можа, заўтра кагосьці скінуць з улады — і фонд той рассыплецца».

Неўзабаве варта чакаць новых спробаў дзяржавы забясьпечыць выплату ўнёскаў у Фонд сацыяльнай абароны. Праз скарот насельніцтва ў 2007 г. у Беларусі можа выбухнуць крызіс пэнсійнай сыстэмы — аднаму працаздольнаму чалавеку давядзецца ўтрымліваць аднаго пэнсіянэра. Магчымае выйсьце — пераход ад цяперашняй разьмеркавальнай сыстэмы пэнсіяў, калі працуючыя ўтрымліваюць пэнсіянэраў, да назапашвальнай, калі чалавек усё жыцьцё кладзе грошы ў нейкі фонд. Але да гэтага не сасьпела ні дзяржава, для якой гэтая сыстэма выглядае занадта капіталістычнай, ні людзі: фондам яны ня дужа давяраюць.

**Алесь Кудрыцкі**

## ВЫГАДНЫ ПАРАДОКС

Калі прадпрымальнік не зарэгістраваўся як платнік адлічэньняў у Фондзе сацыяльнай абароны, дык ён павінен несьці толькі адміністрацыйную адказнасьць — як чалавек, які нясвоечасова зарэгістраваўся. Нейкія крымінальныя санкцыі могуць быць прымененыя толькі тады, калі прадпрымальнік зарэгістраваны ў Фондзе.

# «Разьмеркаваньне – гэта рабства»

Беларускія камсамольцы пачалі кампанію супраць прымусовага разьмеркаваньня.



**Зьміцер Яненка, лідэр Камсамолу, нагледзеўся на ўмовы працы маладых спэцыялістаў, калі ішоў кандыдатам у дэпутаты па Лагойскай акрузе.**

Лідэр Ленінскага камуністычнага саюзу моладзі Беларусі, студэнт адной зь менскіх ВНУ Зьміцер Яненка сам плаціць за вучобу, і разьмеркаваньне яму не пагражае. Аднак гэта не замінае яму бараніць правы студэнтаў: «Калі Аляксандар Лукашэнка кажа пра адпрацоўку на карысьць дзяржаве, ён забываецца, што кожны мае права на бясплатную адукацыю паводле Канстытуцыі».

На студзеньскім пленуме ЦК ЛКСМБ актывісты арганізацыі вырашылі пачаць збор подпісаў супраць павелічэньня тэрміну (з двух да пяці год) абавязковай адпрацоўкі па разьмеркаваньні для выпускнікоў ВНУ.

«Гэта добра, што дзяржава дбае пра маладых людзей, але ня трэба змушаць іх ехаць у загадным парадку, пагатоў на пяць гадоў. Гэта ўжо на рабства падобна», — кажа З.Яненка. Камсамольцы так і назвалі сваю акцыю — «Моладзь супраць рабства». Яны паставілі сабе задачу за студзень—сакавік сабраць болей за 10 000 подпісаў па ўсёй краіне і перадаць іх у палату прадстаўнікоў, дзе мае разглядацца папраўка ў Закон аб адукацыі аб павелічэньні тэрміну. Праўда, заклік ЦК ЛКСМБ ня тычыцца тых, хто вучыцца па г.зв. «мэтавым накіраваньні».

Юрыст Сяргей Зікрацкі кажа, што ні кіраўніцтва ВНУ, ні нехта іншы ня мае права накладаць санкцыі за адмову выпускніка ехаць па разьмеркаваньні. Студэнт папросту можа не зьявіцца на сваю мусовую працу, аднак тое прадпрыемства, на якое ён уладкуецца, мусіць у гэтым выпадку вярнуць грошы за вучобу выпускніка. Выходзіць, што першыя два гады па сканчэньні ВНУ яму самому не належаць, хоць выбар ёсьць: працаваць на сяле, біць лынды ці шукаць прадпрыемства, якое гатова заплаціць дзяржаве некалькі тысяч даляраў.

«Студэнт заўсёды знойдзе як выкруціцца, — мяркуе рэдактар «Студэнцкай думкі» Сяржук Сахараў, — а калі тэрмін адпрацовак падвысяць да пяці, дык ён яшчэ актыўней заварушыцца». Сахараў бачыць два найбольш прымальныя варыянты, над якімі можа задумацца студэнт перадапошняга курсу ВНУ: зьехаць за мяжу, дзе можна скончыць адукацыю і пэрспэктываў куды болей, ці самастойна пераведсціся на платную аснову на апошні курс: «Вось і адрубіў хвост з разьмеркаваньнем».

Беларускія камсамольцы настроены па-баявому: «Мы будзем намагацца, каб пра гэту праблему дазналіся як мага болей людзей». Пры пісьменнай каардынацыі акцыя пераўтварыцца ў агульнастудэнцкую кампанію. Аб гатоўнасьці падтрымаць кампанію карэспандэнту «НН» заявіла старшыня Задзіночаньня беларускіх студэнтаў Вольга Кузьміч.

Беларусь — адна зь нешматлікіх краін у сьвеце, дзе існуюць падобныя адпрацоўкі. Добраахвотнае разьмеркаваньне студэнтаў пасьля вучобы існуе ў Нямеччыне, але толькі па трох спэцыяльнасьцях: настаўнік, юрыст і доктар. Гэтыя прафэсіі — адны з самых высокаплатных на дзяржаўнай службе, таму выпускнікі-бюджэтнікі нават выстройваюцца ў чаргу, каб адпрацаваць. Такая ж завядзёнка існуе ў некаторых прыватных амэрыканскіх каледжах, у асноўным сельскагаспадарчай скіраванасьці. Але там праца пасьля сканчэньня вучобы — сьвядомы выбар студэнта.

**Сяргей Будкін**

КАМЭНТАР

### Адукацыя фінансуецца з падаткаў, таму студэнт нікому не вінаваты

**Намесьнік старшыні Партыі БНФ Алесь Міхалевіч, колішні старшыня Задзіночаньня беларускіх студэнтаў: «Трэба патрабаваць не зьмяншэньня тэрміну прымусовай адпрацоўкі, а адмены разьмеркаваньня наагул. За вучобу плацяць бацькі студэнта, нават калі ён вучыцца на бюджэтнай аснове, бо падаткі, зь якіх фінансуецца адукацыя, плацяць усе».**

# Беларусы абапал Одры

Дзясяткі студэнтаў зачыненага ўладамі Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту расьцярушаныя па ўсім сьвеце — яны навучаюцца ў Баўгарыі, ЗША, Польшчы, Расеі, Францыі. 40 чалавек прытуліў унівэрсытэт «Віядрына», што ў нямецкім Франкфурце-на-Одры.



НАТАЛЬЛЯ МАЛІНОЎСКАЯ

**Карпусы і інтэрнаты унівэрсытэту «Віядрына» разьмяшчаюцца абапал Одры — і ў Нямеччыне, і ў Польшчы.**

Унівэрсытэт «Віядрына» (з лац. — «над Одрай») быў заснаваны на пачатку XVI ст. і цягам 300 гадоў быў адзінай вышэйшай навучальнай установай зямлі Брандэнбург. Зь яго сьценаў выйшлі такія знакамітасьці, як браты Гумбальты, Томас Мюнцэр, Генрых Кляйст. У 1811 г. пасьля адкрыцьця ўнівэрсытэту ў Бэрліне і сыходу ў прускую сталіцу прафэсараў унівэрсытэту «Віядрына» была зачынена.

Другое яго адкрыцьцё адбылося ў 1991 годзе. Гэта ўжо былі іншыя часы: ня стала жалезнае заслоны, зноў аднавіў дзейнасьць мост, які злучае нямецкі Франкфурт-на-Одры з польскім горадам Слубіцы. Да вайны Слубіцы былі зарэчным прадмесьцем Франкфурту.

Дарэчы, карпусы і інтэрнаты «Віядрыны», якая цяпер складаецца з трох факультэтаў — права, эканомікі, культуралегіі, — разьмяшчаюцца абапал ракі — і ў Нямеччыне, і ў Польшчы.

А дзяржаўная мяжа на мосьце цераз Одру для грамадзян аб'яднанай Эўропы сымбалічная. Неабходна толькі паказаць пашпарт або пасьведчаньне кіроўцы. Беларускія студэнты, якія вучацца ў Франкфурце, а жывуць у Слубіцах, паказваюць толькі студэнцкі білет.

## Навучаньне

Прывіталі студэнтаў былога ЭГУ з усімі пашанамі. На вакзале іх сустрэлі з хлебам і сольлю. Ужо ў першы дзень беларусы былі прыняты прэзыдэнтам унівэрсытэту (і кандыдаткай на прэзыдэнта Нямеччыны на апошніх выбарах) Гезінай Шван і обэр-бургамістрам Марцінам Патцэльтам. «Я вельмі шчасьлівая, што студэнты ЭГУ могуць вучыцца ў нашым унівэрсытэце», — заявіла падчас прывітальнай прамовы спн.Шван.

Сыстэма навучаньня ў Нямеччыне адрозная ад беларускай. Студэнт сам выбірае курсы і парадак іх праходжаньня, таму ў адной групе па нейкай дысцыпліне могуць быць студэнты розных курсаў. Іспыты здаюцца ў пісьмовай форме. Да такой сыстэмы самакантролю гатовыя ня ўсе студэнты — выхадцы з былога СССР.

Перад навучаньнем замежныя студэнты здаюць моўныя тэсты. Калі ўзровень ведаў нямецкай мовы вельмі слабы або вельмі добры, то далейшае навучаньне бясплатнае, пры сярэднім узроўні за навучаньне трэба ўнесьці невялікую плату. Згадаем таксама, што студэнты-беларусы маюць праграмы навучаньня ЭГУ, але і будуць праходзіць ад двух да шасьці курсаў нямецкага ўнівэрсытэту.

## Лагода

Беларусаў узялі пад апеку студэнты з арганізацыі «Лагода» — напачатку трэба было вырашыць шмат праблем: арганізацыю страховак, выдачу студэнцкіх білетаў, якія дае права карыстацца ўсімі сродкамі грамадзкага транспарту ў Брандэнбурзе.

Студэнтаў разьмясьцілі ў інтэрнаце, па адным чалавеку ў пакоі. Душ адзін на два-тры пакоі, кухня — на тры-пяць.

Каб дапамагчы беларусам наладзіць гаспадарку, адміністрацыя ўнівэрсытэту разам са студэнтамі-валянцёрамі арганізавала сярод жыхароў гораду збор неабходных рэчаў. Людзі прыносілі бытавую тэхніку, а некаторыя дзеля дапамогі беларусам, нават прыехалі зь іншых гарадоў.

Валянцёры «Лагоды» ладзілі зь першых дзён вандроўкі на роварах па навакольлі, сумесныя паходы ў кавярні і прагляды фільмаў. «Каб спазнаць нямецкае студэнцкае жыццё ды лепей вывучыць мову, студэнтам трэба выходзіць са свайго замкнёнага кола, імкнуцца дзейнічаць у іншых студэнцкіх арганізацыях. Тут жа адбываецца столькі цікавага!» — упэўнены Фэлікс Акерман, асьпірант, які апякуецца студэнтамі факультэту культуралегіі.

Не забываюцца студэнты ЭГУ і на палітыку. У лістападзе разам зь нямецкімі калегамі зладзілі дыскусію пра сытуацыю ў Беларусі, на якую запрасілі былога старшыню КНГ АБСЭ ў Беларусі Ганса-Георга Віка, сп.Лізэганга, назіральніка на парлямэнцкіх выбарах у Беларусі, ды прафэсуру ўнівэрсытэту, што займаецца пытаньнямі Ўсходняй Эўропы.

Якім будзе лёс будучых студэнтаў гэтай навучальнай установы, пакажа час. Спн.Шван настроена аптымістычна: «Я веру, што ЭГУ яшчэ вернецца ў Беларусь. І станецца гэта вельмі хутка».

**Надзея Галубовіч,**
**Франкфурт-на-Одры**

# Біржавы трэйдынг у Беларусі

Працэс ператварэньня дробнага банкаўскага клерка ў буйнога бізнэсоўца, што гандлюе акцыямі, апісаў у «Фінансісьце» яшчэ Драйзэр. З таго часу нічога не зьмянілася — індустрыя біржавога трэйдынгу дае кожнаму шанец стаць новым Сорасам. У Беларусі разьвіцьцю біржавога бізнэсу замінае заканадаўства. Аналізуе **Раман Мамчыц**.

Беларускі фінансавы рынак мае сваю спэцыфіку, абумоўленую спэцыфікай беларускай эканомікі. Асноўная частка фінансавых інструмэнтаў Беларускай валют-на-фондавай біржы — дзяржаўныя каштоўныя паперы: дзяржаўныя кароткатэрміновыя аблігацыі і акцыі прадпрыемстваў, асноўным інвэстарам (акцыянэрам) у якіх выступае дзяржава. Нізкая ліквіднасьць гэтых каштоўных папер значна ўскладняе іх фундамэнтальны аналіз і робіць амаль немагчымым тэхнічны аналіз.

Тое самае можна сказаць і пра беларускі ўнутраны валютны рынак, які рэгулюецца ў вельмі малой ступені дынамікай біржавых зьдзелак і ў вельмі вялікай — палітыкай Нацбанку. Таму айчынныя фінансавыя рынкі непрывабныя нават для айчыннага інвэстара, ня кажучы пра замежных.

Ва ўсім сьвеце спэкуляцыі на сусьветных фінансавых рынках разглядаюцца як альтэрнатыўнае інвэставаньне. Калі ў бізнэсоўца ўзьнікаюць акалічнасьці, якія перашкаджаюць яму займацца традыцыйным для яго відам прадпрымальніцкай дзейнасьці, ён можа зьвярнуць увагу на рынкі, якія валодаюць абсалютнай ліквіднасьцю, — у першую чаргу «Forex», «Nasdaq», «Amex», «Nyse», ды некаторыя таварныя рынкі, у прыватнасьці золата і нафты.

Ацаніць колькасьць беларускіх інвэстараў, якія гандлююць на гэтых рынках, немагчыма — прадпрымальнікі вымушаныя ўтойваць крыніцу сваіх даходаў як ад дзяржавы, так і нават ад сяброў.

Найбольшую цяжкасьць зь юрыдычнага гледзішча ўяўляе інвэставаньне ў каштоўныя паперы замежных эмітэнтаў — незалежна ці гэта «General Motors», ці РАТ «АЭС Расеі». Прыватныя асобы, паводле беларускага заканадаўства, ня маюць права займацца такой дзейнасьцю безь ліцэнзіі, а атрымаць гэтую ліцэнзію, паводле слоў беларускіх фінансістаў, цяжка нават камэрцыйным банкам.




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**ХМАРЫ НАД КАЗІНО. У адпаведнасьці з указам прэзыдэнта, у Беларусі выплата выйгрышаў у казіно будзе ажыцьцяўляцца па дакумэнце, які засьведчвае асобу. Гульцоў паменее.**

Больш «пашчасьціла» ўладальнікам міжнародных банкаўскіх картак «Visa» або «American Express», якія карыстаюцца паслугамі буйных замежных брокерскіх кантор. Пажадана, каб гэтая картка была эмітаваная замежным банкам, найпрасьцейшы варыянт — расейскім. Хоць ёсьць альтэрнатыва ў выглядзе набыцьця т.зв. нумарной карткі, у зьвестках якой ня значыцца прозьвішча і каардынаты ўладальніка.

Індустрыя, зьвязаная з гэтымі карткамі, апошнім часам становіцца шырокім полем для рознага кшталту махлярстваў, да таго ж у Беларусі такія карткі наагул забароненыя.

Таксама трэба ўлічваць наступны факт: брокеры з сусьветнай рэпутацыяй маюць звычай дасылаць сваім кліентам па месцы жыхарства ў пачатку кожнага месяца сьпісы трансакцый, які кліент ажыцьцявіў у папярэднім месяцы. Улічваючы тое, што закон аб таямніцы прыватнай перапіскі ў Беларусі фактычна ня дзейнічае, імаверна, што зьмесьціва бандэролі можа трапіць у поле зроку розных структур, якія зробяць з гэтага свае высновы.

Асобная песьня пра «Forex». Спэкуляцыі на гэтым рынку сталі настолькі папулярнымі ў былым Савецкім Саюзе, што нават у сур'ёзных фінансавых расейскамоўных выданьнях выкарыстоўваецца словазлучэньне «форэксны рынак». У краінах СНД асноўную актыўнасьць на гэтым рынку маюць прыватныя інвэстары. Прынамсі, па колькасьці «прыватнікаў» на «Forex» Расея і Ўкраіна даўно перагналі ЗША і Эўропу. У той Украіне тыповы удзельнік рынку «Forex» — гэта ўладальнік дэпазыту на 3—4 тыс. даляраў, які працуе з крэдытным плячом 1:100. Для заходняга трэйдэра апэраваць на рынку з такімі парамэтрамі — суцэльнае вар'яцтва. З гэтых прычын сярод прафэсійных удзельнікаў фінансавых рынкаў у СНД «Forex» набыў некалькі адыёзную рэпутацыю.

У Беларусі першыя структуры, якія займаюцца бракеражам на гэтым рынку, зьявіліся недзе ў 2001—2002 г. Цяпер у нашай краіне дзейнічаюць дзьве фірмы, якія прапануюць паслугі выхаду на гэты рынак і інфармацыйнага забесьпячэньня: менскае прадстаўніцтва «міжнароднага» дылінгавага цэнтру «Forexite» і дылінгавы цэнтар «Forex-Беларусь». Першая фірма — рэгіянальная філія, якая карыстаецца франчайзінгавым пакетам заснаванага быццам бы на тэрыторыі Швайцарыі расейскімі грамадзянамі прадпрыемства. Для Эўропы гэта нармальная зьява, калі большая частка дылінгавых цэнтраў і брокерскіх кантор, якія спэцыялізуюцца на паслугах па рынку «Forex» для прыватных асоб, заснаваны эмігрантамі з постсавецкіх рэспублік. Другая фірма — рэгіянальны філіял казанскага дылінгавага цэнтру «Альпары», які раней функцыянаваў менавіта пад гэтым брэндам.

Абодва гэтыя дылінгавыя цэнтры маюць шырокую сетку філіяў у Расеі і Ўкраіне, ёсьць асобныя філіялы ў Літве, Малдове, Азэрбайджане, цяпер і ў Беларусі. Рэпутацыя гэтых прадпрыемстваў у расейскім фінансавым асяродзьдзі нэўтральная, тым ня менш, вядома, што яны функцыянуюць паводле прынцыпу т.зв. «кухні»: кліенты на рэальны рынак не выводзяцца, гуляючы паміж сабою, як у звычайнай букмэкерскай канторы. Відавочна, зь юрыдычнага боку іх прадпрымальніцкая дзейнасьць зарэгістраваная як букмэкерства.

Затое паводле беларускага заканадаўства даходы кліентаў гэтых брокераў не абкладаюцца падаткам, паколькі лічацца выйграннымі ў букмэкерскай канторы. Гэта, бадай, адзіны станоўчы момант для тых беларусаў, якія вырашылі зьвязаць сваё жыцьцё зь фінансавымі спэкуляцыямі.

## СЬЦІСЛА

### Нам Knauf-аў нямецкіх ня трэба

Нямецкай кампаніі «Knauf» не дазволілі прыватызаваць менскае ААТ «Белгіпс». Мінархітэктуры палічыла за лепшае пакінуць беларускую долю ў прадпрыемстве. Немцы гатовыя былі заплаціць за «Белгіпс» 8,6 млн. даляраў, збольшага — у выглядзе новага абсталяваньня, бо старое ўжо не дазваляе выраблЯць канкурэнтназдольную прадукцыю. Цяпер мадэрнізаваць «Белгіпс» будуць за дзяржаўныя грошы.

### Экспарт-група

Урад пляную стварыць у Эўропе фінансавую групу дзеля разьвіцьця экспарту калійных угнаеньняў ды нафтапрадуктаў — заключаць адпаведныя кантракты. Замежныя банкі — перадусім расейскія і аўстрыйскі «Райфайзэнбанк» — маюць крэдытаваць экспартныя праграмы беларускіх прадпрыемстваў.

### Камплімэнт для МНПЗ

Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод прызналі найлепшым НПЗ краінаў СНД. Адпаведны сэртыфікат кіраўніцтву ўручылі на VIII канфэрэнцыі Ўсясьветнай асацыяцыі нафтаперапрацоўшчыкаў, што прайшла ў Вене. Дзяржава ня мае кантрольнага пакету акцыяў МНПЗ: ёй належаць 42,7% акцыяў, яшчэ 42,5% — «Слаўнафце», а рэшта — супрацоўнікам заводу.

### Бізнэсоўцы-камароўцы

У вёсцы Камарова пад Мядзелам адчынілі Цэнтар разьвіцьця вясковага прадпрымальніцтва, які фінансуецца урадам ды Праграмай разьвіцьця ААН. Там будуць ствараць «бізнэс-мадэлі» арганізацыі фэрмэрскіх гаспадарак ды дробнай вытворчасьці ў вёсцы.

### Амбасады для дзяржпрамысловасьці

МЗС вынайшла новы інструмэнт нарошчваньня экспарту. За мяжой будуць ствараць гандлёвыя кампаніі, чый капітал на 100% будзе знаходзіцца ў руках дзяржавы. Праз гэтыя фірмы будуць прадаваць беларускія тавары за мяжой, а таксама набываць неабходную мясцовую прадукцыю. Асаблівы акцэнт будзе зроблены на краінах Паўднёва-Ўсходняй Азіі, Блізкага Ўсходу, Лацінскай Амэрыкі.

### Арэшкі-разынкі ад «Камунаркі»

«Камунарка» распачынае вытворчасьць шакаляду з разынкамі ды цэльнымі арэхамі. Паводле статыстыкі, штогод на аднаго беларуса даводзіцца каля 1,4 кг прадукцыі «Камунаркі».

### «Мотавэля» нацыяналізуюць

У студзені дзяржава прыме ў сваю ўласнасьць 90% акцыяў ААТ «Мотавэля». Прадпрыемства завінавацілася за электраэнэргію, крэдыты, плацяжы ў бюджэт ды штрафы 11 млрд руб. Раз няма грошай, давядзецца расплочвацца акцыямі.

### Газ падаражэе

Расея падняла цану на газ на 18%. А.Лукашэнка загадаў адпаведна павялічыць тарыфы на транзыт газу. Пакуль гэтага ня зроблена, трэба чакаць росту сабекошту прадукцыі айчынных прадпрыемстваў.

### Нафта праз браўзэр

У Беларусі распачаўся інтэрнэт-гандаль нафтапрадуктамі. Беларускі нафтавы гандлёвы дом — даччынае прадпрыемства «Белнафтахіму» — прадаў па 1 тыс. тон дызэльнага ды рэактыўнага паліва кампаніі «АС Летафін Трэйдынг». Апошняя перамагла на таргах, запрапанаваўшы на ўэб-аўкцыёне найбольшую цану — $372 за тону. У будучыні ўвесь экспартны гандаль нафтапрадуктамі будзе праводзіцца праз Інтэрнэт.

### «Алеся» здалася

Будзе нацыяналізаванае і ААТ «Алеся» — яно так і ня здолела перамагчы фінансавы крызіс. Тры гады таму «Алесю» безвынікова спрабавала выкупіць латвійская фірма «Огрэ». Дзьве трацíны калектыву фабрыкі ўжо разьбегліся: сярэдні заробак на «Алесі» — 200 тыс. рублёў.

**АК; БелаПАН, АФН**

### КУРСЫ ВАЛЮТ

**на 13 студзеня:**

1 амэрыканскі даляр — 2 171 рубель
1 эўра — 2 841,95
1 латвійскі лат — 4 080,06
1 літоўскі літ — 823,19
1 польскі злоты — 698,68
1 расейскі рубель — 77,87
1 украінская грыўна — 408,43

**Паводле Нацбанку**

# Сьвятло пратэсту

Арышты пастараў, падпольныя друкарні і лясныя служэньні — гэта гісторыя пратэстанцкага руху на Берасьцейшчыне. Памяць пра пакуты савецкага часу дапамагае вернікам вастрэй адчуваць асалоду ад свабоды веры і свабоднай працы. Рэпартаж **Веранікі Дзядок** з сусьветна вядомых Альшанаў.

Вёска Альшаны на Століншчыне вядомая заможнасьцю. Мясцовыя жартуюць: увесь бюджэт раёну зарабляецца ў Альшанах. Сюды едуць на працу ня толькі зь беспрацоўнага Століна, але і зь Пінску ды нават Берасьця. Нам пашчасьціла яшчэ на выезьдзе зь Пінску: першыя ж спадарожнікі аказаліся альшанцамі і, вядома ж, сябрамі пратэстанцкай грамады. Таму не ўзьнікла ніякіх праблем, калі на паўдарозе машына зламалася: спадарожнік выйшаў на дарогу — і ўсе пачалі спыняцца. Бо ўсе ж альшанцы адзін аднаму дапамагаюць. У Альшанах найлепшыя ў Беларусі плянтацыі гуркоў і памідораў. У кожным двары стаіць фура — возяць прадаваць вырашчанае. Сакрэт заможнасьці просты: уся вёска — вернікі. Мне пашанцавала трапіць туды ў дзень хрышчэньня, а для альшанцаў гэта значыць больш за Новы год. Таму дзяўчаты прыбіраюцца ў сьвяточныя сукенкі і туфлі на абцасах.

Сьцяпан Лемяза, ужо амаль 40 гадоў як дыякан, намесьнік пастара альшанскай царквы Хрысьціян веры эвангельскай (пяцідзясятнікаў). Ён памятае яшчэ тыя часы, калі быў ліміт на колькасьць новаахрышчаных: 12 чалавек. А ахвотных было заўжды ўдвая больш.

## Хоць за старца, абы за альшанца

Кожнае набажэнства дырэктар школы на загад раённых уладаў рабіў аблавы на непаўналетніх на сходзе. За гэта Сьцяпана Лемязу і асудзілі. Судовага працэсу не было: не пасьпеў прыехаць на адміністрацыйную камісію, а вырак ужо быў гатовы: 50 рублёў штрафу.

Другім разам ён атрымаў штраф за тое, што начальству ў Маскве стала вядома пра шматлюднасьць хрышчэньняў у Альшанах. Нехта зь сяброў царквы даслаў фатаграфію з хрышчэньня сваім сваякам у Латвіі, аднак фатаздымак трапіў да ўладаў. Тое хрышчэньне было надта шматлюднае, кантраляваць яго прылятаў на верталёце інспэктар па справах рэлігій зь Менску. Часам царква праводзіла недазволеныя хрышчэньні, не папярэджваючы ўлады. Хрысьцілі ўначы, часьцей за ўсё ў верасьні — яшчэ цёпла, але ўжо ня так шмат людзей на возеры.

## Дынастыі прэсьвітэраў

Будынак царквы ў Альшанах такі, якому пазайздросьціла б любая менская суполка. У грамадзе 1300 чалавек, тысяча дзяцей навучаюцца ў нядзельнай школе. У Альшанах людзі з задавальненьнем застаюцца, не імкнучыся ў горад. Тут гуляюць па 30 вясельляў за год. У вёсцы нават ёсьць прымаўка: «Хоць за старца, абы за альшанца». За старца — г.зн. за жабрака, па-старадаўняму.

Сяргей Лемяза, брат Сьцяпана, тлумачыць посьпех сваёй вёскі: «У нас людзі да зямлі, спрачаюцца за зямлю; у другім месцы не хацелі браць у калгасу зямлю, а тут прасілі… калгас наш быў 7-мільённы. І ў нас людзі не параводзяць усё на п'янства».

На Берасьцейшчыне ёсьць цэлыя дынастыі прэсьвітэраў. Дзям'ян Сабчук працуе прэсьвітэрам у вёсцы Повіць Кобрынскага раёну, а ўсе ягоныя сыны — у іншых цэрквах Берасьцейшчыны: у Дывіне, Ружанах і Глінянцы.

Сыны яшчэ з маленства ведалі, што такое ўціск: іх бацьку неаднаразова штрафавалі за тое, што не дазваляў ім насіць піянерскага гальштуку. Як і ў Альшанах, у Повіці заўжды колькасьць ахвотных пахрысьціцца перавышала дазволеную. Сам Дзям'ян Сабчук хрысьціўся ў 1943 годзе ў часе нямецкай акупацыі.



**Лясное служэньне пад Берасьцем, пачатак 1980-х. Фатаздымак зь сямейнага альбому.**



**Будынку царквы ў Альшанах пазайздросьціла б любая менская абшчына.**

## Тры гады за Эвангельле

Ва ўсёй Берасьцейшчыне 1943 год быў годам вялікіх хрышчэньняў, прыгадвае Васіль Барычэўскі, 80-гадовы колішні пастар царквы Адвэнтыстаў сёмага дня, які таксама хрысьціўся ў 1943 годзе. Ён тлумачыць гэта тым, што тады быў вельмі цяжкі год, набліжаўся фронт, вось-вось мусілі вярнуцца саветы: «Гэты страх яшчэ больш наблізіў нас да чытаньня Бібліі, і мы прынялі хрышчэньне». У наступным годзе сп.Барычэўскага мабілізавалі ў Чырвоную армію. Ён дайшоў да Бэрліна і вярнуўся назад, стрэліўшы толькі два разы, калі заржавела «карабіна»: пасьля прачысткі трэба было стрэліць у паветра. Васіль Барычэўскі маліўся, каб не надаралася такіх сытуацый, каб трэба было бараніць жыцьцё.

Аднак пазьней нават ягоны ўдзел у вайне не дапамог яму засьцерагчыся ад рэпрэсій, якім падвяргаліся вернікі. У 1974 годзе Васіля судзілі за антысавецкую агітацыю. Прыператрусе ў ягонай хаце знайшлі друкарку і 10 асобнікаў бюлетэняў для суботняй школы, якія раздавалі вернікам для падрыхтоўкі да разважаньня на набажэнстве. Ён дагэтуль памятае, які разьдзел тады праходзілі: гэта было Эвангельле ад Яна.Ператрус быў зладжаны аднachасова ў многіх сяброў царквы, асудзілі дваіх. Васіль Барычэўскі атрымаў тры гады. Гэта было ў 1974 годзе, а ў 1975 усім удзельнікам вайны была амністыя. Усім, акрамя Барычэўскага: «Той чалавек, які засёк чалавека сякерай, атрымаў амністыю і пайшоў дамоў, а я за тое, што распаўсюджваў свае перакананьні, сядзеў да званка. Як зачыталі ў залі суду прысуд 8 ліпеня 1974-га, так у гэты дзень у 1977 годзе і адпусьцілі».



**Дзям'ян Сабчук, заснавальнік дынастыі прэсьвітэраў.**

## Вясельле ў Бярозаўцы

Сям'я Крашчукоў зь Берасьця добра памятае баптысцкія лясныя служэньні, якія адбываліся рэгулярна ў 1983—1985 гадах: на фатаздымках у сямейным альбоме — зухаватыя хлопцы на матацыклах.

Многія з тых, хто на фатаздымках, сёньня ў Амэрыцы. Вясельле Крашчукоў сталася вялікай акцыяй непадпарадкаваньня. Яно сьвяткавалася ў вялікім намёце з 500 гасьцямі. Праз узмацняльнікі гучала музыка і казаньні. Міліцыянты спачатку заклікалі вернікаў разысьціся, а потым разбурылі намёт і разабралі апаратуру. Райвыканкам хацеў пазбавіць іх зямельнага ўчастка, але потым толькі абавязаў пабудаваць дом на працягу году. Цяпер на гэтай вуліцы ў берасьцейскім пасёлку Бярозаўка амаль усе катэджы належаць вернікам з розных цэркваў. А перашкоды падчас вясельля, кажуць гаспадары, толькі ўмацавалі іх сям'ю.

Паленьні рэлігійных кніг, сфабрыкаваныя справы супраць пастараў, падпольныя друкарні і лясныя служэньні — гэта гісторыя пратэстанцкага руху на Берасьцейшчыне. Нібы цэмэнт, яна легла ў фундамэнт этыкі цяперашніх пратэстантаў — самае заможнае рэлігійнае групы ў Беларусі.

**Фота аўтаркі артыкулу**

---

Пры канцы 1980-х гадоў на Берасьцейшчыне знаходзіліся 60% усіх беларускіх грамадаў адвэнтыстаў, больш за палову суполак пяцідзясятнікаў і больш як 32% усіх рэлігійных аб'яднаньняў.

---



**Васіль Барычэўскі тры гады правёў за кратамі за рэлігійныя перакананьні.**

---

З кнігі П.Удавічэнкі «Чаму навучаюць верніка ў сэктах». Менск, 1965:

У Кобрынскім раёне вернікі адмовіліся ад грамадзка карысных працы, у Давыд-Гарадку ня выйшлі на працу ў рэлігійнае сьвята.

Невыпадкова, напрыклад, тры чвэрці сяброў баптысцкай суполкі вёскі Альшаны Берасьцейскай вобласьці ня выпрацавалі ў 1959 годзе ўстаноўленага ў калгасе мінімуму працадзён.

---

Калі Вы маеце інфармацыю аб гісторыі пратэстанцкага руху ў Беларусі і жадаеце дапамагчы ў стварэньні фільму на гэту тэму, зьвяртайцеся ў Рэдакцыю да аўтаркі артыкулу.

# Каляды ў Жодзіне

У звычайнай кватэры сабраліся два дзясяткі юнакоў і дзяўчат. Кожны заняты сваім: нехта падшывае казіны кажух, нехта майструе зьвязду, нехта паўтарае сьцягнутыя з Інтэрнэту словы сцэнару. У гэткі спосаб жодзінская суполка незарэгістраванага «Маладога фронту» рыхтуецца да калядак.

Часам пад дзьвярыма кватэраў шматпавярхоўікаў даводзіцца доўга стаяць — ніхто не адмыкае. І тады галаву сьвідруе здрадніцкая думка: «Можа, мы ўжо занадта дарослыя для калядаваньня?» А часам гаспадары вельмі хутка выносяць каляду. І тады самымі незадаволенымі пачуваюцца «козы», якім не даюць ні сьлед «памерці». Дарэчы, ролі козаў выконваюць Сяргей Савіч і Алесь Смольскі, якіх ня так даўно выгналі з Акадэміі МУС і Суворалўскага.

Крочачы ад пад'езду да пад'езду, хлопцы для сябе сьпяваюць гіт, прывезены з украінскай рэвалюцыі, — «Лента за лентаю набої падаю…».

Пераглядаючы накалядаванае, хлопцы застаюцца ня вельмі задаволеныя: у меху зболышага слодычы. Накалядаванае дабро гэтым разам будзе адпраўлена сябрам арганізацыі, якія цяпер служаць у войску. От каб такі ўлоў ды летась — тады каляду аддалі ў Жодзінскі рэабілітацыйны дзіцячы садок.

Чым ёсьць Каляды для маладзёнаў?

Ганна, 16 гадоў: «Мы радуемся самі і прыносім радасьць ды сьвятло да людзей. Само зьяўленьне калядоўшчыкаў у хаце — гэта радасьць».

Ірына, 20 гадоў («Каляда»): «Для нас гэта проста магчымасьць паразмаўляць зь людзьмі, каб яны пачулі беларускую мову. Гэта ж радасьць для іх — пачуць мову».

Ігар, 20 гадоў («Мядзьведзь»): «Мне падабаецца гэтая роля. Але дзеці часам палохаюцца мядзьведзя, бо не прывучаныя да калядаваньня. Так што мне нават няма дзе разгарнуцца».

**Вераніка Дзядок, фота аўтара**



# У лято грай, а свой розум май

Мара кожнага чалавека ўвасабляецца ў адно — жыць годна, каб хапала на патрэбы. Ужо даўно вядома пра апантаную цягу амэрыканцаў да лятарэі, да чаканьня цуду. Тэлебачаньне ўсяго сьвету раз-пораз паказвае зьнякавелага шчасьліўчыка, які сарваў джэк-пот. Беларуская мара таксама падалася туды ж, за амэрыканскай.

«Ваша лято» паціху пашырае межы свайго ўплыву, зацягваючы ўсё новых і новых гульцоў. Для многіх людзей гэта апошняя надзея палепшыць сваё жыцьцё. Ужо даводзілася сустракаць чалавека, які захоўвае стосы старых паперак, што былі напачатку грашыма, потым увасобіліся ў надзею, якая сплыла разам з апошняй выцягнутай фішкаю. Калі-нікалі толькі ўдаецца выйграць з камарыную дзюбу. Калі кожны квіток каштуе крыху менш за даляр, дык ёсьць людзі, якія трымаюць у сябе некалькі соцень такіх «скарыстаных няспраўджаных даляраў».

Нехта сказаў, што лятарэя найлепш выяўляе непапраўных аптымістаў. Але гульнявая гістэрыя працягвае вабіць людзей, аблытваючы і захапляючы. Сам ужо маю некалькі лятарэйных квіткоў. Надзея раптоўна пабагацець сьвярбіць недзе ў закутках душы. Разумееш, што хутчэй схопіш трасцы, чым нешта выйграеш; што арганізатар лятарэі атрымлівае шалёныя грошы, выдаткоўваючы на выйгрыш пару адсоткаў. Прайграўшы, заракаешся гуляць… а празь дзень жонка прыносіць новы квіток, які выпадкова ўбачыла й набыла, і ўсё працягваецца наноў: а раптам гэтым часам і з гэтым білетам…

Па Баранавічах блукаюць байкі пра прададзены ў горадзе шчасьлівы білет, што выйграў 10 мільёнаў, а яго ўладальнік дагэтуль не зьвярнуўся па грошы. Ёсьць нават прадавачкі, якія клянуцца, што менавіта ў іх той білет купіла маладая дзяўчына, — яны здолелі запомніць і нумар білету і чалавека!

Посьпех прыходзіць толькі да адзіночкі-шчасьліўца — як у Амэрыцы, так і ў Беларусі. Розьніца ў тым, што амэрыканцу выйгрыш джэк-поту забясьпечыць жыцьцё, і яшчэ застанецца дзецям. Беларускага джэк-поту хопіць хіба на машыну.

Вось сям'я з Баранавічаў атрымала пасьведчаньне на 2,5 млн рублёў, якія ўжо вырашылі аддаць дачцэ як дадатак да першага ўнёску за пабудову кватэры.

Цікава, што народ дае веры толькі «Вашаму лято», што разыгрываецца ў жывым этэры. У розныя вядомыя з савецкіх часоў грашова-рэчавыя лятарэі ніхто добраахвотна не гуляе. Усё найлепшае ўжо падзелена сярод начальства, кажуць людзі. Тыя паперкі прымусова распаўсюджваюць на прадпрыемствах, касіры ўгаворваюць пэнсіянэраў узяць іх падчас атрыманьня пэнсіі.

Адзін літовец, прыехаўшы да нас і ўбачыўшы гармідар, які панаваў пару год таму, калі «Кока-Кола» разыгрывала нейкую драбязу, пасьміяўся — у іх ужо даўно ніхто на такое не пакваліцца. Тамака спажыўцу прапануецца сама меней суперсучасная машына ці якая сотня тысяч даляраў. Зрэшты, якая эканоміка, такія й выйгрышы.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

СЬЦІСЛА

### Ураган у Беларусі

Моцны вецер, які пранёсься ў мінулыя выходныя над Паўночнай Эўропай, зачапіў і Беларусь. Тут парывы сягалі 25—30 м/с. Засталіся без электрычнасьці больш за тысячу вёсак, пашкоджана 26 хатаў. Ураган забраў два жыцьці. Два рабочыя — 20 і 62 гадоў — загінулі ў Гарадоцкім раёне пры наладжваньні лініі электраперадачы. У вёсцы Берасьнёўцы Докшыцкага раёну 46-гадовая кабета атрымала чэрапна-мазгавую траўму — на яе ўпаў сук дрэва.

### Страляніна ў гомельскай больніцы

Інструктар па выхаваўчай рабоце Гомельскага сьледчага ізалятару разам з двума кантралёрамі СІЗА прывёз у больніцу зьняволенага ізалятару з чэрапна-мазгавой траўмай. Нечакана інструктар, які быў нападпітку, усчаў страляніну: раненьні атрымалі кантралёр, мэдсястра і санітарка. Цяпер кантралёр сам сядзіць за кратамі.

### Сьвяты скончыліся, памежныя пераходы зачыніліся

10 студзеня зачыніліся часовыя пункты спрошчанага пропуску на беларуска-літоўскай мяжы. Цягам двух калядных тыдняў з 10 да 17 гадзіны жыхары памежных раёнаў маглі хадзіць у госьці, разам адзначаць сьвяты. Гэтыя пункты спрошчанага пропуску перасталі дзейнічаць 1 траўня, пасьля ўступленьня Літвы ў Эўразьвяз.

**ВДз**

### Закрасавалі кветкі

У Лідзе ў гародзе Юзэфы Самахвал закрасавалі прымулы. Калі і далей будзе трымацца цёплае надвор'е, на клюмбах у Горадні расьцьвітуць шматгадовыя расьліны.

**Аляксандар Хілімон, Горадня**

### Новы варыянт Малітвы Панскай

З новага году ў каталіцкіх храмах краіны, паводле распараджэньня кардынала Казіміра Сьвёнтка, пры цэлебраваньні сьвятой імшы на беларускай мове трэба карыстацца выключна зацьверджаным тэкстам імшалу «Editio typica III». Галоўная зьмена тычыцца Малітвы Панскай («Ойча наш»). Цяпер замест «… і адпусьці нам грахі нашыя…» трэба прамаўляць «… і адпусьці нам правіны нашыя…».

**Руслан Равяка, Баранавічы**

### Кіно пра Гомель

У хуткім часе пра Гомель будзе зьняты яшчэ адзін фільм. Першай стужкай стаў «Гомель на мяжы вякоў». Праект ажыцьцяўляецца паводле пастановы кіраўніка аблвыканкама Аляксандра Якабсона. На думку абласных уладаў, аналягічныя фільмы маюць займець усе раёны Гомельшчыны.

**Сяргей Балахонаў, Гомель**

### Увага, за Вамі сочаць!

У Магілёве, сьледам за Менскам, дзеля зьніжэньня злачыннасьці зьвівіцца сыстэма вулічнага відэаназіраньня. На плошчах, каля буйных гандлёвых і сацыяльна-культурных аб'ектаў будуць усталяваны 32 відэакамэры, 16 зь іх — на пешаходнай вуліцы Ленінскай.

**Алеся Чыж, Магілёў**

### Спорткомплексы замест кінатэатраў

У 2005 годзе ў Беларусі мае зьявіцца некалькі спартовых комплексаў. Так, сталічныя кінатэатры «Вільня» і «Зьмена» будуць перабудаваныя ў Цэнтар адзінаборстваў і Цэнтар тэнісу, рэканструююць алімпійскі спарткомплекс «Стайкі». У Жлобіне, на беразе Дняпра, будзе пабудаваны фізкультурна-аздараўленчы цэнтар, а ў Берасьці мае завяршыцца рэканструкцыя спартовага комплексу «Берасьцейскі». Рыхтуемся да Алімпіяды-2016?

### Наведнікаў сустракае манах

На ўезьдзе ў Крычаў усталявалі драўляную скульптуру манаха, які нібы бласлаўляе наведнікаў райцэнтру. Аўтар Дзьмітры Дабравольскі атрымаў ад гарадзкіх уладаў яшчэ шэраг замоваў. Так, анёлы з клёну ўпрыгожаць гаючую крыніцу, гіераманах зь ліпы будзе пісаць загад аб наданьні Крычаву статусу гораду.

**ВДз; Паводле БелаПАН**

# Рысь
## на вуліцах Гомелю

Дзікая котка трывала ўвайшла на вуліцы гораду. Нядаўна, нягледзячы на спробы гісторыкаў давесьці альтэрнатыўнае меркаваньне, на гомельскім гербе разьлеглася рысь — жывёліна нарвістая й дзікая, слаба прыдатная да дрэсіроўкі, да таго ж не зусім адпаведная даўно абжытым гомельскім тэрыторыям. Справядлівасьці дзеля адзначым, што рысь — гістарычны герб Навабеліцы, і Гомель, які стаў павятовым цэнтрам у 1852 г., атрымаў у спадчыну ад яе зьмененую з часам — жывёліна то стаіць, то ляжыць — геральдычную выяву.

Потым зьявіўся помнік у Навабеліцы, галава жывёліны — сымбаль хакейнага клюбу «Гомель» і г.д.

Цяпер горад чакае яшчэ адзін падарунак. На беразе Сажа, у парку, зьбіраюцца ўсталяваць помнік першаму насельніку Гомелю. Паводле праекту, ён высаджваецца з чоўна, у якім — рысь.

Паўстае пытаньне: хто такі той насельнік? Першы гамяльчук — Радзім, які прыплыў «зь ляхаў»? Ці проста паляўнічы-славянін? Добра, каб праект адпавядаў гістарычнай праўдзе. Каб жа ня выйшла, як зь Пётрам I у строі Хрыстафора Калюмба на беразе Масква-ракі, зь якога сьмяецца ўся Расея.

Летась зьявілася адчуваньне, што адбываецца пералом у гістарычнай сьвядомасьці начальства. Паўстаў помнік князёўне Ірыне Паскевіч, вярнулі гістарычную назву Ірынінскай вуліцы, на Дзень беларускага пісьменства ўсталявалі ў сквэры каля галоўнай плошчы помнік Кірылу Тураўскаму. Зьвіліся спадзяваньні, што будуць зроблены яшчэ крокі, каб вярнуць гораду памяць. Чакаюць капіталаўкладаньняў Кагальны роў, Спасава слабада, праваслаўныя вернікі пачалі аднаўляць Мікалаеўскую царкву.

**Андрэй Ананьеў, Гомель**

# Маскоўскі балт



Ён быў раздражняльнікам для акадэмічных навукоўцаў і савецкіх чыноўнікаў, а ягоныя ідэі ў ЦК КПБ лічылі ня менш шкоднымі, чым Фройдавы. Пра археоляга Валянціна Сядова піша **Аркадзь Шанскі.**

Празь ягоны ўдзел у Менску ў 1973 г. была забаронена навуковая канфэрэнцыя, прысьвечаная этнагенэзу беларусаў. Тэорыя балцкага субстрату ў паходжаньні беларусаў, распрацаваная маскоўскім археолягам Валянцінам Сядовым, падалася кіраўнікам савецкае Беларусі страшэннай крамолай: пад сумнеў ставілася тэорыя паходжаньня трох усходнеславянскіх народаў.

Сам Сядоў пра тую канфэрэнцыю згадваць не любіў. Але і ад Беларусі яго той выпадак не адвярнуў. Пасьля 1991 г. ён не прапускаў ніводнае навуковае канфэрэнцыі ў Беларусі.

## Харбінская бібліятэка

Археалёгія, якая стала для Валянціна Сядова сэнсам жыцьця, была выбрана даволі выпадкова.

У чэрвені 1941 г. скончыў школу. Паступіў у авіяцыйны інстытут, але правучыўшыся год, пайшоў у пяхотную вучэльню. Па сканчэньні паскораных курсаў апынуўся пад Сталінградам, дзе цудам выжыў. Затым — Курская дуга, вызваленьне Менску, баі ў Прыбалтыцы.

Для Валянціна Сядова Другая сусьветная вайна скончылася ў Манчжурыі. Там, у Харбіне, ён і натрапіў на частку бібліятэкі па расейскай гісторыі — большасьць кніг была выдадзена яшчэ да рэвалюцыі. Так і абудзілася цікавасьць да гісторыі. І пасьля дэмабілізацыі ў 1946 г. ён ужо не вярнуўся ў авіяцыю, а паступіў у МДУ, на спэцыяльнасьць археалёгія.

## «Напісаць за Вас дысэртацыю?»

Аб працавітасьці Сядова згадвае адзін зь ягоных колішніх аспірантаў — археоляг Аляксандар Егарэйчанка: «Я яго ня бачыў у адпачынку — калі б я да яго ні прыйшоў, ён заўжды працаваў, нават у экспэдыцыі. А 8-й ён на раскопе, потым — абед. А пасьля зьнікаў. Сядоў здымаў пакой у нейкім доме, дзе з абеду й да адбою сядзеў і працаваў».

Сядоў быў патрабавальным ня толькі да сябе, але й да аспірантаў. Прафэсар Пятро Лысенка згадвае, як у ягоныя аспіранцкія гады Сядоў сказаў: «Навуковыя кіраўнікі бываюць розныя. Адны самі за аспірантаў пішуць дысэртацыі. Іншыя зусім гэтым не займаюцца. А вы як хочаце: каб я за вас напісаў?» Калі Лысенка прывёз у Кіеў на абарону сваю кандыдацкую, то яго назвалі дзіваком: чалавек напісаў доктарскую, а абараняе як кандыдацкую. «Такі тэмп нам задаў Сядоў», — згадвае навуковец.

## У Пінску ў Сьвёнтка

Улетку 1962 г. Сядоў са сваім аспірантам Пятром Лысенкам прайшоў з археалягічнай экспэдыцыяй па Палесьсі: па Прыпяці ад Турава. Падарожнічалі па Палесьсі два тыдні, дасьледавалі курганы, гарадзішчы. Вырашылі заехаць да Лысенкавых бацькоў, у Пінск. А што глядзець у горадзе? Пайшлі ў францішканскі касьцёл — і трапілі на мшу, якую адпраўляў Казімер Сьвёнтак. «Я ні ад кога болей такой пранікнёнай малітвы, як ад Сьвёнтка ў той дзень, ня чуў», — згадвае Лысенка.

Пасьля мшы навукоўцы пайшлі да ксяндза пагутарыць пра пінскія старажытнасьці: «Ён паставіўся да нас вельмі ўважліва». Падчас імшы іх найбольш зацікавіў арганіст: сьпярша ён іграў Шубэртаву «Авэ Марыю», а потым — «Баркаролу» Чайкоўскага. Ксёндз патлумачыў, што свайго арганіста ў касьцёле няма. Прыходзіць чалавек, які грае з сваёй ласкі — тое, што яму падабаецца.

## Палявы камітэт

Калі навуковец узначаліў Палявы камітэт ўсесаюзнага акадэмічнага Інстытуту археалёгіі, празь яго праходзілі ўсе справаздачы археалягічных раскопак СССР. Ён знаёміўся літаральна з кожнай справаздачай, а часьцяком сам ацэньваў яе.

Сядоў трымаўся воддаль ад усялякіх унутрыакадэмічных разборак. Пакуль ён кіраваў аддзелам палявых дасьледаваньняў (ад рашэньняў якога залежала, каму дазволяць атрымаць фінансаваньне й паехаць на раскопкі, каму — не), не было ніякіх звадаў: у бесстароннасьць, аб'ектыўнасьць Сядова верылі ўсе.

Іншы прыклад працавітасьці Сядова — удзел у 20-томным выданьні «Археалёгія СССР». Гэта тоўстыя фаліянты аб'ёмам 20—30 друкаваных аркушаў. Над кожным томам (па пэўных тэрыторыях, па пэўных пэрыядах) працаваў калектыў супрацоўнікаў. Том «Усходнія славяне ў VI—XIII ст.» аб'ёмам у 60 друкаваных аркушаў Сядоў напісаў фактычна адзін. За што й атрымаў потым Дзяржаўную прэмію СССР. А як аўтар ён у дадатак удзельнічаў у падрыхтоўцы й некалькіх іншых тамоў.

Дарэчы, гэтая праца сьведчыць пра Сядова і як пра энцыкляпэдычна абазнанага ў сваёй сфэры навукоўца. «Ён выдатна ведаў археалёгію Эўропы. І мог з розных мазаічных фактаў стварыць канцэпцыі. Такіх людзей адзінкі. Цяпер у бальшыні дасьледнікаў вузкая скіраванасьць. Крыху ў бок — і яны ўжо не валодаюць матэрыялам. Ён у гэтым пляне быў на сваім месцы. Зь ягонымі канцэпцыямі можна пагаджацца ці не пагаджацца, але яны прымушаюць думаць, шукаць нейкі ход», — адзначае Егарэйчанка.

Сядоў добра ведаў нямецкую, ангельскую, францускую мовы.

Апошні зь ягоных беларускіх вучняў — Аляксандар Мядзьведзеў дадае, што навуковец звычайна браў тэму велічэзнага абсягу (славянства за некалькі стагодзьдзяў), па-другое, выкарыстоўваў зьвесткі з розных галін, напрыклад, антрапалёгіі ды мовазнаўства.

## Празь сьнег на Менку

Прыяжджаючы ў Менск, ён цікавіўся ня толькі канфэрэнцыямі. «У апошні ягоны прыезд у Менск у студзені 2004 году мы павезьлі яго на славутае гарадзішча на Менцы, — распавядае Егарэйчанка. — Паказалі Музэй старабеларускай архітэктуры. Потым звазілі на само гарадзішча. Сьнегу было па калена. Мы яго давялі, паказалі малое гарадзішча. Вялікае было ўбаку — мэтраў за 100. Сьнег быў вельмі глыбокім, і ўсё адно Сядоў хацеў да яго дайсьці. Ледзь угаварылі яго не рабіць гэтага». А падчас паходу ў Мастацкі музэй высьветлілася, што навуковец няблага ведае жывапіс, асабліва расейскі. Ягоны сын — доктар мастацтвазнаўства.

## «Цяпер тут будуць балты»

Да тэорыі пра балцкі субстрат Сядова навукоўцы ставіліся па-рознаму. Ідэя пра ролю балтаў у этнагенэзе беларусаў была ў свой час вельмі сьмелай. Праціўнікі тэорыі Сядова былі і ў Маскве, і ў Беларусі. Сярод нашых навукоўцаў найбольш актыўна супраць выступаў археоляг Леанід Побаль. Іншыя ж, як Эдуард Загарульскі, Георгі Штыхаў, Аляксей Мітрафанаў, падтрымлівалі балцкую тэорыю. Даходзіла да сьмешнага. Так, Егарэйчанка згадвае, як паступіў у аспірантуру ў Маскве й перад навучаньнем прыехаў у Менск, зайшоў у сэктар археалёгіі Інстытуту гісторыі. Побаль, які загадваў сэктарам, пацікавіўся, хто ж стаў навуковым кіраўніком маладога аспіранта. Пачуўшы прозьвішча Сядова, Побаль ажно прысеў: «Ну ўсё! Значыць, у Беларусі будуць балты».

Неспэцыялісты Сядова ведаюць пераважна як стваральніка тэорыі балцкага субстрату. Нездарма ён стаў ганаровым акадэмікам Латвійскай Акадэміі навук, у археолягаў Літвы й Латвіі ён карыстаўся неаспрэчным аўтарытэтам. У перабудовачныя часы латышы прапанавалі яму выдаць кнігу «Балты ў старажытнасьці».

Але ня толькі дасьледаваньнямі балтаў вядомы Сядоў. Найбольш ён дасьледаваў якраз гісторыю славянаў, іхнае паходжаньне й расьсяленьне. Ягоныя раскопкі сельскіх паселішчаў Смаленшчыны далі свой вынік — кнігу, якая дагэтуль застаецца настольным даведнікам па вясковых помніках Старажытнай Русі. Дваццаць гадоў Сядоў вёў раскопкі на Пскоўшчыне — у Ізборску, адным з самых старажытных усходнеславянскіх гарадоў. Пасьпеў выдаць кнігу «Ізборск — пратагорад» (хутчэй навукова-папулярную, чым уласна навуковую) і меўся падрыхтаваць працу па выніках сваіх шматгадовых дасьледаваньняў. Праца была практычна завершана. Кніга мае выйсьці пасьмяротна.



**Расьсяленьне балтаў паводле дасьледаваньняў В.Сядова**

курганныя могільнікі са знахадкамі прадметаў балцкага паходжаньня

расьсяленьне балцкіх плямёнаў напярэдадні славянскай інфільтрацыі і міграцыі

беларуская этналінгвістычная тэрыторыя па Я.Карскаму

сучасныя межы Беларусі

# Найлепшыя фільмы-2004

Каб вызначыць найлепшыя фільмы—2004, якія дэманстраваліся ў Беларусі, мы зьвярнуліся да аўтарытэтных экспэртаў — крытыкаў, рэжысэраў. Фаварытамі сталі карціны Кустурыцы і Чхан-Ук Пака. Ніводнай беларускай.


OUTNOW.CH
Кадр з фільму «Жыццё як цуд» Эміра Кустурыцы — лідэра кінарэйтынгу «НН».

## Найлепшыя фільмы ў беларускім пракаце (сумарны рэйтынг):

**1. «Жыццё як цуд» (Сэрбія і Чарнагорыя — Францыя, Эмір Кустурыца) — 24 балы.**
**2. «Олдбой» (Паўднёвая Карэя, Чхан-Ук Пак) — 22.**
**3—5. «Валадар пярсьцёнкаў: Вяртаньне караля» (ЗША, Пітэр Джэксан); «Кава і цыгарэты» (ЗША, Джым Джармуш); «Дрэннае выхаваньне» (Гішпанія, Пэдра Альмадовар) — па 17.**
**6. «Троя» (ЗША, Вольфганг Пэтэрсан) — 16.**
**7. «Буйная рыба» (ЗША, Цім Бёртан) — 15.**
**8. «21 грам» (ЗША, Алехандра Гансалес Іньярыту) — 14.**
**9—10. «Шрэк-2» (ЗША, Эндру Адамсан, Келі Эсбэры, Конрад Вэрнан); «11 верасьня паводле Фарэнгейта» (ЗША, Майкл Мур) — па 13.**

**Максім Жбанкоў, кінакрытык, «Белорусская деловая газета»:**
1. «Жыццё як цуд».
2. «Кава і цыгарэты».
3. «Дрэннае выхаваньне».
4. «Забіць Біла-2» (ЗША, Квенцін Таранціна).
5. «Шрэк-2».
6. «Буйная рыба».
7. «21 грам».
8. «Прыцемкавы самурай» (Японія, Ёдзі Ямада).
9. «Олдбой».
10. «Боўлінг для Калюмбіны» (ЗША, Майкл Мур).

**Ігар Сукманаў, кінааналітык, тэлепраграма «Час кіно», праграмны дырэктар радыё «Юністар»:**
1. «Олдбой».
2. «Слон» (ЗША, Гас Ван Сэнт).
3. «Містычная рака» (ЗША, Клінт Іствуд).
4. «Прыцемкавы самурай».
5. «11 верасьня паводле Фарэнгейта».
6. «Чырвоныя агні» (Францыя, Сэдрык Кан).
7. «Свае» (Расея, Дзьмітры Месхіеў).
8. «Палена» (Чэхія—Вялікабрытанія—Японія, Ян Шванкмаер).
9. «Блубэры» (ЗША, Ян Коўнэн).
10. «Адчужэньне» (Турцыя, Нуры Бэльге Чэйлан).

**Ягор Конеў, выкладчык БДУ:**
1. «Буйная рыба».
2. «Эфэкт матылька» (ЗША, Эрык Брэс, Джэй Мэкі Грубэр).
3. «Валадар пярсьцёнкаў: Вяртаньне караля».
4. «Шрэк-2».
5. «Троя».
6. «Жыццё як цуд».
7. «Пакуты Хрыстовы».

**Андрэй Кудзіненка, кінарэжысэр:**
1. «21 грам».
2. «Дрэннае выхаваньне».
3. «Кава і цыгарэты».
4. «Затаічы» (Японія, Такешы Кітана).
5. «Самарыцянка» (Паўднёвая Карэя, Кім Кі Дук).

**Васіль Коктыш, генэральны дырэктар УП «Кінавідэапракат» (паводле касавых збораў у сталіцы).**
**У шырокім пракаце:**
1. «Троя» (ЗША, Вольфганг Пэтэрсан).
2. «Валадар пярсьцёнкаў: Вяртаньне караля».
3. «Ван Хельсінг» (ЗША, Стывэн Сомэрс)
4. «Гары Потэр і вязень Азкабану».
5. «Пасьлязаўтра» (ЗША, Роланд Эмэрых).
6. «Пакуты Хрыстовы».
7. «Дзеці шпіёнаў-3D» (ЗША, Робэрт Радрыгес).
8. «Чалавек-павук-2» (ЗША, Сэм Рэймі).
9. «Апошні самурай» (ЗША—Новая Зэляндыя—Японія, Эдвард Цьвік).
10. «50 першых пацалункаў» (ЗША, Пітэр Сыгал).

**Фільмы «Кінафармату 4х4»:**
1. «Олдбой».
2. «Жыццё як цуд».
3. «Адзін прапушчаны званок» (Японія, Такашы Міікэ).
4. «11 верасьня паводле Фарэнгейта».
5. «Тэрмінал» (ЗША, Стывэн Сьпілбэрг).

Каб вызначыць сумарны рэйтынг, за першае месца фільму прысвойвалася 10 балаў, за дзясятае — 1.

У астатніх намінацыях мы дазволілі сабе вызначыць суб’ектыўна:

## Найлепшы беларускі ігравы фільм:

«Дзікія жывёлы сьвету» Людмілы Дуброўскай.

Дыплёмная стужка маладой рэжысэркі, зьнятая на ўлюбёныя тэмы «Беларусьфільму» — вайна і дзеці.

## Падзеі году:

1. Прыезд у Менск жывога клясыка швэдзкага кіно Яна Труэля ды рэтраспэктыва ягоных фільмаў.
2. «Акупацыя» Андрэя Кудзіненкі. Зьняты ў 2003 г. фільм сёлета з посьпехам быў прадэманстраваны на Ратэрдамскім і Маскоўскім кінафэстывалях.
3. Трэці выпуск кінарэжысэраў у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.
4. Памёр Марлён Брандо — культавы амэрыканскі актор.

## Скандалы году:

1. На Канскім фэстывалі ўзнагароду атрымлівае дакумэнтальная стужка Майкла Мура «11 верасьня паводле Фарэнгейта».
2. У Беларусі забаронены да пракату фільм «Акупацыя». А ўсяго ў 2004 годзе паводле зьвестак БелаПАН Рэспубліканскай экспэртнай камісіяй пры Дзяржрэгістры былі забаронены да распаўсюду на тэрыторыі краіны 12 фільмаў.

## Кінатавар году:

«Пакуты Хрыстовы» Мэла Гібсана.

## Найлепшы адмысловы эфэкт году:

Сэр Лоўрэнс Аліўе (1907—1989) ажыўляецца камп’ютарам і выконвае ролю галоўнага ліхадзея ў карціне «Нябесны капітан і сьвет будучыні».

**Андрэй Расінскі**

СЬЦІСЛА

### Раман пра падзеі ў Росіцы

У выдавецтве «Pro Christo» выйшаў раман наваполацкай пісьменьніцы Ірэны Жарнасек «Будзь воля Твая». Раман прысьвечаны трагічным падзеям, што надарыліся падчас мінулай вайны ў беларускім мястэчку Росіца, калі вайскі Латыскага легіёну цягам двух дзён зьнішчылі паўтары тысячы мясцовых жыхароў. Пры гэтым многія ахвяры былі спаленыя жыўцом. Раман Ірэны Жарнасек не пра латышоў і партызанаў. Вайна — толькі тло для псыхалягічных дасьледзінаў чалавечай душы. Героямі кнігі зьяўляюцца як гістарычныя асобы — ксяндзы-марыяне Антоні Ляшчэвіч і Юры Кашыра — так і сяляне Росіцы. Нямецкі афіцэр, які камандаваў карнікамі, прапанаваў ксяндзам пайсьці зь мястэчка, але сьвятары адмовіліся ад такой прапановы і прынялі сьмерць разам зь вернікамі, дарэшты выканаўшы свой сьвятарскі доўг. Наклад кнігі 2500 ас.

### Клясыка ў Берасьці

У Берасьці адбыўся XVII фэстываль клясычнай музыкі «Студзеньскія музычныя вечары». Удзел у фэстывалі ўзялі прадстаўнікі дзевяці краінаў. Першы канцэрт — арганныя творы замежнае клясыкі — у касьцёле Ўзвышэньня Сьвятога Крыжа даў прафэсар Ігар Алоўнікаў.

### 100 гадоў Дудару

24 сьнежня споўнілася 100 гадоў паэту Алесю Дудару, закатаванаму ў 1937-м. Полацкая грамадзкасьць зьвярнулася да гарадзкіх уладаў з прапановай ушанаваць мэмарыяльнай дошкай памяць пра паэта, які пачынаў тварыць у горадзе над Дзьвіной. «Белпошта» 100-годзьдзе Дудара адзначыла капэртай з партрэтам заснавальніка «Маладняку».

### Сайт Русі

Інтэрнэт-партал fromby.net (праекты «Тузін гітоў» ды інш.) зрабіў прэзэнт на Каляды групе «Індыга» і пэрсанальна яе вакалістцы Русі. Цяпер на адрасе **rusia.fromby.net** можна знайсьці ўсю інфармацыю пра маладую сьпявачку й запісацца ў фэн-клюб.

### У Настасьсі кралі?

Пракуратура распачала справу аб магчымых крадзяжах пры здымках фільму «Настасься Слуцкая». Прапала каля 65 млн рублёў. Падазраюць у злачынстве дырэктара грамадзкага аб’яднаньня «Кавалергард» А. Фільмам апекаваўся асабіста прэзыдэнт, гэта была адна з самых бюджэтных карцінаў беларускага кіно.

### Корк — культурная сталіца Эўропы

Культурнай сталіцай Эўропы 2005 году абвешчаны ірляндзкі Корк. Сёлета там адбудзецца 4 000 імпрэзаў — мастацкіх, тэатральных, музычных, літаратурных, а таксама спартовых і бізнэсовых (падрабязьней www.cork2005.ie альбо europa.eu.int/comm/culture). Летась культурнай сталіцай кантынэнту быў францускі Ліль.

**АВ; БелаПАН, Gazeta.pl, svaboda.org**

ДЫСКАГРАФІЯ

# Прошча




«OSIMIRA», «БМА-груп», 2004

Фолк-праект магілёўскай каманды, вядомай раней як «Акруга вольнага мастацтва». Музыка народных сьвятаў, кірмашоў, гуляньняў. Свой назоў музыкі тлумачаць тым, што «Osimira» — гэта і ёсьць тыя стрыжні культуры і прыроды чалавека, на якія нанізваюцца эпохі. «Гэтая музыка чалавека і прыроды, якая гучыць у кожным» — такім чынам яны прадстаўляюць сваю творчасьць. З шэрагу рэпрэзэнтантаў кірунку «фольк-мадэрн» яны вылучаюцца вельмі багатай гукавой палітрай (на дыску гучаць з два дзясяткі інструмэнтаў). Стаўка робіцца на мэлёдыю, голас амаль не задзейнічаны. Падобная музыка крыху губляе сваю сакавітасьць у запісе, але зьзяе рознымі колерамі ў жывым выкананьні.

Прадукт найперш для людзей, «загартаваных фолькам».

Цікавы бонус: праграма праверкі беларускай артаграфіі паводле абедзьвюх вэрсіяў правапісу.

Адзнака: 6 (з 10)

**Сяргей Будкін**

# Як расейцы абыходзяцца са сваякамі Аслана Масхадава

Допыт трываў безь перапынку. Мужчын білі, трымалі ў ямах. Расейскія спэцслужбы не прыдумалі нічога лепшага дзеля націску на тэрарыстаў у Беслане, як арыштаваць сваякоў кіраўніка чачэнскіх партызанаў Аслана Масхадава.



Чачэнская жанчына на расейскім блёк-пасту.

Было 7:20 раніцы 2 верасьня. Наступны дзень пасьля таго, як тэрарысты занялі школу ў Паўночнай Асеты. Да дому Масхадавых на вул.Турбіннай, 62 пад Грозным пад'ехала калёна бронемашын, ГАЗікаў і пікапаў. Зь іх павыскоквалі людзі ў масках. Выламалі жалезныя весьніцы і выцягнулі ўсіх на вуліцу — кабет басанож і ў начных кашулях.

— Калі пабачыла ў тэлевізіі, што робіцца ў Беслане, адчула, што могуць прыехаць па нас кожную хвіліну. Але найгорш было, калі ўзялі 18-гадовага ўнука Рустама. Білі яго. З галавы цякла кроў, — на ламанай расейскай апавядае 70-гадовая Буча, старэйшая на 15 гадоў за роднага брата Аслана. Гэта яна вынасіла на руках былога прэзыдэнта Чачэніі, і таму ён заўсёды падтрымліваў зь ёю найцяплейшыя стасункі. Сама яна не вучылася ніводнай клясы. З усёй сям'і толькі Аслан атрымаў адукацыю. Пасьля войска трапіў у афіцэрскую школу, стаў артылерыстам. Пайшоў са службы ў званьні палкоўніка.

Буча кідалася на жаўнераў. Сварылася зь імі. Атрымала прыкладам па галаве, павалілася на жвір.

— Крычала, каб хаця ж не забралі ўнука, але гэта нічога не дало, — расказвае яна.

Суседзі Масхадавых кажуць, што гэта былі афіцэры ФСБ з Масквы ў эскорце камандас. Надзелі ўсім торбы на галовы і завезьлі на базу Ханкала каля Грознага. Там было ўжо шмат родных Масхадава — сям'я другога брата зь вёскі Першамайскае, далёкія й блізкія сваякі з раёну Надцерачнага і з-пад станіцы Асінаўская — агулам каля 50 мужчын і 100 старых з кабетамі і дзецьмі.

## Аслане, братка!

— Пыталі, дзе Аслан і ці маем зь ім кантакт. Адказала, што ня бачыла яго пяць год, калі пачалася другая вайна, — кажа Буча.

Праз некалькі гадзін пасьля атакі на Беслан Масква паведаміла, што за гэтым стаіць Масхадаў, хаця ў той самы дзень ён зьвярнуўся да тэрарыстаў з заклікам вызваліць закладнікаў. Сьледчыя загадалі Бучы запісаць на відэа зварот да Масхадава, каб той дапамог у вызваленьні закладнікаў.

— Прымусілі мяне, — кажа Буча.

Але зварот паказалі толькі па мясцовым чачэнскім тэлебачаньні. У Расеі ніхто ня ведаў пра гэта. «Аслане, братка! — казала заплаканая Буча. — Ведаю, што нічога супольнага з тымі бруднымі справамі ты ня маеш. Але прасілі мяне, каб да цябе зьвярнулася. Забралі тут усіх нашых родных. Калі можаш, дапамажы вызваліць дзяцей з Беслану».

Падчас допыту мужчын білі, кабет зь дзецьмі пасадзілі ў драўляныя баракі. Арыштавалі блізкіх і іншых западозраных ва ўдзеле ў атацы на Беслан — агулам некалькі сотняў чалавек.

— Баялася, што будуць нас трымаць, пакуль Аслан не пагодзіцца. Але нават калі б публічна расстралялі, Аслан бы не азваўся. Ведаю гэта на 100%, — кажа Буча.

У яе аднапавярховым доме ні пылінкі. На сьцяне вялікі плякат, на якім выяўлены пілігрымы да Мэккі і партрэт брата ў каўкаскай папасе на галаве з надпісам «100 дзён прэзыдэнта». Масхадаў стаў прэзыдэнтам Чачэніі ў 1997 годзе. І былі гэта адзіныя справядлівыя выбары ў рэспубліцы.

Буча страціла мужа і двух сыноў. Адзін быў афіцэрам савецкай арміі, як і Аслан. Ваяваў у Аўганістане. Загінуў падчас першай вайны з расейцамі ў 1994 г. Другі быў трактарыстам у калгасе. Яго заваліла дрэнна збудаваная сьцяна. Муж памёр ад старасьці. Буча мае толькі дачку і ўнука.

— Нікуды яго не пускаю. Ніякіх кантактаў з партызанамі. Ён павінен выжыць, — кажа яна.

Але расейцы затрымлівалі яго шмат разоў. Ён вывучае замежныя мовы ва ўнівэрсытэце Грознага, хоча стаць настаўнікам ангельскай мовы. Адзін раз спрабавалі яго схапіць людзі з чачэнскай службы бясьпекі Рамзана Кадырава, сына забітага ў траўні прарасейскага прэзыдэнта Чачэніі. Людзі ў масках зацягнулі Рустама ў машыну. Прабыў ён тады ў вязьніцы два дні, але сваякі здолелі яго выкупіць.



**Масква кажа, што за падзеямі ў Беслане стаіць Масхадаў, хаця ў той самы дзень ён заклікаў тэрарыстаў вызваліць закладнікаў.**

— Не пушчу яго ва ўнівэрсытэт, пакуль усё ня сьціхне. Людзі ўвесь час зьнікаюць бязь зьвестак, — кажа яго матка Хаджыят.

Яна некалі працавала ў прэзыдэнцкім палацы кухаркай. Знае амаль усіх з даўнейшай прэзыдэнцкай гвардыі. І ня можа перажыць, што большасьць пайшлі ў міліцыю ці службу бясьпекі маладога Кадырава.

— Некаторыя кажуць, што нічога нам ня зробяць, памятаючы аб Аслану, але некаторыя паводзяць сябе як быдла, хаця прысягалі яму на вернасьць, — кажа Хаджыят.

## Калі гінуць дзеці

Масхадавы перажылі адзін «налёт» 29 сьнежня 2003 г. Ахмад Кадыраў, які некалькімі месяцамі раней стаў прарасейскім прэзыдэнтам Чачэніі, хацеў падараваць Крамлю прэзэнт на Новы год у выглядзе галавы Масхадава. Браты камандзіра партызанаў Лёма і Леча правялі тады два месяцы ў невядомым месцы. Сям'я была ўпэўнена, што яны ўжо ніколі ня вернуцца дахаты. Ад таго часу браты ня хочуць гаварыць з журналістамі. Толькі Буча размаўляе, бо, кажа, «старая, нічога не баюся, ды, акрамя таго, хачу, каб сьвет ведаў праўду, якой не паказваюць на расейскім тэлебачаньні».

Буча выказваецца супраць захопу школы ў Беслане:

— Гэта ж былі безбройныя дзеці. Гэтага Аслан ня мог зрабіць — мо нейкія бандыты. Ён вайсковец і ведае, як трэба ваяваць. Ніколі не паверу, што мой брат мог мець з тым нешта супольнае.

Праз імгненьне Буча дадае:

— Як забівалі нашых дзяцей у часе вайны, сьвет маўчаў. Ніхто пра тое ня ведае. А наагул тут было ня лепей, чым у Беслане. Гэта ўсё работа расейцаў, каб паказаць чачэнцаў у яшчэ горшым сьвятле.

## Забіў бы Басаева

Так, як Буча, думае шмат людзей у Грозным. Спачуваюць бесланцам і асецінам, але ніхто не дапускае думкі, што тэракты ў школе маглі зладзіць чачэнскія партызаны.

— Кожны замах яшчэ больш шкодзіць чачэнскай справе. Сьвет мае нас цяпер за жывёл. Ніхто ня хоча нам дапамагаць. Калі гэта зрабіў Шаміль Басаеў, забіў бы яго гэтымі рукамі. Гэта найвялікшы вораг чачэнскага народу, — кажа Мэрбэк, былы партызан.

— Чаму не занялі Думу ў Маскве ці якую іншую ўстанову? — пытае Айса, настаўніца. — Дзеці ж у ісламе — гэта сьвятыня. Да сёмага году жыцьця мы лічым іх бясьпечнымі анёламі, а бацькі ня маюць права падняць на іх руку.

Буча Масхадава (сям'я называе яе Нана — Мама) жыве за 900 рублёў (30 даляраў) пэнсіі ў страху, чакаючы, што пасьля чарговага замаху зноўку загрукаюць да яе ў дзьверы.

— Гэтым разам нам пашчасьціла. Выпусьцілі нас праз два дні. Аслан мудры, наймудрэйшы ў сям'і. Калі ён лічыць, што трэба змагацца, значыць, так трэба. Ня бачыла яго пяць год, хаваецца недзе ў Чачэніі. Калі бачу яго па тэлевізіі, дык плачу. Можа, калі спаткаемся — на гэтым ці тым сьвеце.

**Руслан Равяка**
**паводле gazeta.pl**

# Падводныя электрастанцыі ў Нарвэгіі

Нарвэжцы падлучылі да сеткі першую падводную турбіну, лопасьці якой круцяцца пад узьдзеяньнем плыні марской вады. Сёлета зьбіраюцца збудаваць яшчэ 20 гэткіх марскіх млыноў.

Нарвэская электрастанцыя цалкам незалежная ад атмасфэрных варункаў, таму мае вартасьці, якіх няма ў іншых крыніц аднаўляльнай энэргіі. Незалежна ад таго, ці сьвеціць сонца, ці дзьме вецер, марскія плыні застаюцца нязьменнымі і генэруюць ток такой самай моцы. Брытанцы таксама зьбіраюцца ажыцьцявіць падобны праект.

Думка аб выкарыстаньні мора для здабычы энэргіі ня новая. Першы такі мэханізм збудавалі яшчэ ў 1967 г. у Францыі ў вусьці ракі Ранс. Ён працуе дагэтуль і мае магутнасьць 240 мэгават. Досьледныя электрастанцыі паўсталі таксама ў Кітаі, Індыі, Канадзе і Расеі.

Прынцып дзейнасьці тых станцый падобны да звычайных запруд на рацэ: найперш прыліў напаўняе адмысловыя зборнікі, круцячы электрычныя турбіны. Потым вада адтуль



**Гэтак будуць выглядаць падводныя млыны.**

перацякае ў акіян.

Як выявілася, падобныя вадзяныя электрастанцыі не такія ўжо і экалягічныя. Францыя хутка адмовілася ад амбітнага пляну будаўніцтва яшчэ 20 такіх аб'ектаў. Як і ў выпадку гацяў на рэках, электрастанцыі такога тыпу шкодзяць рыбам і ўскладняюць суднаходзтва. Зялёныя сьцьвярджаюць, што будаўніцтва запруды на Ранце загубіла марскую экасыстэму ў навакольлі 500 км.

Да сёньняшняга вельмі экалягічнага спосабу выкарыстаньня энэргіі прыліваў марскімі млынамі дадумаліся толькі пры канцы 1990-х. Першая экспэрымэнтальная турбіна, усталяваная ў ваколіцах Лох-Ліхну ў Шатляндыі ў 1995 г., месьцілася на заякараным плыце і выпрацоўвала толькі 15 кВт электраэнэргіі.

Нарвэская турбіна магутнасьцю 300 кВт упершыню была падлучана да энэргетычнай сеткі некалькі месяцаў таму. Працуе яна ў цясьніне Квалсунд каля нарвэскага мястэчка Хамэрфэст і важыць амаль 200 тон. Да канца 2004 г. нарвэгі плянуюць паставіць 20 такіх турбін, якія будуць забясьпечваць падачу энэргіі ў ваколіцы вёскі Квалсунд, дзе жыве 1100 жыхароў. Каштаваць гэта будзе каля 1,7 млн эўра.

Прынцып дзеяньня турбін просты: у цясьніне безь перапынку адбываюцца прылівы і адлівы, ваганьні ўзроўню вады пры якіх складаюць да 3 м. У першай палове сутак прыліў прыносіць марскую ваду ў затоку з хуткасьцю да 2,5 м/с, а ў другой палове вада вяртаецца назад у мора. Таму падводныя млыны замацаваны на рухомых асновах даўжынёю 10 м, якія кожныя 12 гадзін 25 хвілін паварочваюцца на 180 градусаў. Асновы турбін знаходзяцца на глыбіні 17 мэтраў. Гэта дае магчымасьць свабоднага праходу караблёў. Самі лопасьці турбіны круцяцца з частатой сем абаротаў за хвіліну, таму ніводная рыба, якая апынецца каля іх, ня будзе пасечана на кавалкі.

Адзінай праблемай застаецца кошт энэргіі. Электрастанцыя не спажывае паліва, аднак будаўніцтва не было нятанным, таму ток утрая даражэйшы ад традыцыйнага. Стварэньне турбіны аплацілі некалькі нарвэскіх фірмаў і дзяржава. Бізнэсоўцы гэтыя, аднак, не альтруісты: такая ідэя ў будучыні можа прынесьці мільёны даляраў.

**РР; «Gazeta Wyborcza»**

# Юшчанка зьмяняе стыль улады

52% за Юшчанку, 44% за Януковіча: канчатковыя вынікі выбараў абвешчаныя 10 студзеня ўкраінскай ЦВК. Хто стане прэм'ерам пры Юшчанку? Што мяняе Юшчанка на версе ўлады?



AP

У якасьці магчымых дат Юшчанкавай інаўгурацыі называюцца 13, 14 ці 16 студзеня. У гэтым апошнім выпадку ў Кіеў мог бы прыехаць амэрыканскі дзяржсакратар Колін Паўэл. Жаданьне прысутнічаць на цырымоніі выказалі некалькі прэзыдэнтаў і прэм'ер-міністраў краін ЭЗ, у тым ліку прэзыдэнты Польшчы й Літвы Аляксандар Квасьнеўскі і Валдас Адамкус.

Юшчанка шукае цяпер новы будынак для рэзыдэнцыі кіраўніка дзяржавы, каб не давялося працаваць у ненавісным народу палацы Леаніда Кучмы на Банкаўскай вуліцы, дзе ў савецкія часы засядалі першыя сакратары ЦК кампартыі. Новай рэзыдэнцыяй прэзыдэнта мае быць Дом настаўніка на Ўладзімерскай вуліцы, дзе падчас Першай сусьветнай вайны была абвешчана нядоўга праіснаваўшая Ўкраінская Народная Рэспубліка, ці адзін з будынкаў на тэрыторыі старажытнага Сафійскага сабору, адной з найстарэйшых праваслаўных сьвятынь Кіеўскай Русі.

Юшчанка абяцае таксама, што яго адміністрацыя будзе зьменшана да памераў канцылярыі, прызначаной на абслугоўваньне кіраўніка дзяржавы. У іншых краінах былога СССР адміністрацыя прэзыдэнта — гэта ўсёмагутная ўстанова, якая дублюе ўрад і найважнейшыя дзяржаўныя органы.

Асьцярожны Віктар Юшчанка не сьпяшаецца называць свайго кандыдата ў прэм'ер-міністры. Нацыянальна-дэмакратычныя партыі зьвязваюць свае надзеі з палкай Юліяй Цімашэнкай, якая была галоўным трыбунам Юшчанкавай прэзыдэнцкай кампаніі і зарэкамэндавала сябе эфэктыўным віцэ-прэм'ерам у 2001—2002 гадах.

**МБ**

# Мір на радзіме «Аль-Каіды»

Падпісаньне пагадненьня паміж урадам Судану і паўстанцамі Поўдня ўжо названа заканчэньнем самай доўгай грамадзянскай вайны ў Афрыцы — 21 год.



AP

Адна з найбольшых па плошчы краін сьвету Судан, утвораная на месцы былой брытанскай калёніі, дзеліцца на Поўнач і Поўдзень, прычым адразу паводле некалькіх прымет — рэлігійнай, этнічнай і гістарычнай.

Поўнач заўсёды была бліжэйшай да вялікіх цэнтраў і шляхоў цывілізацыі. На Поўначы месьцілася старажытная дзяржава Куш, якую грэкі назвалі Эфіёпіяй. Менавіта цары Кушу, якіх не скарылі нават рымляне, у свой час захапілі Эгіпэт.

У часы Сярэднявечча тут існавала хрысьціянская дзяржава нубійцаў. Арабы, якія і далі краіне сёньняшнюю назву — Судан («край чорных»), здолелі замацавацца на яе тэрыторыі толькі ў XIV стагодзьдзі — на сем стагодзьдзяў пазьней, чым у суседнім Эгіпце. Арабы і прынесьлі ў краіну іслам, які пусьціў моцныя карані на Поўначы. Поўдзень доўгі час заставаўся паганскім і — крыніцай рабскай сілы для Поўначы. З прыходам брытанцаў тут пачало пашырацца хрысьціянства.

Неабходна згадаць, што гісторыя Судану не абышлася без удзелу беларусаў: краіну наведвалі пісьменьнік Юзаф Сянкоўскі ды прадпрымальнік і палітык Раман Скірмунт. А каталіцкая місія на чале з ваўкавысцам Максімам Рылём спрычынілася да ўзьнікненьня ў 1881 годзе махдзісцкага руху. Пад кіраўніцтвам Ахмэда Махдзі суданцы разьбілі войска брытанскага губэрнатара Гордана і стварылі сваю дзяржаву. На гэтую падзею адгукнуўся Рэдзьярд Кіплінг, які назваў суданцаў самымі мужнымі ворагамі ангельцаў.

Паўнацэнную незалежнасьць суданцы набылі толькі 1 студзеня 1956 году. Але адзінства краіны было толькі на паперы — жыхары Поўдня адразу сталі дамагацца самастойнасьці.

Праблема ўскладнялася тым, што краіна хілілася ў бок аўтарытарызму, прычым Судан паспытаў дыктатараў на любы густ. Так, генэрал Абуд (1958—1964) быў клясычным вайсковым дыктатарам. Джафар Німэйры (1969—1985) спачатку прэтэндаваў на ролю сацыяліста, рэвалюцыянэра і вёў барацьбу з Кадафі і Насэрам за права называцца правадыром усіх арабаў, а пасьля перайшоў на праамэрыканскія пазыцыі. Сёньняшні кіраўнік дзяржавы Хасан аль-Башар — тыповы ісламіст. Менавіта ў Судане ўзьнікла «Аль-Каіда», і сюды па досьвед прыяжджалі чачэнскія вахабіты. Апроч таго, галоўнага ідэоляга суданскага рэжыму аль-Турабі ўжо называюць другім Хамэйні.

Поўдзень мала зважаў на гэтых дыктатараў, і сёньня гэта дэ-факта ўжо самастойная дзяржава. Каб трапіць туды, патрэбна візы ня Хартума, а ўраду Джона Гаранга — правадыра Суданскай народна-вызваленчай арміі, утворанай у 1983 годзе.

Такім чынам, дамова, спансараваная і вітаная Вашынгтонам, толькі легалізуе існуючае становішча. Новым зьяўляецца абяцаньне рэфэрэндуму аб незалежнасьці празь пяць год і дамова аб сумесным карыстаньні нафтай. Такім чынам, атрыманьне Беларусьсю дывідэндаў паводле леташняй дамовы з Хартумам робіцца справай даволі сумнеўнай.

**Вацлаў Шаблінскі**

## СЬЦІСЛА

### У Літве зноў агенты

Люстрацыі афіцэраў запасу КГБ ня будзе, паведамляе «Летувас Рытас». Шэф люстрацыйнай камісіі Вітаўтас Дамуліс заявіў, што гэтага закон пра люстрацыю не прадугледжвае, бо асобы, запісаныя ў сьпісы савецкае спэцслужбы, не былі таемнымі агентамі. Тлумачэньне зьявілася пасьля інфармацыі ў літоўскай прэсе, што міністар замежных спраў Літвы Антанас Валёніс і шэф Дэпартамэнту бясьпекі краіны Арвідас Поцюс былі афіцэрамі запасу КГБ. Запас КГБ прадугледжваўся на выпадак надзвычайных сытуацый, напрыклад, вайны. У мірны час гэтыя людзі не ажыцьцяўлялі ніякай дзейнасьці, што была б скіравана супраць грамадзян сваёй краіны. За адстаўку гэтых урадоўцаў выступаюць апазыцыйныя кансэрватары.

### Пуціна цягне на фашызм

Кіраваньне Пуціна ў Расеі набывае ўсё больш рысаў фашысцкага тыпу, піша на старонках панядзелкавага нумару газэты «Лос-Анджэлас Таймз» вядомы брытанскі гісторык Наял Фэргюсан. Аўтар згадвае ліквідацыю свабоды СМІ, падпарадкаваньне гаспадаркі сілавікам і падтрымку сэпаратысцкіх тэндэнцый сярод расейскамоўнага насельніцтва суседніх краін — накшталт таго, што Гітлер рабіў з Судэтамі, Эльзасам і Аўстрыяй. Пуцін — гэта расейскі варыянт Пінахэта ці Франка, адно што Расея больш небясьпечная для сьвету за Чылі, засьцерагае гісторык-русафіл.

**МБ; СП; паводле замежнае прэсы**



NEW YORK TIMES

# Самы злавесны анэкдот году

Калі б не трагічная памылка тэлефаніста ў мальдыўскім Міністэрстве абароны, на архіпэлягу магло б ня быць ахвяр цунамі, якое спусташыла Азію. Гісторыя нагадвае злавесны жарт. Расказвае яе мальдыўскі інтэрнэт-партал «Dhivehiobserver. com».

26 сьнежня пасьля землятрусу ў раёне Суматры з назіральнага цэнтру ў Ганалулу, які адсочвае стан акіяну і ўзьнікненьне хваляў цунамі, паспрабавалі перадаць папярэджаньне ў міжнародны аэрапорт у сталіцы Мальдываў, але ніхто ня браў трубкі.

Тады назіральнікі патэлефанавалі да прэзыдэнта Мальдываў Маўмуна Гаюма, але аўтаадказчык паведаміў, што ён на адпачынку. Урэшце дзяжурнаму з Ганалулу ўдалося перадаць дзяжурнаму сяржанту ў мальдыўскім Міністэрстве абароны паведамленьне для міністра такога зьместу: «Праз пару гадзін з боку Інданэзіі Мальдыўскіх выспаў дасягне цунамі (tsunami)». Дзяжурны запісаў тэлефанаграму для міністра на бланк. Зьмест запісу быў наступны: «Праз 2 гадзіны з Інданэзіі прыбудзе пан Т.Сунамі (T.Sunami)».

Міністар выслаў у аэрапорт дэлегацыю для ўрачыстага прыёму пана Т.Сунамі. Дэлегацыя мела нават шыльду з прозьвішчам паважанага госьця.

На Мальдыўскіх выспах колькасьць сьмяротных ахвяр цунамі аказалася адносна невялікай — 83 чалавекі ў параўнаньні са 155 тысячамі загінуўшых у Інданэзіі, Шры-Ланцэ і Індыі. Але гэта супастаўная лічба, калі ўлічыць агульную колькасьць насельніцтва Мальдываў — усяго 280 тыс. чалавек.

Хвалі цунамі залілі дзьве трацiны тэрыторыі сталіцы краіны Мале і змылі з паверхні шэсьць астравоў архіпэлягу.

# Рукі палітыкаў

**Гэта — рукі палітыкаў. У рукі мы перадаем ім уладу, іх рукі падпісваюць сьмяротныя выракі, але ж і іхныя рукі, паціскаючы адна адну, становяцца знакам згоды й кампрамісу. Шмат чаго сказана і зроблена ў палітычным жыцьці плянэты, зафіксаваным у дакумэнтах: дамовах, пагадненьнях, канстытуцыях, загадах. Гэта і ўзброеныя перавароты, і падзел сфэр уплыву, і аказаньне гуманітарнай дапамогі, і сакрэтныя місіі. Але ўсё гэта робіцца і фіксуецца РУКАМІ. Дзякуй тым, хто даверыў свае рукі майму фотаапарату.**

Андрэй Лянкевіч



Уладзімер Колас, кіраўнік зьліквідаванага Беларускага ліцэю імя Якуба Коласа, сябар Партыі БНФ.



Станіслаў Шушкевіч, першы кіраўнік незалежнай Беларусі — старшыня Вярхоўнага Савету XII скліканьня ў 1991—1994 гадах. Сёньня — старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады.



Натальля Машэрава, дачка былога першага сакратара КПБ Пятра Машэрава, экс-намесьніца начальніка галоўнага ўпраўленьня Парлямэнцкага сходу саюзу Беларусі і Расеі, дэпутатка палаты прадстаўнікоў нацыянальнага сходу II скліканьня, уваходзіла ў дэпутацкую групу «Зубр» (За саюз Украіны, Беларусі і Расеі).




Сяргей Калякін, дэпутат ВС XIII скліканьня. Першы сакратар Цэнтральнага камітэту Партыі камуністаў беларускай.



Аляксандар Дабравольскі, дэпутат ВС СССР (1989—1991), дэпутат ВС XIII скліканьня (1995—1996). Намесьнік старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП).



Віктар Карняенка, дэпутат ВС СССР (1989—1991), старшыня Фонду лякальнага разьвіцьця, Гомель.



Валер Фралоў, генэрал, былы камандзір 28-га армейскага корпусу, кіраўнік групы «Рэспубліка» палаты прадстаўнікоў нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусі (2000—2004). Сябра Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі («Народная грамада»).

Анатоль Лябедзька, дэпутат ВС XII і XIII скліканьняў. Старшыня АГП.



# Любча —

## месца, дзе жыве каханьне

Браты Іван і Генадзь Пячынскія, прадпрымальнік і лясьнічы, сваімі сіламі аднаўляюць замак у роднай Любчы. Дапамагала ім на будаўніцтве, а цяпер апавядае пра гэты цуд над Нёманам навучэнка Беларускага калегіюму **Кацярына Юркевіч**.



ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

**Ёсьць прапанова зрабіць у замку музэй каханьня — такі ж, як у Амстэрдаме.**

У незнаёмы горад трэба ўваходзіць на золку.

Любча сустрэла мяне ліхтарамі, брэхам сабак і празрыстым наднёманскім паветрам. Я доўга ўсьміхалася дарожнаму знаку, ня могучы ісьці далей. У заплечніку — ноч і 27 кілямэтраў пешага шляху з Наваградку. Раса на кедах і водар зёлак у валасах. У шыбах хат яшчэ мроіліся сны.

З вады падымаецца цёплы туман. Малочна-магутны, ён ператварае Нёман у мора, засьцілаючы берагі і мост, раскінуўшыся да самага гарызонту.

Ты дыхаеш гэтым туманам, ранкам і Нёманам, і становішся чыстым-чыстым, і хочаш стаяць тут заўсёды, чуючы водар мяты, і ты крышачку дрыжыш ад усёй гэтай шчырасьці.

Замак, што 400 год спакойна глядзеў у вочы вандроўнікаў і князёў. Буслоў — на кожнай хаце па гнязьдзе. Адзін бацян сядзіць на брамнай вежы, сем — на лістоўніцы ля бакавой, плечы якой ужо кратае дзень.

Тут немагчыма хадзіць не басанож. Скідаеш абутак і адчуваеш у целе жыцьцё.

Пад замкам паляць усю ноч вогнішча Андрусь з Генадзем Антонавічам, гавораць гадзінамі пра першы ў Беларусі дамініканскі кляштар, заснаваны тут кракаўскім пралатам дамініканам Вітам, пра капялюш князя Крыштапа, прастрэлены пад Смаленскам.

Андрусь — 22-гадовы чарнявы каржакаваты хлопец з мазолістымі рукамі. У ягоных жывых чорных вачах зьліваюцца адлюстраваньні двух агнёў — таго, іскры якога мяшаюцца з зорамі, і таго, што прымушае Андруся прыяжджаць сюды зь Менску кожныя выходныя і прывозіць усё новых людзей, «запальваючы» і іх.

Генадзь Антонавіч (ці проста дзядзя Гена) усё жыцьцё пражыў у Любчы, і мо таму ягоны позірк заўжды напоўнены любоўю. І калі ты, валанцёр, прыйдзеш сюды раней за астатніх — як гэта здарылася са мной, — ён прывядзе цябе да сябе, у вялікую хату, і пазнаёміць з усьмешлівай працавітай жонкай. Яна смачна накорміць цябе «да расьпяртухі», і ён, з запалам штурхануўшы тваё плячо, скажа: «Ну што, пад’елі?!. Ты ж, напэўна, спаць хочаш? Вунь у тым пакоі… Ці спачатку ў лазьню? Нядаўна нацяплілі». А пасьля абеду прыедзе Іван Антонавіч, ягоны брат, з астатнімі валанцёрамі, і тады ўжо часу для адпачынку ня будзе.

Пакуль жа зусім зь іншай хуткасьцю ідзе час — такой, калі няма патрэбы лічыць яго. Седзячы ля вогнішча, даеш безьліч абяцанак — сабе, Нёману, ранку, — што будзеш жыць асэнсавана, што будзеш кахаць, што застанешся тут… І што жыцьцё тваё будзе прыгожым, і што ты зразумееш, што мусіш зрабіць у ім. Як зразумеў Іван Антонавіч.

Ёсьць людзі, што маюць Сапраўдную Мару. Яны нібыта цягнуць за вяровачку зь дзяцінства ў сталасьць і зусім ня думаюць расставацца зь ёй дзеля дарослых праблем.

Іван Пячынскі жыве ў Менску, яму 52 гады. А сыляды на шляху да Сапраўднай Мары пачалі зьяўляцца толькі ў 2003 годзе.

— Проста я зразумеў, што калі ў гэтым годзе не пачну, то ўжо ніколі. Паехаў да брата, што робіць лесьніком, і да сябра дзяцінства, мясцовага мастака М.Проньскі. І панеслася… Стварылі ініцыятыўную групу, пасьля грамадзкае аб’яднаньне «Дабрачынны фонд «Любчанскі замак»… Пачаў езьдзіць па былых супрацоўніках гэтага праекту, зьбіраць у адно яго аскепкі.

> Перапраўляючыся цераз Нёман, Міндоўг сустрэў Марту, сваю будучую жонку, — і пакахаў зь першага позірку. У гонар месца, дзе нарадзілася іх каханьне, назваў яго Любеч, кажа легенда.

Бізнэсовец зь Менску — строгі, нават крыху рэзкі — ператвараецца раптам у эмацыйнага чалавека, натхнёна гараць ягоныя вочы. Гараць Сапраўднай Марай.

— Зроблены дах над вежай, выкладзены гзымс з цэглы, зьбіраемся аднаўляць прыбудову да вежы ў тэхніцы «Прускі мур» (фахвэрк). Гэта старажытная тэхніка, больш вядомая ў Нямеччыне, чым у нас. Усталюем дахоўку, шпіль зь мядзяным рэнэсансным шарам, копію ветраніку. Дарэчы, гэта быў адзіны знойдзены ў Беларусі ветранік з геральдычным узорам (гербам). А пасьля адчынім музэй, там будуць экспанаты па гісторыі замку і места… Мы нават плянуем паставіць гармату, дзе яна калісьці стаяла. Зрабілі электрамагнітнае дасьледаваньне пляцу. Яно паказала, што там былі тры калодзежы, палацавыя пабудовы, падземны пераход з аднаго боку брамнай вежы ў другі.… Хто дапамагае? Ды ўсе. Палова архітэктурнага факультэту БНТУ езьдзіць сюды на летнікі і працуе, працуе…

У каго ні запытайся — хочуць вярнуцца. Бо Любча — месца, дзе жыве каханьне.

Калі столькі людзей маюць Сапраўдную Мару, яна ня можа ня спраўдзіцца. Гэта закон прыроды.

Працы зроблена больш чым на 26 млн рублёў, а ўкладзена 6 млн. Андрусь бясплатна рабіў праект, канструктар Ц.Пецольд, загадчык катэдры архітэктурнага факультэту, — рэцэнзію. Дэпартамэнт не даваў дазволу, «прычапіўшыся» да гістарычнай формы даху. Прафэсар кафэдры напісаў, што згодны. Дзядзя Гена дапамог з дазволам ад лясьніцтва, дзякуючы яму на лесапавале працавалі бясплатна (а гэта самая цяжкая праца). Усе экспэртызы рабілі бясплатна. Год даказвалі і рабілі праекты — змагаўся Беларускі фонд культуры.

Замак з трох бакоў атачае роў глыбінёй два мэтры, з чацьвёртага боку — Нёман. Тут будзе музэй, другі ў Любчы. Першы займае ўвесь трэці паверх Любчанскай школы. Дарэчы, была вельмі цікавая прапанова зрабіць у замку музэй каханьня. І месца адпаведнае, і ў сьвеце такі толькі адзін яшчэ — у Амстэрдаме.

Калі дабудоўвалі бакавую вежу, усярэдзіну заклалі капсулу, дзе пералічаны імёны валанцёраў. І яшчэ там напісана, што «калі вы гэта чытаеце, то гэта значыць, што замак зноў разбураны. Просім вас сабрацца, як калісьці мы, і аднавіць яго».

«Калі я цяпер праходжу ля гэтых вежаў, мне лягчэй жывецца», — кажа Іван Антонавіч.

А мае рукі пасьля такіх вандровак яшчэ доўга пахнуць халоднай калодзежнай вадой. А ў думках — жаданьне дапамагаць.

# Заўвагі простага грамадзяніна пра тое, што рабіць

Ствараем сабе ідэалы. Верым у іх шчыра. Адракаемся ад свайго «памылковага» мінулага. Забываем яго, як нешта несапраўднае. Хочам адразу паведаміць пра свае адкрыцьці ўсяму сьвету, але якая недарэчнасьць: амаль нікому вакол не цікава. Але ж гэта так важна, што мы ўсё ж гатовыя змагацца й нават пэўную частку жыцьця пакласьці на гэтую справу. Ды толькі б'еш галавой па мураванай сьцяне, а галава ня камень — пачынае балець. Знаходзяцца й тыя, якія нібыта разумеюць цябе й кажуць словы, якіх чакаў. Але кажуць яны таксама й пра тое, што справа твая марная. Хоць і твая праўда, але ўсе намаганьні твае пустыя, бо нікому нічога ня трэба, акрамя як паесьці, адзецца ды паспаць падаўжэй — і яшчэ, што вельмі істотна, каб ніхто не чапаў. Патроху вакол зьбіраецца нейкае новае кола «сваіх», абраных, пасьвячоных у таямніцу. Цяпер таямніцу. Тое, што раней велікадушна жадаў падараваць усім навокал, як нейкі скарб, раптам ператварылася ў небясьпечнае для агульнага карыстаньня, прызначанае й зразумелае толькі для абраных. Штосьці, што трэба хаваць ад астатніх, каб не запэцкалі бруднымі сваімі… Вось яна, страшная мэтамарфоза. Не ўдалося ўжо ў каторы раз пазьбегнуць яе. Вынаходнікі нацыянальнае годнасьці зноў так і ня здолелі данесьці яе да галоўнага ўладальніка — да народу. Зноў усе тыя, хто застаўся там, за сьпінай, ці, наадварот, забег далёка наперад (залежыць ад таго, зь якога боку глядзець), успрымаюцца як ненармальныя. Толькі хто зь цяперашніх адраджэнцаў у свой час ня крочыў пад піянерскія маршы або, прынамсі, не чытаў з імпэтам савецкія патрыятычныя вершы? Але пра гэта не цікава. Больш цікавяць тыя, хто не паверыў. Альбо тыя, хто ня верыць ужо ні ў што й нікому, — тыя, што зьняверыліся. Якім засталася цяжкая праца, якіх назіраеш штодзень у грамадзкім транспарце, ля крамы і ў краме, паўсюль. Якога так баішся аднойчы разгледзець у люстэрку. Пра тых, хто застаўся там, у краіне Савецкі Саюз.

Што параіце мне рабіць? Бо верыце мне ці не, але я з тых, хто хоча жыць не ў Расеі і не ў Эўропе, бо я ўжо й так жыву ў Эўропе. І я падзяляю азначэньні Эўропы і Эўрапейскага Зьвязу, дзе й Польшча пакуль ці адчувае сябе як дома. Але я хацеў бы жыць у нашай з вамі любай старонцы, Беларусі. Такой утульнай і прыгожай, такой зьнявечанай чужынцамі і пагарджанай роднымі сынамі. Такой, што ніяк ня хочаш пакідаць яе. Камусьці, першаму-лепшаму. Але што ж мне рабіць? Ненавідзець тых іншых, непадобных? Тых, хто думае інакш ці ўжо ніяк ня хоча думаць. Не заўважаць іх? Іх няма. Ды толькі як жа няма — тады й мяне няма таксама, бо ў нейкім сэнсе я частка «тых».

Сёньня мы падзеленыя. Гэта сумны факт сёньняшняй Беларусі. Шукаць вінаватых — марная справа й да таго ж вельмі небясьпечная, бо сярод такіх знойдзеш і самога сябе. Народу незразумелыя высокія ідэі, асабліва калі ніхто не цікавіцца яго праблемамі штодзённымі. Дый які ідэалізм, калі зусім нядаўна цябе надурылі. Не адно пакаленьне пражыло ў зусім іншай краіне і ня толькі ня памятае, але й не разумее новай краіны з новымі ідэямі. Што застаецца? Трэба яшчэ й жыць. І тут зьяўляецца нехта, хто прапануе простае выйсьце, хтосьці рашучы, вельмі агрэсіўны. Хтосьці з надпісам на транспаранце: «Я за вас».

Як бы там ні было, ні ў якім разе нельга крыўдаваць на народ і вінаваціць яго. Гэта шлях у нікуды. Сёньня настае такі час, калі тым, хто хоча жыць менавіта ў Беларусі, а не абы-дзе, абы добра было, трэба яшчэ раз перагледзець сваё стаўленьне да народу, свае ідэі і адну з галоўных ідэй — ідэю нашай з вамі Беларусі. Як мне здаецца, гэта нават больш важна, чым перамога на бліжэйшых выбарах, чым перамога над прэзыдэнтам ды яшчэ больш страшным і небясьпечным, на маю думку, апаратам, які захаваўся яшчэ з Саветаў і ўмацаваўся за час панаваньня рэжыму. Гэты рэжым у любым выпадку ня вечны. Ён сам сябе штурхае ў бездань. І нічога добрага тут няма. Бо мы разам. Трэба адчуваць гэтую дзяржаўную адказнасьць за ўсіх, у тым ліку й за тых, супраць каго сёньня гуляеш у палітыцы. Бо гэта таксама мы. Сапраўды мы, падабаецца гэта ці не. Для перамогі, для гарманічнага пераходу ўлады патрэбна новая ідэя Беларусі. Прывабная для большасьці беларусаў, а ня толькі для мовазнаўцаў, гісторыкаў і эканамістаў.

Тое, што бачу сёньня я, просты грамадзянін краіны, ня можа радаваць. Нейкая мітусьня. Усе вакол думаюць пра неістотнае й не зважаюць на галоўнае. Вось трэба скінуць рэжым, і тады заўжывём. Як заўжывём, дзе заўжывём — на гэтыя пытаньні адказаў, прынамсі, цікавых для мяне, пакуль ня чуў. Нейкія агульныя фразы пра «Эўропу».

Тое, што прапаноўвала «Пяцёрка-плюс», вельмі добра, і гэта менавіта тое, што хацелася пачуць. Толькі прапаноўваецца гэта сьціпла і, рызыкую атрымаць шмат нараканьняў у свой бок, часта ня тымі. Народ яшчэ памятае тое ж спадарства з зусім іншымі прамовамі. Але важна, што патроху пачынаюць зьнікаць ілюзіі наконт прэзыдэнта як галоўнага ворага й яго ролі на палітычнай арэне. Бо самы час ужо задумацца над тым, чаму ён дагэтуль сядзіць так высока й так непахісна. Каму гэта трэба? Ці ня тым, на каго так спадзяваліся і да каго неадназоўна зьвярталіся падчас мінулай прэзыдэнцкай кампаніі? А менавіта — заангажаваная у палітыку намэнклятуры. Памыляюцца тыя, хто ўсур'ёз лічыць, што гэты вэртыкальны апарат разбурыцца, нібы картачны домік, адразу пасьля падзеньня рэжыму.

Трэба працягваць рабіць тое, што пачалі рабіць падчас апошняй кампаніі, — непахісна працаваць з народам і на народ, зьвяртацца з ужо існымі напрацоўкамі «Пяцёркі+» менавіта да людзей, а не да апарату, а таксама рэагаваць на ўсе новыя праявы нездаволенасьці. Не круціцца вакол нейкай асобы і яе атачэньня, тым самым уздымаючы цікавасьць менавіта да яе, а грукаць у дзьверы кожнага грамадзяніна і казаць пра сябе, прапаноўваць свае шляхі вырашэньня канкрэтных праблем, прапаноўваць альтэрнатыву. Тое, што нібыта й пачалі рабіць апошнім часам, але ніяк не атрымоўваецца пазьбегнуць спасылак на ўсю тую ж самую асобу прэзыдэнта. Відома, ён стабільна дае новыя нагоды не забываць пра яго. Але пра гэта ўсе ведаюць і збольшага ўжо маюць сваё стаўленьне, якое цяжка зьмяніць простымі заклікамі і паўторамі «Гэта кепска». Больш цікавяць адказы на пытаньні, на якія адказаў пакуль сапраўды не чувацць: «А хто, калі ня ён?» і «А што і як будзе пасьля яго?».

Канечне, трэба мець нешта ўзамен. Ня трэба выдумляць нічога новага, варта прыгадаць простую ідэю лепшага дабрабыту, спалучаную з усьведамленьнем таго, што мы самі адказныя за наш дабрабыт. У кожным разе ідэя абавязкова павінна аб'ядноўваць, а не разьядноўваць нацыю. І яшчэ — гэта тое, чаму я навучыўся як чытач «Нашай Нівы»: ёсьць Беларусь, і гэта не абмяркоўваецца. Але зьяўляецца й непераадольнае адчуваньне таго, што дагэтуль яшчэ жывуць у розумах, нават апазыцыйных, дылемы накшталт «Беларусь альбо дэмакратыя. Ці не ахвяраваць нам дзяржаўнасьцю на карысьць лепшай долі?». Колькі ж яшчэ трэба жыць і думаць, каб зразумець, што Беларусь — гэта як той грунт пад нагамі. Можаш рухацца, куды розум дазваляе, але як страціш зямлю пад нагамі, што з табой здарыцца? Безумоўна, ёсьць рэчы, якія цяжка прамаўляць натоўпу, непапулярныя, як здаецца. Страшна, што ён не пачуе й закідае камянямі. Але прамовіць іх трэба менавіта цяпер. Часта здараецца так, што не народ баіцца радыкальных перамен, а тыя, хто павінны іх агучыць і распачаць, закласьці грунтоўны базіс для далейшага жыцьця краіны.

**Андрэй Ананьеў, Гомель**




**Апошнім часам усё выразьней відаць, што сутнасьць панятку «незалежнасьць» — у пазбаўленьні ад залежнасьці. Пакуль яна існуе — існуюць і станцыі мэтро зь ленінскімі назвамі, і савок у душы нашага народу. Таму назва «Плошча НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ» — гэта і лёзунг «Не — залежнасьці!».**

**На маім малюнку — шыльда зь няісным насамрэч адрасам. «Не — залежнасьці» — гэта тое, што жыве ў нашых душах, гэта наша прага «людзьмі звацца».**

**Павал Чумакоў**

## Студэнты ратуюць Крэва

Хачу распавесьці пра маладзевае краязнаўчае таварыства «Этна». Улетку, заручыўшыся падтрымкай Мінкульту, «Этна» пачала працы ў Крэўскім замку. Дзяўчаты ў гэты час працавалі ў наваствораным этнаграфічным музэі. Хлопцы цягалі камяні на муры, латалі найбольш небясьпечныя месцы. Але народнае выслоўе-праклён «Каб ты на Крэва камяні цягаў» не пра іх. Тут усё па сваёй волі. Нават увосені сябры таварыства штовыходныя выбіраліся ў Крэва, каб дакончыць распачатае. Працы багата, бо руіны Крэўскага замку ў вельмі кепскім стане. Таму «Этна» запрашае ўсіх неабыякавых да гістарычнай спадчыны да супрацоўніцтва.

**Вольга Чайчыц,**
**Volhachaichyts@yandex.ru**

## Спадчына акупацый

Жыхарам Беларусі прыходзіцца доўга чакаць на палёгку ў жыцьці. Усе перамены, што былі, дабра беларусам не прынесьлі, і акупацыя за акупацыяй руйнавалі жыцьцё людзям, іхнюю гаспадарку, і кожная акупацыя рабіла чыстку на непажаданы элемэнт. І пад акупацыяй жыць можна, але незаможна. Акупант абкладае падаткамі і ўсё сабе забірае. Беларусь для мяне — гэта востраў, на якім шмат чаго асталося з савецкіх часоў — назвы вуліц, мясьцін, школ, станцыяў. Знаю, што ёсьць, як і ў іншых краёх, навукоўцы, ёсьць людзі працы і кіраўнікі розных установ, паэты, філёзафы і супрацоўнікі розных галін навуковых. Таксама ёсьць людзі, што моцна грашаць і менш грашаць: чалавек як жыве, дык, вядома, думкамі грашыць — але за гэта яго не караюць, аж пакуль ён ня выкажа свае думкі на паперы.

Мой бацька расказваў мне, як яму прыходзілася ў жыцьці. Яму было 14 гадоў у першую вайну. Каб дагадзіць акупанту, трэба да яго на ягонай мове гаварыць. Вось з расейцамі гаварыў па-расейску, да акупантаў-немцаў у 14-годзьдзе гаварыў па-нямецку, трохі падвучыўшы іхнюю мову. Пад акупацыяй польскай гаварыў да палякаў на польскай мове. А я сказаў бацьку: я ня буду да акупанта Беларусі гаварыць на ягонай мове. Дык бацька сказаў, што такіх, як я, арыштуюць — і будзеш сядзець у вязьніцы. Я пажыў і пабачыў, што гэта ўсё адбываецца, як бацька казаў. Але ўсё ж, на маю думку, каб маглі сваёй мовай гаварыць з адвагай і павагай ды не баяцца чужынцаў, тады пачался б нармальнае жыцьцё для беларусаў. А як няма ў Беларусі фундамэнтальных дзяржаўных унівэрсытэтаў і каледжаў ды няма прэзыдэнцкіх прамоў да народу на беларускай мове, дык няма і чым цешыцца.

Мне ў ЗША лягчэй гэтае сказаць і пісаць, але ў Беларусі дык расейская і польская мовы ўжываліся адважна, а беларускую даводзілі да паніжэньня. Ужо прайшло 60 гадоў, як я пакінуў Беларусь, а стаўленьне да беларусаў амаль не зьмянілася.

Сп.А.Ворвуль у «Слоўніку скептыка» зазначыў: «Беларус — славянскі габрэй», а я дадаў бы — або цыган. У Беларусі трактавалі габрэя, цыгана і беларуса як чужынца краіны. Расейцы і палякі былі гарой ды іх мова была ўрадавай, яны былі ўпрывілеяваныя. Гэтыя дрэнныя звычкі пераносяць з пакаленьня ў пакаленьня. Цяпер Беларусь мала знаная, бо мова беларуская не на правах дзяржаўнай. Хачу пажадаць, каб хутчэй нас суседзі пачалі лічыць за народ дзяржаўны.

**Канстанцін Верабей,**
**Нью-Ёрк**

## Гаўнарок

Гэтае слова я ўпершыню пачуў колькі год таму ад сябра. Я рэкамэндаваў яму новенькія на той час кружэлкі са складанкамі беларускай цяжкай музыкі. «А-а-а, — пазяхнуў той, — усё гэта гаўнарок». Я зьбянтэжыўся, бо ўсё новае беларускае ў сучаснай музыцы мной уважалася ці не за адкрыцьцё Амэрыкі, а кепскія ўзоры беларускага року тлумачыў сабе альбо выдаткамі пераходнага пэрыяду, альбо «зародкавым станам беларускага музычнага шоў-бізнэсу». Час ішоў. Зьяўлялася новая прадукцыя — і пачуцьцё ўсёдараваньня чэзла на вачох. Якасьці не пабольшала, песьні ў памяць не западалі, а самі кружэлкі... Выходзіла, што якаснага прадукту на кружэлцы было ў адносінах прыблізна 1:4.

Пасьля першай (досыць спрэчнай па сваім значэньні для беларускага шоў-бізнэсу) «Крамбамбулі» і эпахальнага энэрэмаўскага «Дому культуры» набываць абы-што ахвота запрапала. Але адсутнасьць усяго спэктру беларускай музыкі ў радыёэтэры змушала гэта рабіць зноў, каб ацаніць «навенькае». І часта даводзілася зазнаваць горкае пачуцьцё: «Ня тое». Я ня маю на ўвазе пэўны музычны напрамак. Люблю з музыкі ўсё, што «для вушэй вельмі прыманнае», як некалі казаў пісьменьнік Савіч-Заблоцкі. А дзе ж тое «прыманнае»? Папса мясцовая амаль спрэс па-расейску. Альтэрнатыўную музыку многія музыкі разумеюць так: дзяры лаўчэй струны ды нясі нейкую неціцу — ніхто тваіх слоў не разьбярэ. Ня тое, што не разьбярэ — слухаць ня стане.

Я ня буду называць канкрэтных імёнаў і назваў. Музыкі да прадусары ў Беларусі больш крыўдлівыя, чым літаратары. Але тэрмінам «гаўнарок» паслугоўваюцца міжсобку досыць актыўна, абзываючы «гаўнарокерскай» пясочніцу канкурэнтную ці неляяльную. А церпіць ад усяго прыхільны да беларускай музыкі слухач, які глядзячы на чарговы дыск ня можа даўмецца, што яму ўрэшце прапаноўваецца — «гаўнарок» ці нешта сапраўды «для вушэй прыманнае».

**Сяргей Балахонаў,**
**Гомель**

## СВОЙ СЛОЎНІЧАК

### Кастрыца

Кастрыца небагатая на разнастайныя моўныя формы. Наша гаворка бліжэйшая да беларускай літаратурнай мовы. Натуральна, што ёсьць пэўныя асаблівасьці. Так, замест таго каб казаць «зашпіліць», у нас кажуць «зашпілкнуць» ці «паграбы» замест «лёхі». Аднак апошнім часам узьнікаюць і новыя словы. Ці старыя словы пачынаюць ужывацца ў новым значэньні, як «бадыльле» ці «драбы». Таму і прапаную чытачам «НН» зусім маленькі слоўнічак.

**Акалелы** — п'яны. *Ты ўчора зусім акалелы быў.*

**Бадыка** — недарэка. *Ну як ты робіш, бадыка.*

**Бадыльле** — ламачча, калі пра адну якую-небудзь пэўную рэч, то **бадыліна**.

**Драбы** — кепская машына, нічога ня вартая. *Колькі твае драбы каштуюць?*

**Кіпцюрнуць** — уцякаць. *Ну ты ўчора й кіпцюрнуў!*

**Лягучка** — аўтобус, маршрутка. *Учора нешта халопеніцкая лягучка не праходзіла.*

**Тукнуць** — шуганнуць. *Пайду малых тукну.*

**Зьміцер Панкавец,**
**Кастрыца**
**(Барысаўшчына)**

# Так ці так?

Прафэсар Гарвардзкага ўнівэрсытэту **Курт Вулгайзэр** папрасіў зьмясьціць у газэце наступную анкету, каб сабраць зьвесткі пра моўныя ўпадабаньні беларускае моладзі.

Запоўненыя анкеты дашліце, калі ласка, электроннай поштай на адрас cwoolhis@fas.harvard.edu. Вашы адказы застануцца ананімнымі.

Электронны тэкст анкеты даступны на сайце «Наша Нівы» www.nn.by у разьдзеле «Навука».

## Частка І.

### А.

**1**. Узрост:

**2**. Пол:

**3**. Месца нараджэньня (вобласьць/краіна, назва гораду ці вёскі):

**4**. Дзе вы вучыцеся?

**5**. Факультэт/спэцыяльнасьць:

**6**. Ці слухаеце (слухалі) вы якія-небудзь курсы з выкладаньнем на беларускай мове? Калі так, якія?

**7**. Дзе вы скончылі школу?

**8**. Мова навучаньня ў школе:
пачатковай:
сярэдняй:

**9**. Кім вы хочаце працаваць у будучыні (пасьля заканчэньня ўнівэрсытэту)?

### Б.

**10**. Месца нараджэньня бацькоў (вобласьць/краіна, назва гораду ці вёскі):

бацька:

маці:

**11**. На якой мове (якіх мовах) вы размаўляеце з бацькамі, бабулямі і дзядулямі?

**12**. Калі ў вас ёсьць браты і сёстры, на якой мове (якіх мовах) вы зь імі размаўляеце?

### В.

**13**. Калі вы з расейскамоўнай сям'і, калі (у якім узросьце) вы пачалі актыўна карыстацца беларускай мовай? Хто больш за ўсё паўплываў на ваш выбар мовы (напрыклад, сябры, члены сям'і, настаўнікі ці інш.)?

**14**. На вашу думку, якую мову вы лепш за ўсё ведаеце — беларускую ці расейскую? Калі вы імі аднолькава добра валодаеце, ці ёсьць сытуацыі (ці тэмы), дзе вы адчуваеце сябе больш упэўненым у адной з гэтых моваў, чым у другой?

**15**. У якіх месцах вы звычайна гаворыце па-беларуску?

**16**. Ці адыгрывае мова (выбар мовы) значную ролю ў вашых адносінах зь іншымі людзьмі? Калі так, прывядзіце прыклады:

**17**. Мае найлепшыя сябры ўсе гавораць па-беларуску:

так не

**18**. З маімі найлепшымі сябрамі я заўсёды гавару па-беларуску:

так не

**19**. Мая будучая жонка/мой будучы муж абавязкова павінна/павінен гаварыць па-беларуску:
а) так, абавязкова
б) не, не абавязкова
в) пажадана, але не абавязкова

**20**. Калі вы жанаты/замужам, на якой мове гаворыць з вамі ваша жонка/ваш муж?

**21**. Як вы ставіцеся да ўжываньня дарэформавых правапісных нормаў беларускай мовы (тарашкевіцы)? Ці стараецеся вы самі прытрымлівацца гэтых нормаў?

**22**. Як вы ставіцеся да палітыкі афіцыйнага дзьвюхмоўя ў Беларусі? Што, на вашу думку, павінна рабіць дзяржава, каб пашырыць ролю беларускай мовы ў грамадзтве?

**23**. Як вы акрэсьлілі б тэрмін «трасянка»? Ці можаце вы прывесьці канкрэтныя прыклады «трасянкі» (якія вы чулі на вуліцы, у сям'і, у сродках масавай інфармацыі ці ў іншых кантэкстах)?

**24**. Як вы ставіцеся да маўленьня па-расейску зь беларускім акцэнтам? Гэта нейкім чынам набліжае гаворачага да вас ці яшчэ больш адштурхоўвае, у параўнаньні з маўленьнем чалавека, які гаворыць «чыста» па-расейску? Ці лічыце вы, што вы асабіста гаворыце па-расейску зь беларускім акцэнтам?

**25**. Як вы ацэньваеце ваша веданьне іншых славянскіх моваў (акрамя беларускай і расейскай):

польская мова
5 4 3 2 1 (5 — выдатна, 1 — слаба/ня ведаю)

украінская мова
5 4 3 2 1 (5 — выдатна, 1 — слаба/ня ведаю)

іншыя:
5 4 3 2 1 (5 — выдатна, 1 — слаба/ня ведаю)

**26**. Ці чытаеце вы на іншых славянскіх мовах? Ці слухаеце радыёперадачы, глядзіце тэлевізійныя перадачы на гэтых мовах? Калі так, якія?

**27**. Якія пэрыядычныя выданьні на беларускай мове вы чытаеце? Як часта?

**28**. Ці слухаеце вы радыё «Свабода» (беларускамоўныя перадачы)? Калі так, як часта?

**29**. Творы якіх беларускіх пісьменьнікаў вам больш за ўсё падабаюцца і чаму?

**30**. Ці слухаеце вы беларускі рок ці эстраду? Якія гурты/выканаўцы вам больш за ўсё падабаюцца?

**31**. Ці слухаеце вы расейскія ці расейскамоўныя рок-гурты? Калі так, якія?

**32**. Як вы лічыце, ці адчувае беларускамоўная моладзь у Беларусі вялікую ступень салідарнасьці на моўнай глебе або ёсьць пэўныя падгрупы сярод беларускамоўнай моладзі, якія не заўсёды знаходзяць «супольную мову» з прычыны культурных, сацыяльных ці іншых фактараў?

**33**. У якіх моладзевых палітычных і іншых арганізацыях вы бераце ўдзел? (Напрыклад, Згуртаванне беларускіх студэнтаў, «Малады фронт», «Зубр», рыцарскія (вайскова-гістарычныя) клюбы і да т. п.)

**34**. На вашу думку, якія рысы найважнейшыя для таго, каб пэўная супольнасьць людзей лічылася народам? Напішыце прынамсі 5 крытэраў у парадку, дзе 5-ты зьяўляецца для вас найважнейшым:

5.
4.
3.
2.
1.

**35**. Якія народы, на вашу думку, найбліжэйшыя да беларусаў па характары? Чаму вы так лічыце?

**36**. На ваш погляд, да якой культурна-цывілізацыйнай зоны належыць Беларусь? (Эўропа, Усходняя Эўропа, Эўразія ці інш.) Растлумачце, чаму вы так лічыце.

**37**. Ці можна лічыць чалавека, які не гаворыць па-беларуску, сапраўдным беларусам? Чаму вы так лічыце?

## Частка ІІ

Пазначце, калі ласка, вашу ацэнку наступных слоў і словазлучэньняў, пішучы побач з кожным зь іх рымскія лічбы I—IV паводле наступнай шкалы:

**I**. сам(а) так гавару, гэта правільна
**II**. так можна (гэты варыянт дапушчальны), але я так не гавару
**III**. так гавораць, але гэта няправільна
**IV**. так ніхто не гаворыць, гэта зусім не па-беларуску

Калі вы ўжываеце іншы варыянт, які адсутнічае, калі ласка, напішыце яго.

(Калі ласка, не глядзіце ў слоўнікі, граматыкі ці іншыя даведачныя матэрыялы: нас цікавіць, як вы асабіста гаворыце і як вы ставіцеся да варыянтаў, якія вы не ўжываеце.)

### А.

**38**. культурніцкі
культурны
культуральны
культуровы

**39**. сувязь
зьвязак

**40**. маладзёжны
моладзевы
маладзёвы

**41**. кіраўнік
кіроўца
кіровец

**42**. вядоўца перадачы
вядучы перадачы

**43**. заказчык
замоўца
замоўнік

**44**. выступленец
выступоўца
выступаючы
выступовец

**45**. адмысловец
спэцыяліст

**46**. задзіночаны
аб'яднаны

**47**. адносіны
стасункі

**48**. зьберці
сабраць

**49**. умовы
варункі

**50**. напрыканцы
у канцы
пад канец

**51**. сааўтар
суаўтар

**52**. Ён нам адкрыў вочы.
Ён нам адчыніў вочы.

**53**. Ён угнаў аўтамабіль.
Ён сагнаў аўтамабіль.

**54**. панятак
паняцьце

**55**. супрацоўніцтва
супраца

**56**. Яна дырэктар школы.
Яна дырэктарка школы.

**57**. кансэрваваць, дамінаваць
кансэрвіраваць, дамініраваць

**58**. міністар, тэатар
міністр, тэатр

**59**. клуб
клюб
кляб

**60**. Зычым вам посьпехаў.
Жадаем вам посьпехаў.

**61**. грэц (у футбол)
гулец
ігрок
ігрэц

**62**. сусьветная вайна
усясьветная вайна

**63**. выступ
выступленьне

**64**. зьнешні
вонкавы

**65**. далары
долары
даляры

**66**. сябар таварыства
супольнік таварыства
член таварыства
чалец таварыства

**67**. каталог, маналог
каталёг, маналёг

### Б.

**68**. здымак нашага горада
здымак нашага гораду

**69**. навукоўцы з унівэрсытэту
навукоўцы з унівэрсытэта

**70**. у вачох
у вачах

**71**. паўгоду
паўгады
паўгоды

**72**. шмат моваў (хатаў, дарогаў)
шмат моў (хат, дарог)

**73**. шмат магчымасьцей (радасьцей)
шмат магчымасьцяў (радасьцяў)

**74**. сродкі павінны быць перададзены
сродкі павінныя быць перададзеныя

**75**. адныя лічаць яго здраднікам
адны лічаць яго здраднікам

**76**. вашы сябры
вашыя сябры

**77**. Ён найлепшы студэнт у групе.
Ён лепшы студэнт у групе.
Ён найдобры студэнт у групе.
Ён самы лепшы студэнт у групе.

**78**. Гэта самы танны білет.
Гэта найтаньнейшы білет.
Гэта найтанны білет.

**79**. Гэта найвышэйшы будынак у горадзе.
Гэта найвысокі будынак у горадзе.
Гэта самы высокі будынак у горадзе.

**80**. іспыт з гісторыі
іспыт гісторыі
іспыт у гісторыі
іспыт па гісторыі

**81**. камітэт у справах моладзі
камітэт па справах моладзі
камітэт справаў моладзі
камітэт для справаў моладзі

**82**. дырэктар будуемага прадпрыемства
дырэктар прадпрыемства, якое будуецца
дырэктар будаванага прадпрыемства

**83**. ужываная цяпер стратэгія
ужываемая цяпер стратэгія
стратэгія, якая цяпер ужываецца

**84**. Я чую яго гаварыць з народам.
Я чую, як ён гаворыць з народам.
Я чую яго, гаворачы з народам.
Я чую яго, гаворачага з народам.

**85**. Мэтай арганізацыі зьяўляецца асьветніцкая праца па вызначэньні сапраўдных і справядлівых поглядаў на расізм, дыскрымінацыю і генацыд.

Мэтай арганізацыі ёсьць асьветніцкая праца па вызначэньні сапраўдных і справядлівых поглядаў на расізм, дыскрымінацыю і генацыд.

Мэта арганізацыі ёсьць асьветніцкая праца па вызначэньні сапраўдных і справядлівых поглядаў на расізм, дыскрымінацыю і генацыд.

Мэта арганізацыі — асьветніцкая праца па вызначэньні сапраўдных і справядлівых поглядаў на расізм, дыскрымінацыю і генацыд.

**86**. Гэта новы шлях.
Гэта ёсьць новы шлях.
Гэта ёсьць новым шляхам.

**87**. на знак салідарнасьці
у знак салідарнасьці

**88**. Мы сталі больш пасьлядоўнымі.
Мы сталі больш пасьлядоўныя.

**89**. Нас было трох.
Нас было трое.

**90**. Ён стаяў у мікрафона.
Ён стаяў пры мікрафоне.
Ён стаяў ля мікрафона.

**91**. у часы існаваньня СССР
за часоў існаваньня СССР
падчас існаваньня СССР

**92**. іхныя бацькі
іхнія бацькі
іх бацькі

Дзякую за ваш удзел у гэтым дасьледаваньні. Калі вы маеце пытаньні, зьвярніцеся, калі ласка, да дасьледчыка, Курта Вулгайзэра, па наступным адрасе:

**Dr. Curt F. Woolhiser**
Harvard University
Department of Slavic Languages and Literatures
12 Quincy St., Barker Center
Room 327
Cambridge, MA 02138-3879
USA
Электронны адрас:
cwoolhis@fas.harvard.edu

# Гонар і ганьба беларусаў

Чым ганарыцца, чаго саромецца беларусам? На пытаньне «НН» адказваюць дзеячы культуры.

Працяг са старонкі 2.

**Вінцук Вячорка,** лідэр Партыі БНФ:

— Свайго сарамлівага стаўленьня да сваёй уласнай мовы. Тут лепш маўчаць, чым казаць: «А гаворым мы мяшанай мовай — слова беларускае, слова расейскае, слова польскае (украінскае)». Альбо: «Не хачу псаваць сваім кепскім вымаўленьнем (малым слоўнікавым запасам) прыгожае беларускае мовы». Абсалютная бальшыня народаў Эўропы такое фразы папросту не зразумее. Тыя ж, хто зразумеюць, — ірляндцы, фрызы — падумаюць: «І яны трапяць у тую пастку, куды мы ўваліліся».

Мы можам ганарыцца здольнасьцю не паддавацца на правакаваньне міжмоўных і міжканфэсійных канфліктаў. Здольнасьцю асымілёўваць пацыху. Эвалюцыя незалежніцтва за апошнія 20 гадоў (паводле «Балтыёс Тырымай», толькі 7% пагадзіліся б з уваходам Беларусі ў склад РФ) — гэта не ўзьнікненьне новых настрояў, гэта іх асьцярожнае даставаньне з далёкае кішэні. І панаваньне незалежніцкіх настрояў характарызуе бальшыню беларусаў незалежна ад іх этнічнага паходжаньня.

**Адам Глёбус**, пісьменьнік:

— Мы ганарыцца павінны сваёй паэзіяй, сваімі паэтамі — Коласам, Купалам, Багдановічам. І нічога ня трэба саромецца. А калі і трэба, дык сваёй беспадставай крыўдлівасьці на іншых. Пачуцьцё крыўды так разьвіта, што мы на ўсіх крыўдзімся, гэтага трэба пазьбягаць. А саромецца нічога ня трэба. Ня варта шукаць вінаватых у сваёй нздатнасьці нешта зрабіць, шукаць вінавага — і крыўдзіцца, замест таго, каб усё зрабіць самому. Гэта замінае нам.

**Уладзімер Мацкевіч,** філёзаф:

— Прадметам гонару можа быць наша гістарычная традыцыйнасьць і кансэрватыўнасьць. Наша геаграфічнае становішча такое — асяродзьдзе дрыгвы, у якой рэчы захоўваюцца, нібы забальзамаваныя. Яно дазволіла закансэрвавац некаторыя рэчы, якія эўрапейцы страцілі. Гэта і разнастайнасьць, і багацьце балотнай экалёгіі, лясы. Нашыя песьні, звычаі. Аж да сёньняшняга дня дасьледчыкі славянскіх старажытнасьцяў едуць з экспэдыцыямі на Палесьсе. І знаходзяць там бабулек, якія ведаюць прымаўкі, байкі, сьпевы тых часоў, пра якія астатнія народы нават ужо і ў кніжках ня пішуць…

Можам ганарыцца сваім «Залатым векам», які вывеў нашу краіну на ўзровень эўрапейскіх краін.

Але ёсьць таксама цалкам ганебныя рэчы: наша нецярпімасьць, неталерантнасьць да іншых думак, поглядаў. Мы — нацыя здраднікаў. Мы здрадзілі веры і рэлігіі тых людзей, якія былі аўтарамі і творцамі «Залатога веку» Беларусі. І гэта пачалося зь дзяцей. Герой таго часу Мікалай Радзівіл (Чорны) і Мікалай Крыштаф (Сіротка), які здрадзіў бацьку. Сяляне здраджвалі сваёй шляхце падчас паўстаньняў, шляхта здраджвала сваёй краіне, кідаючыся туды-сюды. Войны, якія былі нацыянальнымі войнамі для суседзяў, для нас сталі грамадзянскімі. У нашы часы, калі частка насельніцтва за кілбасу гатовая здрадзіць сувэрэнітэту, незалежнасьці… Адмовіцца ад сапраўдных каштоўнасьцяў дзеля нейкіх палёгак у набыцьці паліва з Расеі? Калі мы гэтага не ўсьвядомім, калі мы проста не пакрыемся ўсе сорамам за гэта, мы нічога не зразумеем пра саміх сябе.

**Андрэй Мельнікаў,** бард:

— Беларусы саромецца павінны баязьлівасьці. Боязі новага.

**Алесь Пушкін**, мастак:

— Самае галоўнае, чым ганарыцца, што пасьля найскладанейшай гісторыі, пасьля ўсіх войнаў мы маем беларускую дзяржаву. Іншае пытаньне, ідэальная яна для нас ці не. А саромецца будзем заўсёды аднаго — і эліта наша, і народ, і князі, і военачальнікі, і палітычныя дзеячы, як сучасьнасьці, так і мінуўшчыны, мелі адну загану — непасьлядоўнасьць. Не да канца ганарыліся сваім, стаялі на сваім і верылі ў сваё. Не да канца Міндоўг быў пасьлядоўны. Не да канца Радзівілы верылі ў сябе і ў сваё, калі спалянізаваліся, мову чужую прынялі. Не да канца Машэраў быў беларусам, быў усё ж савецкім, крамлёўскім лёкаем, калі зьнішчаў беларускія школы і будаваў сьвінакомплексы. Не да канца Лукашэнка сам верыць у сябе, калі дагэтуль выношвае нейкія пляны па саюзнай дзяржаве. Але самае галоўнае, што Божым цудам мы яшчэ ёсьць, бо маглі даўно б паўтарыць лёс Прусіі.

**Валянцін Акудовіч,** філёзаф:

— Ніводны народ ні за што не павінен саромецца. Нават немцы, якіх змусілі саромецца. Нібы іншыя народы не нарабілі ня меншых злачынстваў. Гэта тое самае, як дрэва вінаваціць у тым, што яно не дае расьці падлеску ці нейкаму кусьцiку. Народ існуе, як ёсьць зямля, паветра, неба... А ўзвальваць на народ палітычную адказнасьць за нешта… Напрыклад, на беларускі народ за тое, што ёсьць Лукашэнка, — бздура. І таму хочацца немцам вінаваціць сябе — хай вінавацяць. А нам трэба ганарыцца тым, што мы ёсьць. Гэта ўжо нямала — быць. Гэта больш за ўсё — быць. Дрэва не павінна саромецца, што яно крывое. Народ — гэта анталягічная падзея.

**Генадзь Сагановіч,** гісторык:

— На маю думку, беларусы і могуць ганарыцца толькі тым, што мелі калісь. Той культурай, дзяржавай, людзьмі, якіх мелі ў мінулым, у эпоху Вялікага Княства. Асабліва той свабодай і кожным чынам у абарону той свабоды. І кожным чынам супраціву чужому панаваньню. А такіх чыноў было даволі. І яшчэ болей маем у гісторыі таго, чаго мусім саромецца. Асабліва ў найноўшай гісторыі. Але найбольшай ганьбай беларусаў, думаю, застанецца травеньскі рэфэрэндум 1995 году. Бо ў гісторыі не было яшчэ ніколі, каб народ адракаўся сваёй гістарычнай сымболікі і мовы.

**Віталь Тарас**, публіцыст:

— Народ ня мусіць ганарыцца тым, што ён ёсьць. Гэта як чалавек ня мусіць выхваляцца тым, што ён жыве. А калі пачне публічна ганарыцца тым, што вось, я — чалавек, я жыву, яго трэба ў псыхушку пасадзіць. Чаго не павінны саромецца? На сумленьні беларускага народу няма Асьвенцыму, але ёсьць Курапаты. Але хіба сярод НКУСаўцаў беларусаў не было?

Заўсёды, у кожны момант ёсьць частка нацыі, якая можа ганарыцца сабой. І ёсьць частка, якая ня можа сабой ганарыцца, якой усе грэбуюць. Гэта проста непадзельныя паняткі — мараль чалавека і мараль усёй нацыі. Таму я лічу, што павінна быць такая сытуацыя, калі беларус будзе адчуваць гонар за тое, што ён беларус. А чым ён будзе ганарыцца ў сваёй гісторыі, чаго саромецца — гэта пытаньні, якія больш пасуюць школьніку-пачаткоўцу, але ніяк не дарослым людзям.

**Запісаў Зьміцер Бартосік**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Не стыдацца Ласунку

Скажы мне, чым ты ганарышся і чаго саромеешся, і я скажу, хто ты. На хвалі нацыянальнага адраджэньня было запушчана многа міфаў пра нашу нацыю. Напрыклад, што беларусы — самая талерантная нацыя Эўропы, адзіная краіна, дзе ніколі не было пагромаў. Ці што беларусы ніколі ні на кога першымі не нападалі і ні з чыих земляў не выводзілі нявольнікаў. Карацей, не такая нацыя, як астатнія, а лепшая. Гэтая звышлагоднасьць калі не апраўдвала, дык тлумачыла «трагічны лёс Бацькаўшчыны». Апошнія гады прыходзіць разуменьне, што мы такія ж, як усе. У сэнсе лёсу. І адказнасьць за тое, колькі пакояў у нашых хатах, ці за стан мовы — толькі на нас саміх.

Я бачыў аналягічнае апытаньне ў адной грузінскай газэце гады тры таму. Чым ганарацца грузіны і як? Грузіны ганарацца даволі аднагалосна. Сваім нацыянальным шматгалосым сьпевам. Вінамі і лазою, што іх дорыць. Грузінскім альфабэтам. Руставэлі, аўтарам «Віцязя ў тыгровай скуры». Колішнімі перамогамі тбіліскага «Дынама». (Ці ўспомнім мы нашых алімпійцаў за 10 гадоў?) Футбольным камэнтатарам Катэ Махарадзэ, што кагадзе памёр. Царыцай Тамарай, Давыдам Будаўнікам, Багратыёнам і... Сталіным. Дойлідам Арсукідзэ і збудаваным ім саборам Сьвэціцхавэлі. Грузінскім кіно, нарэшце. Вечнымі і летуценнымі, але пераважна канкрэтнымі рэчамі. А яшчэ грузіны амаль нічога не саромеюцца!

Ён прыйдзе, той час, калі беларус будзе спакойна і самазадаволена ганарыцца беларускай паэзіяй і самым смачным сортам бульбы на сьвеце. Такі ёсьць, дарэчы, і ён называецца «Ласунак».

А што як пачаць год з пастаноўкі перад сабой задачы: за гэтыя наступныя 365 дзён, за адну семдзесят пятую адведзенага мне зямнога шляху, я ня проста зараблю шэсьць тысяч даляраў, зьем 365 абедаў, прагледжу 730 фільмаў, а зьдзейсьню нешта такое, чым мая нацыя зможа ганарыцца ў вяках. Цікава, што?

**Мікола Бугай**

# Цэнзура
## на навуковыя дасьледаваньні

ВАК адмовіўся надаць званьне доктара гістарычных навук **Яўгену Анішчанку**. Вучонаму закідаюць «палітызацыю» праблемы далучэньня Беларусі да Расейскай імпэрыі. Выказаныя вучоным палажэньні «ня раяць паведамляць вучням і настаўнікам».



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

«НН» прадказвала адмову ВАК у артыкуле «Паліткарэктура» (№40 за 29 кастрычніка 2004 г.) Адмова прыйшла, не зважаючы на выдатную абарону дысэртацыі «Палітычная гісторыя Беларусі ў часы падзелаў Рэчы Паспалітай» (11 галасоў «за» з 12) і наяўнасьць дзевяці прац манаграфічнага пляну пры неабходнай адной. Яўген Анішчанка адказвае на пытаньні карэспандэнта «НН».

**«НН»: Якія навуковыя довады выстаўленыя супраць Вашай дысэртацыі?**

**ЯА:** У ананімнай «чорнай» рэцэнзіі, прадугледжанай рэглямэнтам, мне закідаюць, што я палітызую праблему падзелаў і далучэньня Беларусі да Расейскай імпэрыі. У рэцэнзіі таксама «ня раяць» выказаныя мной палажэньні паведамляць вучням і настаўнікам. Але ж ужо колькі гадоў прайшло з часу выхаду кніжак! Яны ўжо спрададзеныя, іх цытуюць у навучальных дапаможніках.

Мяне абвінавацілі, што я перабольшыў адмоўную ролю Расеі ў падзелах Рэчы Паспалітай. Доказам гэтага ставяць тое, што амаль усе мае працы грунтуюцца на расейскіх архівах — няма польскіх, літоўскіх і інш. Дык працы пабудаваныя на маскоўскіх архівах, бо Расея вызначала лёс беларускіх земляў Рэчы Паспалітай. Нашы землі адыходзілі не да Аўстрыі. І ў маёй дысэртацыі ясна сказана, што расейская дыпляматыя часоў Кацярыны II нясе галоўную адказнасьць за падзел Рэчы Паспалітай.

Людзі, якія прымалі гэтае рашэньне, ведаюць, што і Маркс, і Ленін называлі ўдзельнікаў падзелу «разбойнікамі». Яны сёньня плююць на тых, каму пакланяліся ўчора. Нават расейскія гісторыкі сёньня кажуць, што вінаватыя ў падзелах былі ўсе — і Расея, і Прусія, і Аўстрыя.

**«НН»: Якая ж афіцыйная фармулёўка адмовы ВАК?**

**ЯА:** Напісана, што мая праца зьмяшчае бяздоказныя, неабгрунтаваныя высновы. Гэта фармальная адпіска.

**«НН»: Можаце назваць кагосьці, хто асабіста даклаў руку да такога рашэньня?**

**ЯА:** Магчыма, гэта Мікалай Сташкевіч. Некалькі гадоў таму ён быў прызначаны в.а. дырэктара нашага Інстытуту гісторыі. У нас усе выбіраліся: ад загадчыка аддзелу да дырэктара, і раптам — вэртыкаль! Я ў вочы яму сказаў, што ня буду мірыцца, калі пачнецца насаджэньне палкавай дысцыпліны.

Калі Сташкевіч даведаўся, што я зьбіраюся абараняць дысэртацыю, ён мяне выклікаў, пастукаў пальцам па вокладцы маёй манаграфіі «Інкарпарацыя», дзе выява зь бел-чырвона-белай стужкай у ланцугах, і сказаў: «Ты за гэта паплацішся!» Потым мне растлумачылі: Сташкевіч ня проста дырэктар інстытуту, а чалец прэзыдыюму ВАК. Ён даў мне зразумець: дзе б я ні абараніўся (хоць на Марсе!), усё адно праца прыйдзе ў ВАК. Калі на пасяджэньні аддзелу ў Інстытуце гісторыі маю працу рэкамэндавалі да абароны, Сташкевіч памяняў рэцэнзэнтаў. Прызначыў доктара навук Вячаслава Панюціча, які дасьледуе эканамічныя пытаньні XIX — пачатку XX ст., і Пятра Петрыкава, якога ўсе ведаюць. Апроч таго, дырэктар патрабаваў, каб я зьмяніў назву — «Палітычная гісторыя Беларусі ў часы падзелаў Рэчы Паспалітай».

**«НН»: Але вы ўсё ж абаранілі дысэртацыю…**

**ЯА:** У траўні ў БДПУ імя М.Танка. Атэстацыйныя матэрыялы з ВАК неўзабаве вярнуліся ў Інстытут гісторыі, каб мяне «падлавіць». У мяне ёсьць праца «Інкарпарацыя», выдадзеная з пазнакай, што яна рэкамэндаваная да друку паводле пастановы Вучонай рады Інстытуту гісторыі. Зьвярнуліся з ВАК, а кіраўніцтва інстытуту адказала, што манаграфія «Інкарпарацыя» не была рэкамэндаваная. Але ж яна была рэкамэндаваная, толькі пад іншай назвай. У пратаколе яна называецца «Беларусь у часы падзелаў Рэчы Паспалітай». Я зьмяніў назву пры выданьні. І гэта выдаюць за злачынства!

**«НН»: Што мяркуеце рабіць далей?**

**ЯА:** Для мяне важна, што завяршыўся нейкі пэрыяд: я абараніў дысэртацыю. А што не далі «пагонаў», — ня так і важна. ВАК напляваў на тое, што за дысэртацыяй стаіць столькі навуковых прац, і на тых дактароў навук, якія абмяркоўвалі яе на абароне. Я нават апэляваць не зьбіраюся, бо гэта бессэнсоўна. Лепш выдам асобнай кнігай сам тэкст дысэртацыі, гэтую ананімную рэцэнзію і свой адказ на яе.

**Гутарыў Аркадзь Шанскі**

Як нам стала вядома, калегі Я.Анішчанкі па Інстытуце гісторыі маюць апратэставаць рашэньне ВАК.

## ХРОНІКА

«Зубровец» **Мікіта Сасім** затрыманы ўначы 8 студзеня ў цэнтры сталіцы і дастаўлены ў пастарунак Ленінскага РУУС. Гэта было ўжо чацьвертае затрыманьне маладога чалавека за нанясеньне графіці. 9 студзеня яго зьвінавацілі ў напісаньні лёзунгу «Свабоду Марынічу!» на будынках па праспэкце Скарыны й завялі крымінальную справу паводле арт.218 ч.1 КК (наўмыснае зьнішчэньне ці пашкоджаньне маёмасьці). Артыкул прадугледжвае штраф, або выпраўленчыя работы на тэрмін да трох месяцаў, або абмежаваньне свабоды на тэрмін да двух гадоў, або пазбаўленьне волі на той самы тэрмін. Яго пратрымалі 3 дні ў ізалятары часовага ўтрыманьня, а пасьля выпусьцілі пад падпіску пра нявыезд.

Недзяржаўнай **«Местной газете»** ваўкавыскія ўлады не даюць юрыдычнага адрасу: пры канцы сьнежня скончыўся тэрмін, цягам якога гарадзкія ўлады мусілі даць адказ на запыт рэдактара выданьня **Андрэя Шантаровіча**. У лістападзе рэдактар ужо атрымаў адну адмову.

Актывісты незарэгістраванай арганізацыі «Зубр» **Максім Дварэцкі**, **Дзяніс Крываносаў**, **Яўген Сувораў** затрыманыя 5 студзеня ў Горках, у Сельскагаспадарчай акадэміі. Яны раздавалі нумар газэты «Выбар», прысьвечаны вынікам парлямэнцкіх выбараў і рэфэрэндуму. У ім сцьвярджалася, што сапраўдныя вынікі галасаваньня зусім розьняцца ад афіцыйна абвешчаных.

Бабруйскую актывістку АГП, псыхоляга цэнтра сацыяльнага абслугоўваньня **Ірыну Качан** 6 студзеня звольнілі з працы, не працягнуўшы зь ёй кантракт без тлумачэньня прычынаў.

9 студзеня падчас распаўсюду ўлётак у падтрымку Міхаіла Марыніча ў Менску быў затрыманы «зубровец» **Павал Бялецкі**: на яго склалі пратакол паводле арт.143 КаАП (антысанітарыя) і празь дзьве гадзіны адпусьцілі.

10 студзеня **гарадзенская філія БНФ** атрымала загад да 17 студзеня вызваліць памяшканьне: УЖРЭП Ленінскага раёну Горадні скасоўвае дамову пра арэнду на падставе рамонту будынку. Філія БНФ застанецца безь юрыдычнага адрасу.

Кіраўнічка Менскай абласной філіі АГП **Марына Багдановіч** 11 студзеня атрымала папярэджаньне ад пракуратуры Ленінскага раёну Горадні. Гэтаму папярэднічалі выклікі ў пракуратуры Горадні й Менску: актывістцы АГП закідалі паклёп на кіраўніка дзяржавы (арт.367 ч.1 КК). Падчас сваёй выбарчай кампаніі М.Багдановіч паставіла ў віну кіраўніцтву краіны, што яно вядзе продаж зброі непразрыста.

**АШ**

# Гарадзенскі БНФ **высяляюць на двор**

Гарадзенскім — раённай, гарадзкой і абласной — арганізацыям БНФ «Адраджэньне» прапанавана да 17 студзеня вызваліць будынак у цэнтры гораду. У памяшканьнях па вул. К.Маркса, 11, дзе таксама маюць офісы ПКБ ды суполка «Паходня», яны працавалі цягам васьмі гадоў.

Упраўленьне жыльлёвага рамонтна-эксплюатацыйнага прадпрыемства Ленінскага раёну гораду прапанавала разарваць арэндную дамову, матывуючы гэта аварыйна-небясьпечным станам будынка, які вымагае тэрміновага правядзеньня рамонтных работ.

На думку сябраў БНФ, разрыў дамовы, які аўтаматычна пазбаўляе суполкі юрыдычнага адрасу, можа прывесьці да страты магчымасьцяў легальнай дзейнасьці ў абласным цэнтры.

Старшыня гарадзкой рады БНФ «Адраджэньне» Мікола Воран перакананы: «высяляючы Фронт, гарадзенскія ўлады імкнуцца паралізаваць дзейнасьць арганізацыі». Супрацоўнік гарвыканкаму Сьвятаслаў Карпінскі, які курыруе пытаньні арэнды, «ня ўпэўнены», што ў абласным цэнтры фронтаўцам выдзеляць іншыя памяшканьні.

**Павал Мажэйка, Горадня**

# Сьняжана разьбівае галаву

Сьняжана не была прыгожай настолькі, каб ніколі не баяцца цнатлівай адзінокай старасьці. Крыху ў целе, але тонкая ў запясьцях, зь мяккімі чульлівымі вуснамі, але зь лёгкай пыхаю ў выразе твару, яна гублялася — гераіняй раману ў якім стылі сябе лічыць? Шырокія, крыху прыўзьнятыя ў наіве бровы выдавалі ў ёй паслухмяную гувэрнантку, але гэтае ўражаньне адразу ўступала ў спрэчку з рэзкім і ў той жа час глыбокім голасам высакароднай, хоць і зьлёгку прыземленай спакусьніцы — і дарэшты цялеснай, і прыўзьнятай па-над зямным.

У васямнаццаць год яна перастала чакаць прынца, у дзевятнаццаць — хуткага замужжа. У дваццаць ёй усё часьцей здавалася, што яна дарма губляе маладосьць, унікаючы мужчынскай ласкі.

Адным днём, апанаваная гарачай стомай ад уласнае неаддаласьці, яна сядзела каля акна і крэсьліла пальцам на шкле шырокія рысы, якія адразу разрывала тоўстай, закругленай з краю паласой.

Увайшла Таня — маладзенькая нянечка зь сярэдняй групы — і прапанавала Сьняжане вечар. Зь ёй і яе сяброўкай учора пазнаёміліся тры хлопцы і на сёньня запрасілі ў госьці. Сьняжана паправіла рукой валасы: «Калі?» «Яны зойдуць а пятай».

У пяць хвілін да пятай Сьняжана закрыла на ключ сваю музычную клясу і спусьцілася да Тані. Там ужо была Марына. Каб не было сюрпрызаў, Марына сказала, што ёй учора спадабаўся Алег. «Так? — падтрымала Таня. — А мне Міша». Марына нахмурылася. «Гэта высокі?» — «Не, высокі — Слава». Так што Сьняжана адразу зразумела, на каго ёй глядзець. Слава выявіўся сапраўды высокім, але трохі кволым, нават безабаронным хлопцам. Пакуль яны ўсе ішлі да Алега на кватэру, ён трымаўся моўчкі, часта лыпаў вачыма на Сьняжану і ўвесь час адставаў.

Пілі віно, шэсьць бутэлек па тысячы трыста, з плаўленымі сыркамі і салам. Сьняжана перастала закусваць: сала было цьвёрдае і сьмярдзючае, а ад сыркоў на зубах наліпла сьлізкае кіслае месіва. Аднак чамусьці ап'янела яна ня моцна.

Сьмяяліся, слухалі музыку, нарэшце Алег гукнуў танчыць і выключыў лямпу. Сьняжану паднялі з канапы вільготныя і няўпэўненыя рукі Славы. Танцуючы, ён штораз нахіляўся, каб запытаць нешта накшталт: «Любіш музыку?» Сьняжана на ўсё ківала, і гэта пакрыўдзіла Славу, калі яна зноў абыякава кіўнула на пытаньне «А ты хто?». Ён дадаў: «Па гараскопе». Сьняжана ўсьміхнулася: «Я Дзева».

Музыка скончылася — проста скончылася, ці то паламаўся магнітафон, ці што, але неяк раптоўна яна перастала — і Сьняжана заўважыла, што яны ўжо ў пакоі ўдваіх. З кухні запішчэла Таня, за Марынай і Алегам ціха рыпнулі дзьверы ў другі пакой.

Слава зьвёў рукі на сьпіне Сьняжаны. Яна заплюшчыла вочы, крыху прыўзьняўшы твар. Цалаваліся нетаропка, навязваючы свае губы адно аднаму, але не сьпяшаючыся прымаць такія ахвяры. Сьняжана амаль пачула, як у Славы спынілася сэрца, калі ён споўз рукой на яе клубы. Яна нарэшце падалася ўперад, ірвучы яго цнатлівае супраціўленьне.

Слава амаль не распрануў яе і амаль не распрануўся сам. У яго былі халодныя ногі. Сьняжана гукала ўнізе, калі ён раптам пачаў штосьці гаварыць ёй на вуха, затым уздрыгнуў і расслабіўся на руках, утыркнуўшыся галавой у яе грудзі. «Што ты?» — яна паспрабавала падняць яго за чуб. «Ідзі ты!» — цяўкнуў ён, нацягваючы джынсы. Потым ужо Сьняжана зразумела незразуметую адразу вільгаць на жываце, а пакуль што яна захлыналася крыўдай і агідай. «Казёл!» — рэзка села, папраўляючыся.

Яе спыніў дотык да сьпіны — зьнізу, там, дзе заўсёды прыемна. Сьняжана ня стала ўставаць, яна, апроч дотыку, адчула ў сабе некалькі цьвёрдых і арыгінальных думак — яна ўсё ж такі п'яная, яна хоча пачакаць, што ён зробіць, яна зьбіраецца зрабіць што-небудзь сама. Нязьдзейсьненыя куточкі чуласьці сабраліся ў ёй у пругкі авантурны камяк, і Сьняжана засьмяялася. Віно, дарэчы, нарэшце ўдарыла, бо потым нейкі час яна ня помніла сябе, толькі згадвала, як змагаецца з ківаньнем галавы.

Слава грэў ёй рукой паясьніцу, хацелася музыкі, жыцьця і свабоды. Яна намацала нагой голы акардэон — той піскнуў ад удару. Акардэон! Сьняжана вырвала яго з-пад ложка, крутанула ў руках і жвава зарыпела клявішамі. «Францыя! Гэта будзе Францыя!» — прамільгнула ў галаве дзесьці паміж шумам і звонам, падзеньнем і ўзьлётам, і музыка палілася ўсьцяж скурчаных пальцаў ціхай кучаравай дымкай на падлозе, тонкімі зіхатлівымі выбрыкамі спадніцы на бледных нагах, лупатай усьмешкай, парыскім шансонам, ускрыкам Тані з кухні, водбліскам маладзіка на сэрванце, дотыкам далоні да паясьніцы, пахам віна зь перадражніваньнем чырвані, стогнам Тані з кухні, шумным выдыхам Мішы з-над Тані і ўдарам далоні аб падлогу. Сьняжана застыла тварам, слухаючы похіст ценяў цераз шкляныя дзьверы, перамагаючы горыч і жарсьць усярэдзіне сябе. Яна рвала акардэон з грудзей, абдымаючы сябе музыкай, і піхала ў сябе музыку, уціскаючы ў грудзі акардэон. Парыж падаў пад гарачыя ногі, Таня перастала стрымлівацца і раўла: «Свабода!» — як раптам, нечакана здалёк, Слава папрасіў Сьняжану заткнуцца.

Сьняжана спакойна закончыла такт і мэлянхалічна азірнулася. Слава ляжаў на сьпіне, зьвёўшы абедзьве рукі за галаву. Халодны, брыдкі твар. Сьняжана спаўзла позіркам уніз за сябе, каб ўпэўніцца, што за паясьніцу яе кранаў край коўдры. Нетаропка зьняла акардэон з пляча, узважыла яго на руцэ і з раптоўнай сілай ударыла ім Славу ў галаву.

Больш не азіраючыся, запомніўшы толькі трэск, яна выйшла з пакою, засунула ногі ў чаравікі і пакінула кватэру. Увесь шлях дамоў яна адчайна дрыжэла рукамі, намагаючыся стрэсьці зь іх сьляды яго абдымкаў. Перад вачамі матлялася акрываўленая галава, зь якой абавязкова мусіў тырчэць край акардэона.

Тым часам на грукат са спачывальні і кухні зьбегліся расшпіленыя хлопцы з паўголымі дзеўкамі. Слава ляжаў нерухома. Маўчаньне доўжылася хвіліну. Нарэшце ён расплюшчыў вочы і крыкнуў: «Дура! Якая яна ў вас дура!» Удар аказаўся такой моцы, што трыльяж разьбіўся ня ўвесь, а толькі ніжняю часткай. У чорным правале, на месцы Слававай галавы, пагрозьліва пабліскваў акардэон.

**Аляксей Бацюкоў**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ



АЛЯКСЕЙ БАЦЮКОЎ
Літаратар. Аўтар «НН» і «Arche».
Жыве ў Магілёве.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

## АЛЕСЬ АРКУШ

* * *

спасылацца на свой узрост
звычка дзяцей і старых

я яшчэ маленькі!

а ты ведаеш колькі мне гадоў?!

пасьміхнешся — працягнеш цукерку
або падбадзёрваючы пахлопаеш
па плячы
маўляў які гэта ўрост — для жыцьця

а для сьмерці?

для сьмерці
усе ўзросты аднолькавы

* * *

нечакана разышліся хмары
і вызірнула сонца

нават разгубіўся

так даўно чакаў і жадаў
гэткага дню
што й ня ведаю
з чаго пачаць

* * *

дождж
які зьлізаў увесь сьнег
разбудзіў раку

і качкі вярнуліся

і човен мільгнуў

і трава на ўзьбярэжжы
нібы зазелянела

* * *

вяргіні ўвосень выкапалі
як бульбу

у склепе клубні
ляжаць побач

бульбяных
тыдзень за тыднем
менее

а вяргіневыя
некранутыя
цярпліва чакаюць вясны

калі іх вызваляць са склепу
і аддадуць зямлі

* * *

уздымаюся на ўзгорак
на якім стаіць Сафія

навокал усё па-ранейшаму
толькі вакол бажніцы пабалела пнёў
толькі Дзьвіна іншага — сьвінцовага
— колеру
толькі ў небе над саборнымі
крыжамі
ня бачна ластавак

з кішэні незаўважна
выцярушваю насеньне

недзе з гэтай мясьціны
узыходзіла крутабокая поўня
калі мы вярталіся зь Вільні

гэта было добра бачна
з вакна цягніка
калі ён грукацеў
усімі сваімі сталёвымі падэшвамі
па дзьвінскім мосьце

*Полацак*

# Сьцежкі праз Strangeland

## ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ

Рублеўская Людміла. Золата забытых магілаў. Паралельны раман — Дзеяслоў, 2004. №9, 10.

Сокалаў-Воюш Сяржук. Крывавы памол. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004. — 269 с. Наклад 700 ас.

«Прыемна бывае зімнім ці восеньскім вечарам узяць у рукі цікавую кніжку», — з такой салодкай думкай браўся я за чытаньне рэцэнзаваных твораў. Абодва абяцалі займальную гісторыю. Абодва грунтаваліся на калярытнай беларускай мінуўшчыне. Абодва аўтары вядомыя беларускаму чытачу. Нарэшце, абодва тэксты маюць цалкам паважны памер, а значыць… Глядзі першы радок.

Прачытаўшы дзявяты нумар «Дзеяслова», я адчуў, што неабходна адшукаць наступны: не адпускала думка, чым жа скончыцца таямнічая і закручаная гісторыя. «Золата забытых магілаў» чытаеш не таму, што ўбачыў вядомае імя, і не таму, што пачаў чытаць і сорам кінуць, а таму, што *хочацца прачытаць усё*. Не зазірнуць у канец, каб даведацца пра разьвязку, а прачытаць у вызначаным парадку ўсе эпізоды, агледзець, так бы мовіць, спэктакль у вызначаным парадку.

Бо тое, што перад намі знарок выштукаваная, старанна зрэжысаваная пастаноўка, адчуваецца адразу. Аўтарка нібыта трымаецца рэалістычнай манеры, але ня робіць з дакладнай перадачы жыцьцёвых рэалій што нашага часу, што сярэдзіны XIX ст. фэтышу. Яе мэта — пабудаваць верагодную візію, віртуальна-альтэрнатыўную рэчаіснасьць, у якой будзе разгортвацца дзеяньне і куды яна зьмесьціць, сярод іншага, сваё разуменьне маральна-этычных дылем беларускага інтэлігента.

Візуальны шэраг твору зроблены ў эскізнай манеры. Сьвет рэчаў падпарадкоўваецца законам драматургіі — стрэльба павінна або стрэліць, або застацца за кулісамі. Гэткая ашчаднасьць кампэнсуецца выразнымі партрэтамі герояў. Што праўда, апісаньні таксама не заўсёды ідуць глыбей за вызначаныя патрэбамі дзеяньня вобразы, але галоўныя героі — нашы сучасьнікі — намаляваныя жыва і зь вялікай сымпатыяй.

Адзінае, што можна тут закінуць аўтарцы, — штампы з арсэналу жаночае прозы, што падмяняюць сродкі сапраўднага псыхалягізму і ў значнай ступені пазбаўляюць галоўную гераіню рысаў жывога чалавека. Героі зь ліку шляхты XIX ст., вытрыманыя ў строга рамантычнай канвэнцыі, яшчэ мацней падкрэсьліваюць гэта. Зрэшты, тыповая для пісьменьніцы хіба муляе менш, чым у іншых творах.

Найбольшае, на маю думку, дасягненьне спадарыні Рублеўскай — амаль бездакорнае адчуваньне тэмпу. Гэта ратуе ад манатоннасьці, загладжвае заганы сюжэту, зьмякчае, нарэшце, адмоўны ўплыў не заўсёды ўдала абраных сродкаў. Своечасовае пераключэньне дзеяньня, якое плыве ў двух рэчышчах — сучасным і сярэдзіны пазамінулага стагодзьдзя, — не дазваляе чытачу стаміцца і пачаць задаваць пытаньні адносна верагоднасьці й апраўданасьці такіх аўтарскіх канцэпцый, як наяўнасьць у часы вядомага паўстаньня таемнай сялянскай арганізацыі накшталт японскіх ніндзя або князя (варта камусьці, акрамя Арлова, пачаць пісаць пра дакастрычніцкі пэрыяд, як адразу патрабуецца князь) з арыстакратычным прозьвішчам *Людвісар*, перашкаджае пасьмейвацца з поўных прыдуркаватай інтэлігенцкай прэтэнцыёзнасьці вобразаў менскай багемы.

Дзеяньне, рухавіком якога зьяўляецца спрытна сканструяваная *таямніца*, раздрабняе і разбаўляе гэтыя тыповыя для беларускай прозы дзівосы, дазваляючы адчуць пад скопішчам недакладнасьцяў, фантазій і неверагодных дэталяў тую сярмяжную праўду, якую колісь трапна выказаў Вацлаў Ластоўскі ў размове зь Яўхімам Кіпелем: «Маем найбагацейшую гісторыю!» Маем, іншымі словамі, пра што пісаць.




АНДРЭЙ ЧЫК

**Новы раман Людмілы Рублеўскай можна бясконца папіхаць, але можна і з асалодаю прачытаць зімовым вечарам.**

Адно што ня ведаем таго, што маем. Славутае паўстаньне, а вось колькі спрабуюць пра яго напісаць — няма паўстаньня. Ёсьць пачатак і канец (заўсёды сумны, натуральна). Гвалтоўнага збройнага чыну з мэтаю зьмяніць палітычны статус земляў былое Рэчы Паспалітае абедзьвюх нацый няма. У «Золаце забытых магілаў» напружанасьць дзеяньня ствараецца лініяй сучаснаю — пошукамі таямніцы паўстанцкага камандзіра, разгадкаю, у найлепшых традыцыях сучаснага пісьменства, пакінутага ім нашчадкам рэбусу (як не згадаць тут «Імя ружы»?). Уласна паўстанцкая лінія стварае антураж і калярыт, імпартуючы ў да болю вядомую рэальнасьць сёньняшняга дня беларускую экзотыку і… акультныя матывы. (Вось што ці варта завозіць у наша стагодзьдзе з нашмат больш строгага ў пытаньнях веры дзевятнаццатага!)

Усё гэта ў чарговы раз сьведчыць пра недастатковую распрацаванасьць гістарычнае тэматыкі. Пісьменьнікі ня могуць ствараць зь нічога. Ім патрэбны матэрыялы, якія, натуральна ж, існуюць, але пераважна папольску і амаль не разгледжаны нашымі навукоўцамі зь беларускага гледзішча. Можна толькі дзівіцца з майстэрства, зь якім спадарыня Рублеўская стварае ў чытача ўражаньне, што піша пра падзеі паўстаньня. Можна парадавацца, што такімі сьціплымі сродкамі яна здолела, не ўпадаючы ў дыдактычнасьць, выкласьці сваё перакананьне ў наяўнасьці нашага абавязку перад патрыятычнымі продкамі, дадаўшы да тэксту высакародны мэсыдж.

Падсумоўваючы, скажам: перад намі займальны і старанна пабудаваны твор. Аўтарка рызыкнула ступіць на нераспрацаваныя беларускімі майстрамі слова абшары, здолела прыкласьці сваю адмысловую сьцежку і стварыць тэкст, збольшага вытрымаўшы каноны новага для сябе (дый для беларускай літаратуры ўвогуле) жанру. Вытрываўшы спакусы заглыбіцца ў нетры нетрадыцыйных духоўных пошукаў, прайшоўшы па самым краі твані штучнага ажаночваньня пісьменьніцкае манеры, прасьлізнуўшы амаль бяз шванку паміж Сцылаю пазадучарашняга рамантызму і Харыбдаю сучаснага «крутога» пісьма, Людміла Рублеўская стварыла тэкст, які можна бясконца папіхаць (або, што тое самае, бясконца дасканаліць), але можна і з задавальненнем прачытаць зімовым вечарам.

Легенда кажа, як ангельскі прафэсар, прачытаўшы першыя творы Кіплінга, выгукнуў: «Літаратура! Нарэшце літаратура!» — і нават пусьціўся перад студэнтамі ў скокі. Здаецца, менавіта гэтак (хаця мо не настолькі пафасна) варта ўспрымаць раман спадарыні Рублеўскай. Гэта ня чыстае мастацтва, не мастацкі экспэрымэнт. Не фармальныя пошукі, не чытаньне з грыфам «толькі для гурманаў». Гэта мастацкая літаратура. Яе можна чытаць усім.

* * *

Сяржук Сокалаў-Воюш сягнуў у табуяваныя для беларускіх пісьменьнікаў абшары значна глыбей, стварыўшы аповесьць пра вампіраў. Аўдыторыю гэтага твору вызначыць цяжэй, чым у выпадку спадарыні Рублеўскай, але гэта напэўна не *аматары гісторый пра вампіраў*. Я рэкамэндаваў бы гэтую кніжку, па-першае, нашым постмадэрністам, бо сумесь адчайных слоўных выбрыкаў і містыфікатарскіх прыдумак ды парадыйных ходаў для іх будзе сапраўдным сьвятам. Па-другое, раіў бы штудыяваць «Крывавы памол» кожнаму, хто лічыць, што напісаць твор у жанры масьліту лёгка, абы толькі захацець. Бо аўтарскае жаданьне сумневу не выклікае. Я ж хачу засяродзіцца на пазытыве. Кніга шмат чаму можа навучыць.

Калі мове «Золата забытых магілаў» не стае індывідуальнае характарызацыі і стылізацыі пад даўніну, лексыка «Крывавага памолу» можа разглядацца як асобны пласт зьместу. Аўтар бясстрашна насычае тэкст наватворамі, замаскаванымі пад спрадвечна беларускія выразы, перайначвае вядомыя словы («лужыліся са скуры» замест «вылузваліся»), экспэрымэнтуе з правапісам. Выходзіць цікава, але слаба вяжацца з рэштаю, то бок зь дзеяньнем і сюжэтам.

Пішы хоць пра вампіраў, хоць пра каго хочаш, а мэсыдж, хай сабе найпрасьцейшы, павінен быць.

З рэшты невыпадкова выпала візія. Сьвет, у якім разгортваюцца падзеі, у аўтара ня ўдаўся. Ёсьць шмат маляўнічых дэталяў, вельмі маляўнічых (згадаць тут варта перш за ўсё кулінарныя апісаньні), але цэласны запамінальны вобраз «Беларусі па-воюшаўску» не вымалёўваецца, бо пісьменьнік аддаў гэтаму замала ўвагі. Памылкова, бо для твораў такога жанру крытычна важнае цікавае апісаньне (калі дарэчы тут гэткае азначэньне) рэчаіснасьці, натуральнасьць і пэўная ўтульнасьць атмасфэры, у якой адбываюцца жудасныя, але, будзем шчырымі, збольшага загадзя вядомыя чытачу калізіі.

Калізіі тыя можна ацаніць на здавальняюча. Вынаходлівасьцю спадар Воюш не зьдзіўляе, але ўсё, што «палажана», прысутнічае. Істотную блытаніну ў адчуваньні чытача ўносіць палітычны аспэкт — у якасьці вампіраў выступае сям'я Дзяржынскіх улучна з малым Фэліксам Эдмундавічам. І хаця аўтар вычарпальна абыгрывае гэты паварот сваёй фантазіі, тэкст апынаецца паміж двух крэслаў. Гэта не палітычны памфлет, бо тады навошта ўся рэшта маскараду, якая старанна ўгрунтоўвае вампірызм у жыцьцё нашага краю ўвогуле і лучыць са шляхецтвам у прыватнасьці. Але гэта ўжо й не звычайная аповесьць пра вампіраў, бо ў нашай грамадзкай сытуацыі травэстацыя фігуры Жалезнага Фэлікса лёгка зацьміць іншыя аўтарскія вынаходкі, патэнцыял якіх і так, як ужо зазначалася, небагаты.

Эклектычныя кавалкі «Крывавага памолу» пралятаюць перад чытачом нібы каляровыя аскепкі ў калейдаскопе, які трымае дрыготкая рука расхваляванага пачаткоўца: прыгожы ўзорысты малюнак не складаецца.

Нельга пазбавіцца адчуваньня, што пісьменьнік пасьпяшаўся, прычым тройчы. Пасьпяшаўся і ня вызначыўся, што, уласна кажучы, піша — аповесьць пра вампіраў ці пародыю на яе. Адпаведна, ня змог вытрымаць хісткага балянсу элемэнтаў, бо сам ня вызначыў прапорцый. Недаабрабіў матэрыял, якога, трэба прызнаць, нарыхтаваў багата. Аповесьць ня вершык, хібы якога можна выправіць гучным акордам і эмацыйным выкананьнем ці, у найгоршым выпадку, наступным вершыкам. Успрыманьне прозы адбываецца ў іншым маштабе часу хаця б таму, што прачытаньне патрабуе не хвілін, а гадзін. І напісаньне патрабуе большае ўвагі да цэлага, нават калі дзеля гэтага нешта з выпешчанага давядзецца адкласьці ўбок. Гаварыў Казьма Прутков: нікому не абняць неабдымнага.

Пасьпяшаўся з выкарыстаньнем некаторых моўных наваций. Шмат чаго з ужытага было б дарэчы, калі б дзеяньне адбывалася ў часы беларусізацыі ці перабудовы, але гістарызм воюшаўскае мовы не вытрымлівае выпрабаваньня больш раньнім часам. Яго закваска — мова Ластоўскага, Станкевіча (ці не ад іх паходзіць і слоўнік своеасаблівых назваў у канцы твору — яшчэ адна модная сёньня пісьменьніцкая «фішка») ды эміграцкае літаратуры, то бок прадукт XX ст.

Пасьпяшаўся, нарэшце, выказацца, не падумаўшы, што ж хоча чытачу сказаць. Бо пішы хоць пра вампіраў, хоць пра каго хочаш, а мэсыдж, хай сабе найпрасьцейшы, павінен быць. У «Крывавым памоле» на гэтую ролю могуць прэтэндаваць толькі дэманстратыўна ксэнафобскія антысавецкаантырасейска-антыпольскія матывы, але нават у аповесьці пра вампіраў хацелася б бачыць шляхетнейшыя ідэі.

Толькі вось у апраўданьне спадара Воюша мусова зазначыць наступнае: ён анітрохі не вінаваты. Проста ў яго шмат адвагі і нашмат менш цярплівасьці, каб чакаць, пакуль нехта іншы возьмецца за такі прыгожы, удзячны, хаця й няпросты у абыходжаньні матэрыял, як разнастайная ў сваіх праявах кніжная беларуская мова (назавём гэта апазіцыяй Крапіва—Станкевіч), поўная цудоўных сюжэтаў мінуўшчына (да сёньня, так бы мовіць, маярат Караткевіча) і выключная занядбанасьць некаторых жанраў і напрамкаў. Так што пры канцы гэтага разбору, які я хачу лічыць папярэджаньнем для чытачоў, а не папрокам аўтару, я адчуваю сябе абавязаным выказаць спадару Воюшу падзяку. За сьмеласьць.



УЛАДЗІМЕР ШЛАПАК

**Сокалаў-Воюш напісаў твор пра вампіраў, але разьлічаны зусім не на аматараў гісторыяў пра вампіраў.**

# Шукайла і ягоная камуна

У паэта і першага сакратара райкаму партыі Шукайлы ў кабінэце заўсёды віселі два партрэты — Маркса і самога Шукайлы. Пра пісьменьніка-камуніста, які нарадзіўся 100 гадоў таму, піша дасьледчык камуністычных злачынстваў **Леанід Маракоў.**

У 2004 годзе споўнілася 100 гадоў беларускаму пісьменьніку і грамадзкаму дзеячу Паўлюку Шукайлу. Ён нарадзіўся на Ваўкавышчыне, браў актыўны ўдзел у заходнебеларускім рэвалюцыйным руху, быў сябрам КПЗБ. Потым, ратуючыся ад перасьледу дэфэнзівы, у 1925 годзе перайшоў мяжу і такім чынам апынуўся ў Савецкім Саюзе.

Пра той пераход мяжы Сяргею Грахоўскаму расказваў пісьменьнік Віталь Вольскі, які ў пачатку 1920-х гадоў служыў ці то начальнікам, ці то намесьнікам начальніка на заставе пад Койданавам.

«Усіх перабежчыкаў спачатку прыводзілі да мяне. Прывялі неяк і рудога хлопца ў сьвітцы і ў лапцях з торбаю.

— Што там? Паперы нейкія? — пытаю.

— Вершы, — адказвае ўпэўнена хлопец.

— Ты што, паэт? — зьдзіўлена гляджу на лапцюжніка.

— Паэт, — падымае ён вышэй галаву.

— А зваць цябе як? — цікаўлюся.

— Шукайла! — з гонарам гаворыць ён. Ну я і адпусьціў хлопца…»

Крыху агледзеўшыся ў Менску, бесцырымонны крыкун Шукайла — ён граміў усіх, хто не пісаў так званым стылем Маякоўскага (лесьвічкай) — пачаў



**У першым радзе (злева направа): Алесь Гародня, Янка Відук (Я. Скрыган); у другім радзе: Уладзімер Варава, Паўлюк Шукайла, японскі пісьменьнік Удзяко Акіта, Макар Шалай.**

ствараць «літаратурную камуну», куды ўвайшлі Апанас Атава, Пятрусь Броўка, Уладзімер Варава, Алесь Гародня, Рыгор Крушына, Уладзімер Прыбытоўскі, Ян Скрыган, Макар Шалай. Трапіў у камуну нават японец Удзяку Акіта, што быў праездам у беларускай сталіцы.

Згадвае Сяргей Грахоўскі:

«Скрыган (правая рука Шукайлы), расказваў, як яны арганізавалі гэтую групу. У пакоі Шукайлы падсьцялілі кажух, усе ляглі і так абмяркоўвалі сваю дэкларацыю. Потым Шукайла сабраўся і пайшоў у Савет народных камісараў. Прыйшоў туды і кажа: «Мы ствараем новую групу, якая будзе стаяць на абароне сацыялістычнага ладу. Павядзём барацьбу са ўсякім упадніцтвам. Літаратурная камуна! Адна назва чаго варта».

Старшыня СНК Мікалай Галадзед выдзеліў на выданьне часопісу дзьве тысячы рублёў, на якія выдалі два нумары са сваімі партрэтамі. Потым Сяргей Дарожны напісаў на Шукайлу эпіграму (Міхась Лужанін лічыў, што яе аўтар — Алесь Дудар. — **Л.М.**):

Выйду я на сенажаць
Ды з нагану ў жабу бац!..

Шукайла ледзь не дацягнуў Дарожнага за «абразу асобы» да суду. Пасьля Паўлюк пайшоў па партыйнай лініі. Быў першым сакратаром райкаму партыі ў Слуцку, дзе арганізаваў газэту. Пасьля яго перавялі ў Расоны. У Шукайлы ў кабінэце заўсёды віселі два партрэты — Карла Маркса і Паўлюка Шукайлы.

Сяргей Грахоўскі працягвае: «Пасьля Шукайла (а быў ён авантурыстам усё ж вялікай хваткі) пісаў нейкія дысэртацыі, але якая гэта была навука? У выніку распалася ягоная камуна. Потым ён паехаў у Маскву, а пасьля, калі ў Ленінградзе арганізавалі акадэмію мастацтвазнаўства, пераехаў туды, дзе і стаў рэктарам гэтай акадэміі. Запрасіў да сябе працаваць Алеся Звонака, Янку Бобрыка, З.Бандарыну. Пасьля зьнік». Нібы яго, як крымінальніка, судзілі за фінансавыя махінацыі.

У архіўнай справе П.Шукайлы ёсьць і такое сьведчаньне: «Падсьледны Шукайла ніякай віны за сабой не прызнаў, але быў прыгавораны да вышэйшай меры пакараньня. І толькі ў апошнія гады стала вядома, што яго арыштавалі ў Маскве 1 лістапада 1938 году "як бамжа"».

Пра літкамунара П.Шукайлу ўспомнілі праз 55 гадоў пасьля расстрэлу і паспелі дзякуючы С.Грахоўскаму ўнесьці ў даведнік «Беларускія пісьменьнікі».

Вярнуліся старыя часы, і да іншых пісьменьнікаў, што загінулі ад бальшавікоў, у дасьледчыкаў яшчэ ня хутка па-сапраўднаму дойдуць рукі.

«У ленінградзкіх студэнтаў такі эксцэнтрычны выкладчык (да таго ж — прафэсар!) карыстаўся вялікай папулярнасьцю…»: больш пра Паўлюка Шукайлу і яго час можна прачытаць у артыкуле Віктара Жыбуля «Два галоўныя скандалісты 20-х» у «Полацкім нумары «ARCHE».

АДАМ ГЛЁБУС



## Сучасьнікі

### 1994. Герцаў і вагон

Вымяраць мастацтва вагонамі — вынаходка Андрэя Герцава. Ён бярэ 10 тысяч даляраў… Андрэй можа ўзяць і 100 тысяч, ён чалавек заможны, ён можа сабе дазволіць калекцыянаваць сучасны жывапіс, адчыніўшы карцінную галерэю на вуліцы Карэтны Рад, што ў цэнтры Масквы. Але Герцаў бярэ дзясятку, бо ў Грузіі вайна, бо па Тбілісі соваюцца танкі, таму на праспэкце Руставэлі жывапіс нічога не каштуе, ну хіба што 10 даляраў за палатно. Андрэй купляе вагон грузінскага жывапісу. «У мяне ёсьць усе грузінскія мастакі. Калі адзін зь іх стане знакамітым, усе мае страты вернуцца!» Чамусьці ня верыцца ў вялікую вядомасьць і каштоўнасьць грузінскага жывапісу канца мінулага тысячагодзьдзя, але дапамога Герцава мастакам у зруйнаваным вайною Закаўказьзі вартая ўхваленьня. Ну і, нарэшце, ня кожны галерэйшчык здатны вымяраць жывапіс вагонамі.

1994 — 7.07.2004, 22:15

### 2004. Ананім N і мая слава

Штораз пераконваюся: слава заўсёды валачэ за сабою брыду. Часам вядомасьць набывае гідкія формы, але і гэтыя формы ствараюць людзі, яны працуюць, стараюцца, нешта-нейкае думаюць, намаганьні прыкладаюць… Напярэдадні прэзэнтацыі маёй кнігі «Дом» шмат хто атрымлівае ліст з чатырохрадкоўем:

Парторг Адамчык дзёньнік нагаўняў,
Насраў вакол сябе па вушы самыя
І творчыя правы ён перадаў
Сынам гаўняным зь іх гаўнянай мамаю.

Уяўляеш, як нейкі ананім N набірае на кампутары верш, раздрукоўвае, запакоўвае па капэртах, адсылае, не раўнуючы Вядзьмак-Лысагорскі? Як ён зларадна цешыцца са свайго ўчынку? Як чакае водгуку? Ён жа не ўсьведамляе, што дурная слава дадае мне вядомасьці ўдвая больш за прэснастаноўчыя водгукі.

8.07.2004, 12:51

АЛЯКСАНДАР ВОРВУЛЬ



## Слоўнік скептыка

**Кавалерства** — рыса характару, якая не перадаецца ў спадчыну.

**Казачнік** — мужчына, які вяртаецца пад раніцу.

**Казка** — страшная гісторыя, якая рыхтуе дзяцей да чытаньня газэт і прагляду тэленавін.

**Казка народная** — гэта там, дзе дурні разумныя.

**Казытаньне** — здабываньне сьмеху ўручную.

**Какецтва** — жаданьне падабацца без патрэбы кахаць.

**Калега** — чалавек, здольны спакойна пераносіць вашы посьпехі.

**Калій цыяністы** — рэчыва, пра смак якога вам паведамяць на тым сьвеце.

**Камасутра** — доказ таго, што нічога новага паміж мужчынам і жанчынай адбыцца ўжо ня можа.

**Кампраміс** — пагадненьне двух бакоў, якое не задавальняе аніводны.

**Кампутар** — рэч, якую любіш болей, чым больш пазнаеш людзей.

**Камуніст** — чалавек, у якога нічога няма, і ён хоча падзяліцца гэтым з усімі.

**Камэдыя** — трагедыя, якая адбылася ня з вамі.

**Канапа** — найлепшае месца для барацьбы зь лянотай.

**Каноплі** — дрэва, якому не даюць вырасьці.

**Кантракт** — дамова, колькасьць пунктаў у якой адваротна прапарцыйная суме зьдзелкі.

**Канфармізм** — спаборніцтва ў неадрознасьці.

**Канфэрэнцыя** — сход, на якім размаўляюць пра рэчы, якія ўжо даўно трэба было зрабіць.

**Капіталізм** — тое, чым людзі займаюцца, калі іх пакідаюць у спакоі.

**Карлсан** — чалавек, які сышоў, гучна ляснуўшы форткай.

**Карова** — істота, якая характво ікебаны можа вызначыць толькі на смак.

**Каханьне сапраўднае** — калі ты пакідаеш Інтэрнэт, каб затэлефанаваць каханай.

**Кілямэтар** — адзінка вымярэньня любові да цешчы.

**Кіно** — мастацтва, здольнае падняць невядомую нізасьць на нечуваную вышыню.

**Кіраваньне** — здольнасьць не замінаць працаваць больш разумным людзям.

**Клоп** — істота, якая дапамагае забыцца на тараканаў.

**Клопат сямейны** — гэта калі праца пачынае прыносіць асалоду.

**Конкурс** — гэта калі пасрэднасьць судзіць пасрэднасьць.

**Крытык літаратурны сапраўдны** — чалавек, які знаходзіць у кнізе тое, пра што яе аўтар і не здагадваўся.

**Крытык тэатральны сапраўдны** — чалавек, які можа растлумачыць драматургу сэнс ягонай п'есы.

**Крытыка** — тлумачэньне аўтару, што ён робіць ня так, як зрабіў б вы, калі б умелі.

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Гардынец Л. Саламяны капялюшык** / Іл. А.Акуліка; Рэд. М.Казлоўскі. — Маладэчна: Бібліятэчка часопісу «Куфэрак Віленшчыны», №9, 2004, — 72 с. 299 ас.

Дэбютны зборнік маладачанскай паэткі.

**Наварыч А. Зьвяры:** Сустрэчы з прыродай. — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 48 с. 3000 ас.

Дзіцячая кніга-даведнік пра жывёл беларускіх лясоў.

**Севярынец П. Пакаленьне «Маладога фронту»: Гісторыя моладзі, народжанай у 1970—1985 гг.** — Менск, 2004. — 112 с.

Аўтар спрабуе асэнсаваць фэномэн беларускае моладзі свайго пакаленьня.

**Старабеларуская літаратура XI—XVIII ст.** / Рэд. Г.Тварановіч. — Беласток: Унівэрсытэты ў Беластоку, 2004.

Гэтае выданьне — хрэстаматыя, у якой зьмешчаны творы Яна Вісьліцкага, Лявонція Карповіча, Язэпа Руцкага, Андрэя Рымшы, Лява Сапегі, Францішка Скарыны, Кірылы Тураўскага, Рыгора Цамблака ды інш.

**Сьвірка Ю. Мурашыны стажок:** Вершы, казкі і загадкі для малодшых дзяцей. — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 63 с., іл. 2000 ас.

Дзіцячыя вершыкі пра хлопчыкаў і дзяўчынак, цудоўную беларускую прыроду, птушак і зьвяроў.

**Тэрмапілы. Літаратурна-мастацкі і беларусазнаўчы часопіс. №8.** — Беласток: Беларускае літаратурнае аб'яднаньне «Белавежа», 2004.

У нумары — аповесьць «Яно» Я.Юхнаўца, «Новая глуханань. Чортава хата. Здарэньне ў старасьці» С.Яновіча, артыкул «Быкаў і Барадулін: творчае літаратурнае пабрацімства» А.Макміліна. Вершы Юр'я Баена, Марылі Базылюк, Зьніча, Зоф'і Манькоўскай, Дзьмітрыя Шатыловіча ды інш.

**Шамак А. Міталёгія старажытнай Беларусі.** — Менск: Сэр-Віт, 2004. — 240 с. 2000 ас.

У манаграфіі ў папулярнай форме выкладзены тэксты, якія адлюстроўваюць язычніцкія міталягічныя ўяўленьні беларускага народу пра будову сьвету, багоў, духаў, жывёл.

**Mironowicz A. Sylwester Czetwertyński, biskup białoruski.** — Białystok: Białoruskie Towarzystwo Historyczne, 2004.

Дасьледаваньне пра нашчадка славутага роду ВКЛ Сьвятаполк-Чацьвярцінскіх, праваслаўнага царк. дзеяча Стафана Чацьвярцінскага (у мастве — Сыльвэстар), біскупа магілёўскага і беларускага (1707—1727).

**Сяргей Лескець**

# Пануры лятун

Новы спорт-ідал фін Ян Аханэн прыехаў скакаць, а ня сьмешкі строіць.

«Як мы, спартоўцы, называем тых, хто так скача? Ёсьць толькі адно добрае слова: прахвост!» — гаворыць паляк Адам Малыш пра пераможцу Турнэ чатырох трамплінаў і лідэра Кубку сьвету Яна Аханэна.

У журналістаў Аханэн у пячонках сядзіць. «Чаму я зноў выйграў? Адкуль мне ведаць? Хіба я разьбіраюся» — ягоныя тыповыя адказы.

На прэс-канфэрэнцыях ён больш лякянічны, абмяжоўваецца словамі «Так», «Не», «Ня ведаю». На пытаньні аб плянах на найбліжэйшы чэмпіянат адказвае нязьменна: «Перамагчы».

Крый божа, каб які-небудзь журналіст-пачатковец запытаўся, чаму ён ніколі не ўсьміхаецца пасьля скачкоў, асабліва пасля тых, якія прыносяць чарговую перамогу. «Скокніце з гэтага трампліну і праляціце 120 мэтраў, як я, а потым паглядзім, ці будзе вам да сьмеху», — пачуў нямецкі калега. Адказ «Мы сюды прыехалі скакаць, а ня сьмешкі строіць» нават зрабіўся эпіграфам на ягонай інтэрнэт-старонцы.

У гэтым увесь фін Ян — самы пануры сярод скакуноў, вечны маўчун, які ніколі не ўсьміхаецца і толькі нядаўна перастаў скакаць у масцы.

«Маска яшчэ больш падкрэсьлівала ягоны змрочны імідж, ён выглядаў у ёй як лорд Дарт Вэйдэр з "Зорных войнаў". Але ён заявіў, што яна прыносіць яму няўдачу, і цяпер стартуе ў ахоўных акулярах. Ад Вэйдэра застаўся хіба пануры характар», — гаворыць адзін фінскі журналіст. На ягоную думку, панурасьць — гэта старанна выбраны імідж Яна, які неяк заявіў: «Чым больш я буду маўчаць, тым больш мной будуць цікавіцца». На вэб-сайце www.janne-ahonen.com на адным з банэраў стаіць у споднім з крыламі, што вырастаюць з голых плеч, на другім — пазіруе ў элегантным гарнітуры. Спонсарам змрочны імідж Яна не замінае.

## Іншы Аханэн

А з аповедаў фінскіх журналістаў паўстае іншы Аханэн. Менавіта Ян выконвае ў фінскай камандзе ролю веселуна, які разраджвае напружаную атмасфэру. Часта жартуе зь сяброў. Аддае перавагу, аднак, чорнаму гумару. Напрыклад, перажыўшы два гады таму падзеньне падчас чэмпіянату ў Гарміш-Партэнкірхене, перад чарговымі спаборніцтвамі ў Інсбруку ён сказаў свайму асыстэнту: «Ты мне толькі ўжо не шмаруй іртаў так добра, бо я не зьбіраюся так далёка лётаць».

Пачынаў Аханэн ва ўзросьце пяці год у родным Лахці. Ягоны бацька працаваў краўцом, маці — на фабрыцы рыбалоўных снасьцяў. Брат Пасі таксама займаецца скачкамі з трампліну.

У 1993 годзе, ва ўзросьце 15 год, Ян стаў чэмпіёнам сьвету сярод юніёраў. Але на Алімпійскіх гульнях у Лілехамэры ён нават ня трапіў у дваццатку. Няўдача не зламіла Яна, ён ня стаў, як гэта часта робяць іншыя скакуны, шукаць суцяшэньня ў бутэльцы. Замест гэтага ўзяўся за працу і ўжо ў наступным сэзоне заняў трэцяе месца на чэмпіянаце сьвету.

З таго часу ён заваяваў восем мэдалёў на Алімпійскіх гульнях ды сусьветных чэмпіянатах, а таксама тройчы выйграў Турнэ чатырох трамплінаў. Але ніколі не ўзвышаўся над усімі так, як цяпер, ніколі ня быў сэрыйным пераможцам. Выйграўшы ў 1999 годзе Турнэ чатырох трамплінаў упершыню, ён ні разу не станавіўся на найвышэйшы подыюм.

Праз гады яму спадарожнічала слава «вечна другога», прафэсіянала, які ня ўмее выйграваць у важных момантах.



AP

## Сям'я — сэнс жыцьця

Паводле слоў былога трэнэра Аханэна Міка Каянкоскі, так адбывалася таму, што Аханэн ніяк ня мог пачаць ставіцца да спорту ўсур'ёз. Ён зьмяніў падыход толькі тады, калі наладзіў сваё сямейнае жыцьцё — ажаніўся з Тыяй, якая нарадзіла яму сына Міка (сёньня хлопцу тры гады, і ён ужо скача з трампліну, які мама з татам будуюць на стале). Ян сам спраектаваў сабе дом і сам яго пабудаваў.

«Гэта ня значыць, што раней ён ставіўся да скачкоў несур'ёзна, проста любіў пагуляць. Форма, якой ён дасягаў за дзень, зьнікала ў начных забавах… Цяпер жонка трымае яго на кароткім павадку. Яну ёсьць да каго вяртацца. Ён мусіць зарабляць на сям'ю», — тлумачыць Каянкоскі.

Сам Аханэн глядзіць на гэта крыху інакш: «Тады скачкі былі ўсім маім жыцьцём, усё круцілася толькі вакол іх. Сёньня, маючы жыцьцё і па-за спортам, я адчуваю сябе дужэйшым. Мая жонка робіць мяне шчасьлівым, мой сын робіць мяне гордым».

На думку многіх экспэртаў, таямніца ягонай фантастычнай формы ў тым, што ён адмовіўся ад барацьбы за летняе Гран-пры. Усё лета прысьвяціў стартам у гонках драгстэраў — гэта экіпажы, якія нагадваюць падоўжаныя баліды «Формулы-1» з паперы, якія набіраюць хуткасьць 530 км/г за 4,5 сэкунды. Ён выйграў чэмпіянат Фінляндыі і ўсёй Скандынавіі.

«Гонкі? Яны ня мелі ніякага ўплыву на маю цяперашнюю форму. Я трэніраваўся ўлетку гэтаксама, як і апошнія 15 год, з тым самым асабістым трэнэрам Арымам Саукам. Адкуль такія посьпехі? А скуль мне ведаць? Мо ты мне растлумачыш?» — сказаў ён перад чацьвертым, заключным, этапам Турнэ чатырох трамплінаў, што прайшоў пры канцы мінулага тыдня ў аўстрыйскім Бішафсхофэне.

Аханэн хоць і саступіў гаспадару трампліна Марціну Халварту, утрымаў першае месца ў агульным заліку «Турнэ». А ў агульным заліку Кубку сьвету фін мае балаў удвая больш, чым той жа Халварт ці чэх Якуб Янда.

**Сяргей Петрыкевіч; паводле gazeta.pl**

## СЬЦІСЛА

### Шляхам Альгерда

Чэмпіён Беларусі па футболе менскае «Дынама» адправілася ў Маскву на традыцыйны Кубак чэмпіёнаў Садружнасьці. Апанэнтамі па падгрупе «А» будуць талінская «Левадыя», «Кайрат» (Алматы) ды юнацкая зборная Расеі, што выступае па-за конкурсам. Матчы пройдуць 15, 16 і 17 студзеня. У 1/4 фіналу, які пройдзе 19 студзеня, выходзіць пераможца групы.

### Пабілі італьянцаў

У сераду ў матчы кваліфікацыйнага турніру да чэмпіянату Эўропы мужчынская гандбольная зборная Беларусі бліскуча перамагла італьянцаў — 35:24. У нядзелю — матч у адказ. Потым — 19 і 22 студзеня — дзьве гульні з Кіпрам. Каб трапіць у наступны этап, трэба заняць другое месца ў падгрупе.

### У другім эшалёне

Няўдала выступаюць у гэтым сэзоне беларускія біятлёністы на этапах Кубку сьвету. У нямецкім Абэргофе яны зноў засталіся без мэдалёў. У індывідуальных гонках найлепшы вынік паказала Алена Зубрылава, што заняла 6-е месца ў спрынце. Астатнія — і мужчыны, і жанчыны — нават у дзясятку ня траплялі. У агульным заліку пасьля чатырох этапаў сярод жанчын першае месца ў немкі Ўшы Дызль (330 балаў), Алена Зубрылава — 13-я (195). У мужчын у лідэрах француз Рафаэль Пуарэ (426 балаў), Аляксандар Сыман знаходзіцца на 39-й пазыцыі (33). У гэтыя пятніцу і суботу пройдуць спрынтэрскія гонкі ў жанчын і мужчын, у нядзелю — гонкі пераследу.

### Баранаў вяртаецца ў Каралявец

Паўабаронца футбольнай зборнай Беларусі Васіль Баранаў зь вясны будзе выступаць за калінінградзкую «Балтыку». Форвард, які ў складзе маскоўскага «Спартаку» чатыры разы заваёўваў мэдалі расейскага чэмпіянату, якраз пачынаў свой легіянэрскі этап у «Балтыцы». Перад калінінградзкім клюбам стаіць задача — вярнуцца ў першы дывізіён.

### Кутузаў забівае на «Сан-Сыра»

Форвард зборнай Беларусі Віталь Кутузаў забіў другі гол у італьянскім футбольным чэмпіянаце. Праўда, посьпех беларуса не дапамог ягонай «Сампдорыі» ў гасьцявым матчы (9 студзеня) супраць «Інтэру». Нягледзячы на тое што Віталь забіў за сем хвілін да канца сустрэчы, мілянцы хуценька мабілізаваліся і правялі тры мячы ў адказ — 3:2.

### Крыкунова сурочылі

Маскоўскаму «Дынама» не пакарыўся хакейны кантынэнтальны кубак, што прайшоў у вугорскім Сэкешфэхервары. Выхаванцы экс-трэнэра зборнай Беларусі Ўладзімера Крыкунова ў вырашальным матчы саступілі славацкаму «Зволену» зь лікам 1:2 і занялі другое месца. Дзесяць разоў клюб выходзіў у фіналы кубкаў — і ніводнага разу ня браў тытулу.

### Мірнага баяцца

Макс Мірны без барацьбы выйшаў у ¼ фіналу тэніснага турніру ў аўстралійскім Сыднэі. Швэд Ёахім Юхансан у першым сэце адмовіўся ад далейшае барацьбы зь беларусам, спаслаўшыся на траўму. У чвэрцьфінале Мірны сустрэнецца з Тэйларам Дэнтам (ЗША).

**Алег Раявец**

# UFO



# над Вялікім Княствам

СЯРГЕЙ БАЛАХОНАЎ

Айчынныя ўфолягі працягваюць шукаць сякеру сваіх зацікаўленьняў у Сібіры ці ў Нью-Мэксыка. А сякера спакайнютка ляжыць пад беларускай лавай. Інфармацыю пра неапазнаныя лятаючыя аб'екты над Беларусьсю ў даўнія часы — часы легендарнага Вялікага Княства Літоўскага — пры жаданьні можна знайсьці ў тагачасных хроніках. Руплівыя летапісцы і нядбалыя мэмуарысты, прыкмячаючы над галавою дзівосныя перамены, імкнуліся пакінуць пра гэта нататкі. Іх апісаньні можна трактаваць-тлумачыць па-рознаму. Савецкая навука залічвала падобныя гістарычныя зьвесткі альбо ў шэрагі забабонаў, альбо ў сьпісы рэдкіх прыродных зьяў накшталт гало. Сёньня ж кожны мае права самастойна вырашаць для сябе пытаньне: UFO ці гало.

У 1202 г., калі, паводле некаторых зьвестак, нарадзіўся будучы заснавальнік Вялікага Княства Літоўскага князь Міндоўг, у нябёсах над нашай часткай Эўропы адбывалася штосьці зусім вылучнае: «Быша знаменія многи на небясі»: а пятай ночы неба стала красным, як кроў. Чырвань неба нагэтулькі ўражвала людзкое вока, што нават сьнег уяўляўся чырвоным.

Разнастайныя нябесныя вычуды праяўляліся і надалей. Летапісцы фіксавалі зьяўленьне ў небе адразу некалькіх сонцаў, несапраўднага месяца, усялякіх дугаў, рагоў, слупоў, крыжоў (1204, 1222, 1278, 1370, 1430 г.). Прыкладам, у 1403 г. на нябесным зводзе «явішася які тры сонцы, ад ніх жа ісхажаху лучы сіні, зялёны, баграны», а потым пасярodку Месяца «явіся хрэст вялік», які «стаяў споўчаса». Летапісцу яўна не ставала лексычных сродкаў, каб належным чынам апісаць убачаныя аб'екты.

Без малога праз паўтара стагодзьдзя, у кастрычніку 1542 г., над нашымі продкамі «ўзьявіліся сьветлыя слупы», якія «зьбіраліся ў адзін слуп вялікі», пасьля чаго разышліся ў супрацьлеглыя кірункі сьвету і зьніклі.

На пачатку 1701 г. таксама льга было ўбачыць тры сонцы — адно вышэй, а два ніжэй. «Вышэйшае было звычайным, а ніжэйшыя былі цямнейшыя і мелі праменьні, як бы трубы… Потым гэтыя два згінулі, на што мы самі глядзелі», — адзначыў магілёвец Трафім Сурта.

Гэткія зьявы выклікалі прымхлівае трымценьне. Іх уважалі за злыя знакі, папярэджаньні пра няшчасьці. А вось Міхал Казімер Радзівіл у нябеснай зьяве пад Карэлічамі (3 красавіка 1737 г.) злога знаку ня ўбачыў, дарма што быў забабонным чалавекам. Апісаны ім фэномэн у чымсьці напамінае велізарны касьмічны карабель з галівудзкіх фільмаў: «…паўмесяц быў долу абернуты праз усё неба, аднак жа над гарызантальнай лініяй канчаючыся. А гэты месяц быў агністы, на канцы аднаго рога былі роўна бачныя тры зоркі, зь якіх дзьве першыя зьніклі, а нарэшце і трэцяя [прапала] безь ніякай хмары, за каторым зьнікненьнем і той месяц disprujt (зьнік. — **СБ**)». Менскі ваявода Крыштаф Завіша згадваў, што ў 1721 г. на небе тры сонцы і слупы ня проста віселі, але «гучна змагаліся між сабой».

Здаецца, з нашых продкаў ніхто не глядзеў на фальшывыя сьвяцілы як на артэфактуру незямное цывілізацыі. Рэлігійныя перакананьні выбіцца на такую вэрсію замінялі. Нехта Ю.Мышкоўскі, гарадзенскі прафэсар філязофіі XVIII ст., сьцьвярджаў: «Бог мог стварыць плянэты заселенымі, хоць на іх, хутчэй за ўсё, ніхто не жыве».

Фіксаваліся і выпадкі, калі ў небе мроіліся чалавечыя постаці. У 1291 г. «стаяху ўбо ў ношчы на воздусе яка полк воінскі» на поўначы і на поўдні. У 1547 г. у Вільні «на аблоках уночы былі відны воіны, каторыя вялі між сабой страшную бітву». У 1566 г. мэмуарысту Фёдару Еўлашоўскаму на заезным двары ў Дарагове прыпаткаўся «агністы чалавек», якога шляхціц спрабаваў ударыць нажом. Тодар растлумачыў для сябе праяву як вынік чумных галюцынацый. За сёньняшнім часам той «агністы чалавек» усpрыняўся б за гуманоіда-іншаплянэтніка.

## ЯПОНСКАЯ КРЫЖАВАНКА

Лічбы па вертыкалях (слупкі 1–25, зьверху ўніз):

| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 4 | 4 | | | | | | | | | | | | | | 5 | | | | | |
| | | | 7 | 2 | 3 | | | | | | | | | | | | | | 4 | 9 | | | | |
| | | 5 | 2 | 1 | 1 | 2 | 2 | 2 | | | | | | | | | | 4 | 1 | 2 | 6 | | | |
| | | 2 | 2 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 2 | 1 | | | | 2 | 2 | 2 | 2 | 7 | 1 | 1 | 2 | 3 | 3 | |
| 3 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 7 | 10 | 10 | 10 | 2 | | | 1 | 2 | 1 | 1 | 1 | 3 | 1 | 1 | 1 | 2 | 2 | |
| 4 | 2 | 3 | 3 | 2 | 2 | 6 | 2 | 2 | 2 | 10 | 12 | 12 | 12 | 10 | 10 | 10 | 9 | 2 | 6 | 3 | 2 | 2 | 5 | 4 |

Лічбы па гарызанталях (радкі 1–25):

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 7 |
| | | | | | | 9 |
| | | | | | 7 | 4 |
| | | | | | 9 | 7 |
| | | | | | 4 | 3 |
| | | | | | 7 | 2 |
| | | | 2 | 1 | 1 | 3 |
| | | | 4 | 5 | 2 | 1 |
| 1 | 4 | 2 | 3 | 2 | 3 | 1 |
| | | | | 1 | 15 | 2 |
| | | | 2 | 13 | 1 | 1 |
| | | | 3 | 13 | 3 | 1 |
| | | | | | 20 | 1 |
| | | | | | 13 | 3 |
| | | | | | | 22 |
| | | | | | 3 | 11 |
| | | | | | 2 | 19 |
| | | | | 1 | 16 | 3 |
| | 1 | 2 | 2 | 5 | 2 | 1 |
| | | 1 | 1 | 2 | 2 | 1 |
| | | | 2 | 2 | 2 | 1 |
| | | | 1 | 2 | 2 | 1 |
| | | | | 2 | 2 | 1 |
| | | | | 1 | 2 | 2 |
| | | | | | 1 | 1 |

Склаў Аляксандар Ворвуль

## КАІСА

# Чэмпіён краіны ў рэжыме online

Чэмпіён краіны ў рэжыме online Андрэй Малюш, якога летась праз інтрыгі не ўзялі на сусьветную шахматную алімпіяду, зладзіў перад Калядамі на сайце «Беларускія шахматы» прэс-канфэрэнцыю. Пытаньняў да прапаршчыка міліцыі было шмат — як шахматных, так і жыцьцёвых.

Пры канцы прэс-канфэрэнцыі А. Малюш выклаў прапановы да нечарговага зьезду фэдэрацыі шахмат (пройдзе 29 студзеня) ды падзяліўся ідэяй пра збор сродкаў на буклет пра ўсіх, цягам 70 гадоў, чэмпіёнаў Беларусі па шахматах.

Ад віртуальнай прэс-канфэрэнцыі выйграў і сайт bychess. narod.ru, які на працягу двух год на ўласныя сродкі падтрымлівае малады праграміст з Горадні, выпускнік БДУ Павал Макевіч.

**ВР**

### Некаторыя пытаньні і адказы з форуму «Беларускіх шахмат»:



Андрэй Малюш

**— Хто найбольш небясьпечны праціўнік у фінале?**

— На жаль, склад Вышэйшай лігі яшчэ ня вызначаны. Зь Першай лігі наймацнейшы — Юра Ціханаў.

**— Хто мае найбольш рэальныя шанцы стаць новым чэмпіёнам?**

— Кожны з гросмайстраў і Андрэй Жыгалка будуць змагацца за чэмпіёнства. А шанцы перад першым турам ва ўсіх роўныя.

**— Ці згодны Вы ў будучыні стаць рэклямным абліччам беларускіх шахмат?**

— Звычайна рэклямнае абліччa — дзяўчына. Цяперашняя чэмпіёнка РБ да 20 гадоў — вельмі сымпатычная. Дый удзельніца алімпійскай каманды Беларусі Аня Шарэвіч ужо мае здымкі, якія так і просяцца на вокладку часопіса.

### Як бы вы згулялі?

**Ю.Ціханаў — А.Малюш. Менск, 2004. Ход белых. Чорныя адсталі ў разьвіцьці, іх фігуры заціснуты на апошніх лініях…**



## ПАРТЫЯ З ГРОСМАЙСТРАМ



**Як ні дзіўна, большасьць чытачоў выбралі на 1. b4 адказ 1… a5?! (З.Лыбін прызнаўся, што найбольш апасаўся лягічнага ходу 1...e5, пасьля якога белыя, на яго думку, стаяць сумнеўна). Гросмайстар рухае пешку напeрад: 2. b5! Чакаем на Вашыя ліставаньні да панядзелка, 19:00.**

**ЯК БЫ ВЫ ЗГУЛЯЛІ?**

**З. Лыбін — чытачы «НН». Ход чорных.**

**Адказ:** 1. Kd5! cd 2. Cd5 з двайным ударам на b7 і f7. Пасьля 2...Фс7 3. Сf7+ Кpd8 4. e3 вопытны міжнародны майстар паступова прабіў абарону чорных. Адзіная партыя, прайграная А. Малюшам у 70-м чэмпіянаце краіны.

## ТЭАТАР

**Опэра**
**13** (чц) — «Вечар старадаўняга рамансу».
**15** (сб) — «Хаваншчына».
**18** (аўт) — «Князь Ігар».

**Балет**
**14** (пт) — «Лебядзінае возера».
**16** (ндз) — «Легенда аб Уленшпігелю».

**Купалаўскі тэатар**
**13** (чц) — «Чорная панна Нясьвіжу».
**14** (пт) — «Згублены рай».
**Малая сцэна**
**14** (пт) — «Налу».

**Тэатар беларускай драматургіі**
**13** (чц) — «Па старонках маёй памяці».
**14** (пт) — «Містэр Розыгрыш».
**15** (сб) — «Палёты з анёлам».
**15** (сб) — «Нязваны госьць».
**Малая сцэна**
**16** (ндз) — «Адэль».

**Тэатар імя Горкага**
**13** (чц) — «Адзіны спадчыньнік».
**14** (пт) — «Тэрмінова патрабуецца... самагубца».
**15** (сб) — «Перад заходам сонца».
**16** (ндз) — «Анджэла і іншыя».
**Малая сцэна**
**23** (ндз) — «Рулетка».

**Тэатар-студыя кінаактора**
**13** (чц), **14** (пт) — «Міленькі ты мой».
**15** (сб), **16** (ндз) — «Філюмэна Мартурана».
**17** (пн) — «Майстар і Маргарыта».
**18** (аўт) — «Мілы хлус».

**Музычны тэатар**
**13** (чц) — «Арфэй і Эўрыдыка».
**14** (пт) — «Капялюш Напалеона».
**15** (сб) — «Кажан».
**16** (ндз) — «Цыганскі барон».

**Зьніч**
**17** (пн) — «Прыпадаю да нябёс».
**19** (ср) — «Белы сон».

**Моладзевы тэатар**
**14** (пт), **15** (сб) — «Банкрут».
**16** (ндз) — «На вачах у жаночай берагавой аховы».

**Тэатар эстрады**
**14** (пт), **15** (сб) — «Прывітаньне, Стары Новы год!».

**Новы драматычны тэатар**
**20** (чц) — «Зацюканы апостал».

## ІМПРЭЗЫ

**EGOізмы**
**20 студзеня** ў Чырвоным касьцёле адбудзецца прэзэнтацыя кнігі Сяргея Абламейкі «EGOізмы». Пачатак а 18-й.

**Вера. Надзея. Любоў**
У Палацы мастацтваў (Казлова, 3) **да 31 студзеня** працуе выстава нетрадыцыйнай аб'ёмнай вышыўкі Тамары Багданавай «Вера. Надзея. Любоў».

**Батык**
У выставачнай залі абласнога Цэнтру народнай творчасьці (бібліятэка імя Пушкіна, вул.Гікалы, 4) **да 10 лютага** працуе выстава батыку Іларыі Вечар.

# Карціны з радзімы Быкава


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**15 студзеня а 15-й у Віцебску адчыніцца выстава паводле вынікаў праведзенага ўлетку на радзіме Васіля Быкава пленэру. У залі Цэнтру сучаснага мастацтва (вул.Белабародава,5) прадставяць творы больш за 25 мастакоў. Паводле дамоўленасьці з Коласаўскім тэатрам, у гэты дзень на ягонай сцэне будзе адмыслова паказаны спэктакль «Стрэл у тумане» паводле аповесьці Васіля Быкава. У лютым выстава мае прыехаць у менскі Чырвоны касьцёл.**

**Міхал Чарвінскі**

**На фота: у часе пленэру. Зямляк і сябар дзяцінства Васіля Быкава Сямён Быкаў із сваім уласным партрэтам. Бычкі. Вушаччына**

**Варшаўская акадэмія выяўленчага мастацтва**
**18 студзеня** (у аўторак) у музэі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (пр.Ф.Скарыны, 81а, 5-ты паверх) а 17-й гадзіне адбудзецца адкрыцьцё выставы выкладчыкаў Акадэміі выяўленчага мастацтва ў Варшаве Артура Вінярскага і Анджэя Рысіньскага. **18 студзеня** аб 11 гадзіне ў малой студэнцкай залі студэнцкага тэатру БДАМ (2-і паверх) пачнецца лекцыя Анджэя Рысіньскага «Да 100-годзьдзя Акадэміі выяўленчага мастацтва ў Варшаве». **19 студзеня** а 10 гадзіне там жа пачнецца лекцыя Артура Вінярскага «Месца жывапісу ў сучасным мастацтве адносна найноўшых тэхналёгій».

**Вігілія**
**Да 28 лютага** ў «М-галерэі» Інстытуту імя Гётэ ў Менску (вул.Фрунзэ, 5) працуе выстава станкавай графікі Міхала Казлова. Міхал Казлоў праілюстраваў больш за 150 кніг. Найбольш вядомыя ягоныя малюнкі да кніг «Рабінзон Круза», казак Гофмана, «Прыгоды барона Мюнхаўзэна», «Як воўк калядаваў» Рыгора Барадуліна, а таксама станкавыя сэрыі «Старыя цацкі», «Парад», «Вігілія», «Мэтэарэльефы».

**«Паміж Паўночным морам і Беларусьсю» ды «Нямецкі інфармэль»**
У Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Скарыны, 47) **да 16 студзеня** працуе выстава «Паміж Паўночным морам і Беларусьсю» цыклю «Вялікае стварэньне формаў» Алены Юрыкавай (Нямеччына) — графіка, жывапіс, скульптура і фотакаляж. Там жа **з 18 студзеня да 20 лютага** працуе выстава Інстытуту міжнародных сувязяў (Штутгарт) «Бэрнард Шульцэ, Эміль Шумахер, Фрэд Тылер: Нямецкі інфармэль».

**Сын божы нарадзіўся і Калядныя матывы**
У бібліятэцы імя Талстога **да 1 лютага** працуе выстава графікі Арлена Кашкурэвіча «Сын Божы нарадзіўся». А на выставе «Калядныя матывы», якая працуе там жа таксама **да 1 лютага**, можна пагледзець творы Ігара Гардзіенкі, Сьвятланы Катаковай і іншых.

**Калядныя маразы**
**16 студзеня** клюб выходнага дня «Купалінка» Рэспубліканскага экалягічнага цэнтру дзяцей і юнацтва (вул.-Макаёнка, 8) запрашае на сьвяточную праграму «Калядныя маразы». Пачатак а 12-й гадзіне. Т.: 264-87-28.

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**Bronx (288-10-61)**
**13** (чц), 22.00 — Стары Новы год: dj Mitya, dj Kulikov.
**14** (пт), 22.00 — жывая музыка: «Flat».
**15** (сб). 23.00 — dj Gleb9 (Масква).

**Белая Вежа (284-69-22)**
**13** (чц), 23.00 — dj Mihel, dj Dee.
**14** (пт), 23.00 — dj Mihel, dj Dee.
**15** (сб), 23.00 — dj Mihel, dj Dee.
**16** (ндз), 23.00 — dj Alex.

**Гудвін (226-13-06, 626-13-03)**
**13** (чц), 20.00 — жывая музыка: джаз-трыё «N.C.». Стары Новы год: «Карнавальная ноч».
**14** (пт). 21.00 — жывая музыка.
**15** (сб), 21.00 — жывая музыка.
**17** (пн), 22.00 — жывая музыка.

**Бліндаж (219-00-10)**
**13** (чц), 23.00 — dj Egor.
**14** (пт), 22.00 — dj Egor.
**16** (ндз), 23.00 — dj Egor.

**X-Ray (223-93-55)**
**14** (пт), 22.00 — dj-bar.
**15** (сб), 21.00 — dj-bar.

## У МЕНСКІХ КІНАТЭАТРАХ

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Аляксандар»***: **14** (пт) 13.00, 16.30, 20.00; **15, 16** (сб, ндз) 13.00 (іл), 16.30, 20.00.
«Лемані Сьнікет: 33 няшчасьці»: **14** (пт) 16.40; **15, 16** (сб, ндз) 14.30, 16.40.
«Трое ў каноэ»: **14—16** (пт—ндз) 18.50, 20.40.
**«Берасьце»** (272-87-91)
«Тэрмінал»: **14** (пт) 18.40 (іл); **15, 16** (сб, ндз) 18.40.
«Трое ў каноэ»: **14** (пт) 16.40, 21.10; **15, 16** (сб, ндз) 14.00, 16.40, 21.10.
**«Дружба»** (240-90-13)
«Начная варта»: **14** (пт) 16.00, 19.00, 21.00; **15** (сб) 16.00 (іл), 19.00, 21.00; **16** (ндз) 19.00 (іл), 21.00.
**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Аляксандар»***: **14** (пт) 14.00, 17.10, 20.30; **15, 16** (сб, ндз) 14.00 (іл), 17.10, 20.30.
**«Масква»** (223-27-10)
«Аляксандар»***: **14** (пт) 17.20, 20.30; **15, 16** (сб, ндз) 14.00 (іл), 17.20, 20.30.
**«Мір»** (284-37-71)
«Лемані Сьнікет: 33 няшчасьці»: **14** (пт) 16.00, 18.10; **15, 16** (сб, ндз) 12.00 (іл), 14.00, 16.00.
«Давайце патанцуем»: **14—16** (пт—ндз) 17.00, 19.00, 21.00.
«Белыя цыпачкі»: **14** (пт) 20.20; **15, 16** (сб, ндз) 18.10, 20.20.
**«Перамога»** (223-77-66)
«Аляксандар»***: **14** (пт) 15.40, 19.00; **15, 16** (сб, ндз) 15.40 (іл), 19.00.
**«Піянер»** (227-64-87)
«Вам заданьне»: **14—16** (пт—ндз) 15.00.
«Чужы супраць Драпежніка»: **14—16** (пт—ндз) 17.00, 19.00, 21.00.
**«Цэнтральны»** (220-34-16)
«Давайце патанцуем»: **14** (пт) 11.00, 15.00, 19.00; **15, 16** (сб, ндз) 11.00 (іл), 15.00, 19.00.
«Трое ў каноэ»: **14—16** (пт—ндз) 13.00, 17.00, 21.00.

(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 гадоў не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 гадоў.

## ДЛЯ ДЗЕТАК

**Тэатар юнага гледача**
**15** (сб) — «Маленькі лорд Фаўнтлерой».
**16** (ндз) — «Каліф-Шавец».
**20** (чц) — «Маленькія трагедыі».
**21** (пт) — «Дзень нараджэньня ката Леапольда».

**Балет**
**16** (ндз) — «Тры парасяці».

**Тэатар беларускай драматургіі**
**15** (сб) — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвэй».
**16** (ндз) — «Хрустальны пантофлік».

**Музычны тэатар**
**15** (сб) — «Залатое кураня».
**16** (ндз) — «Бураціна.by».

## ЮНАМУ ГЛЕДАЧУ

**«Аўрора»**
«Гарэзы»: **14** (пт) 14.30; **15, 16** (сб, ндз) 12.30.
**«Берасьце»**
«Горад чарадзеяў»: **15, 16** (сб, ндз) 12.00.
**«Дружба»**
«Гарфілд»: **14** (пт) 12.00, 14.00; **15** (сб) 11.00, 13.00.
**«Мір»**
«Нязнайка і Барабас»: **14** (пт) 15.00; **15, 16** (сб, ндз) 13.00, 15.00.
**«Перамога»**
«Браток медзьведзяня»: **15, 16** (сб, ндз) 14.00.
**«Піянер»**
«Эліна, быццам мяне і не было»: **14** (пт) 11.00; **15, 16** (сб, ндз) 13.20.
«Мур-р-лі»: **14** (пт) 13.00; **15, 16** (сб, ндз) 11.40.
«Дзеці дажджу»: **15, 16** (сб, ндз) 10.00.

## КІНО Ў МЕНСКУ

# Аляксандар Піліпавіч: зь мітамі і Фройдам

Зьяўленьне на экранах біяграфічнага фільму пра Аляксандра Македонскага (выканаўца ролі — Колін Фарэл) суправаджалася скандалам. Грэцкія юрысты абяцалі судовыя працэсы за абразу гонару й годнасьці антычнага героя, які паказаны ў фільме бісэксуалам. І хоць, паводле стужкі, галоўная любоўная муза Аляксандра — сябра Гефэстыён (Джарэд Лета; Брэд Піт своечасова адмовіўся ад рызыкоўнай ролі), рэжысэр і сцэнарыст Олівэр Стоўн — далёка ня Пэдра Альмадовар.

Сама скандальным падаецца выбар Анджэліны Джолі на ролю матулі Аляксандра. Акторка ўсяго на год старэйшая за Коліна Фарэла — і таму інцэставыя матывы ў фільме выглядаюць вельмі сьвежымі. Але Стоўн чытаў ня толькі Фройда, але й старажытныя міты: менавіта зварот да іх выглядае ўдалым і трапным. Героі «Аляксандра» будуюць сваё жыцьцё паводле антычных легендаў, змрочныя выявы якіх рэфрэнам праходзяць праз фільм.

Рэжысэра цікавяць вытокі заходняй цывілізацыі й яе экспансія. Батальныя сцэны — гэта сапраўдны падарунак для вока. Бітва пры Гаўгамэлах паказана праз птушыны позірк, а ў бойцы са сланамі — самы відовішчны эпізод карціны — лісьце расфарбаванае ў чырвоныя колеры.

Акторская гульня выклікала спрэчкі, але нельга не заўважыць, што роля Аляксандра — ці не найлепшая ў кар'еры Коліна Фарэла.

Праўдаруб Стоўн скардзіўся, што кансэрватары праваліці карціну ў пракаце, што варта было скараціць яе на гадзіну, што трэба было прыбраць нудны голас Энтані Хопкінса за кадрам.

Фільм на антычную тэму выглядае ледзьве не сучаснай палітычнаю стужкаю. А Аляксандар Македонскі — першы глябаліст, які марыць пра адзіны й гвалтоўны кацёл народаў. Вось толькі лявак Стоўн, аўтар «Узводу» і «Забойцаў ад нараджэньня», сьпявае імпэтную высокабюджэтную хвалу амэрыканскаму імпэрыялізму — ці прарочыць яго непазьбежную сьмерць?

**Андрэй Расінскі**

«Аляксандар» («Alexander»)
ЗША—Вялікабрытанія—Нямеччына—Нідэрлянды, 2004, каляровы, 175 хв.
**Жанр:** біяграфічны фільм, пэплюм.
**Адзнака:** 5,5 (з 10)


WWW.MOVIEWEB.COM

# Тэст на рэвалюцыйнасьць

ЛЕВЫМ ВОКАМ



**Сотыя ўгодкі першае расейскае рэвалюцыі, якая пачалася з «крывавай нядзелі» 9 студзеня 1905 г., БТ праігнаравала. Цалкам зразумела, калі прыгадаць, што 7 лістапада ў Гомелі міліцыя павінціла студэнтаў за плякат «Далоў самадзяржаўе». Галоўныя лёзунгі і мэты той рэвалюцыі — свабода прэсы і сходаў, дэмакратычны парлямэнт, прафсаюзныя правы — дасюль не згубілі актуальнасьці. У такіх умовах лягічна замоўчваць 1905 год. Апазыцыя, наадварот, асуджана на тое, каб раскручваць спадчыну рэвалюцыі. Такім чынам, мадэль інтэрпрэтацыі падзей стогадовай даўніны можа разглядацца як лякмусавая паперка вашае грамадзянскае пазыцыі.**

**Хто вы — апазыцыянэр, ляяліст або пафігіст? Праверце сябе з дапамогай тэсту, абраўшы варыянты адказаў на наступныя пытаньні («А» — 1 бал, «Б» — 2 балы, «В» — 3).**

**1. Як адрэагавалі жыхары мястэчка Крынкі на Гарадзеншчыне на навіну, што ў Піцеры 9 студзеня 1905 г. улады расстралялі мірную маніфэстацыю?**

А. Правялі малебен за стабільнасьць у грамадзтве.

Б. Ніяк не адрэагавалі, бо ня выйшлі са стану калядна-навагодняга запою.

В. Разграмілі ўсе дзяржаўныя і паліцэйскія ўстановы і на 24 гадзіны захапілі ўладу ў мястэчку.

**2. На гэтым участку сёньняшняга праспэкту Скарыны (у 1905—1907 г. вул.Захар'еўская) знаходзілася:**



А. Афішная тумба, на якой апэратыўна асьвятляўся ход міжнароднага турніру па крыкеце сярод аматараў на Кубак губэрнатара.

Б. Помнік «Скрыжаваньне ўсіх шляхоў губэрні».

В. «Біржа» — тусоўка грамадзян, на якой дыскутаваліся акцыі супраціву.

**3. Што гэта за будынак, дзе падчас рэвалюцыі давялося пабываць Якубу Коласу?**



А. Дом літаратара Менскай губэрні.

Б. Віла народнага пісьменьніка ў прэстыжным раёне Менску.

В. Пішчалаўскі замак — турма, дзе Канстацін Міцкевіч быў зьняволены за ўдзел у нелегальным сходзе настаўнікаў.

**4. Што адлюстраваў мастак на гэтым малюнку, які за часамі БССР быў уключаны ва ўсе падручнікі гісторыі?**



А. Адпраўка жаўнераў на вучэньні «Шчыт імпэрыі — 1905».

Б. Штурм дачнікамі электрычкі на ст. «Баранавічы-Палескія».

В. Выступ жаўнераў у Баранавічах 11 студзеня 1906 г. Падчас мітынгу жаўнеры, якія не жадалі ехаць у Маскву душыць паўстаньне, жорстка зьбілі генэрала Арцем'ева. Афіцэры адкрылі агонь.

**5. Адкуль эсэр Пуліхаў узяў грошы на падрыхтоўку замаху на губэрнатара Курлова, які аддаў загад расстраляць народную дэманстрацыю 18 кастрычніка 1905 г. у Менску?**

А. Атрымаў грант ад фонду Ротшыльда.

Б. Пазычыў у цешчы, сказаўшы, што не хапае на ўступленьне ў будаўнічы каапэратыў.

В. Грошы на дынаміт яму даў буйны землеўладальнік Бонч-Асмалоўскі — раней прадстаўнік менскай эліты выступілі ініцыятарамі пэтыцыі за адстаўку Курлова.

**6. За што ў сакавіку 1906 г. зь Менскай мужчынскай гімназіі былі выключаны 16 вучняў?**

А. За тое, што забілі на заклік «Саюзу імпэрскай вернападданай моладзі» выйсьці на суботнік па будаўніцтве губэрнскай бібліятэкі.

Б. За тое, што былі застуканы дырэктарам у прыбіральні, дзе курылі папяросы «Ластаўка».

В. За ўдзел у маніфэстацыі ў падтрымку эсэра-тэрарыста Пуліхава.



**7. Гэтая паэтка прысьвяціла верш забойству эсэрам Каляевым вялікага князя Сяргея Аляксандравіча ў адплату за тое, што князь аддаў загад гвалтоўна разагнаць апазыцыйную дэманстрацыю. Як яе завуць?**

А. Ірына Халіп.

Б. Паэзіяй не цікаўлюся, таму ня ведаю. Затое магу сьпець «А я лягу-прылягу».

В. Алаіза Пашкевіч (Цётка).

## Вынікі

**8—12 балаў**. Любы дзяржаўны рэжым, пры якім вам давялося жыць, вы разглядаеце па-фукуямаўску — як фінал гісторыі. Безумоўна, вы ўпэўнены, што 1905 год, як і наагул любая рэвалюцыя, штучна выкліканы габрэйскай змовай і замежнымі шпіёнскімі цэнтрамі.

**13—18 балаў**. Вам усё да фені, як загадвае беларускі Дао. Але маштабы сялянскіх бунтаў 1905 году, у якіх абавязкова ўдзельнічалі вашыя продкі, гавораць пра тое, што рэвалюцыйны гармон у вас прысутнічае. Проста сучасная апазыцыя ня ведае, як яго разбудзіць.

**18—24 балы**. Вы — закончаны апазыцыянэр. Веданьне таго факту, што ў 1905-м трохсотгадовая манархія ляснулася за адзін дзень, надае вам аптымізму і веры ў хуткі трыюмф дэмакратыі. Толькі ня трэба за гэта так шмат піць.

**Лёлік Ушкін,**
**левы псыхааналітык**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### КАЛЯДНАЯ АКЦЫЯ

**Калядная акцыя** ад коткі Калядкі. Патэлефануй і атрымай у падарунак кацяня (з дастаўкай па Менску). Мама — сіямка, добрая, як дыванок, разумная, як сабачка, ловіць мышэй. Тата — Цімох — тыповы беларус-лайдак. Дзеці — чорныя зь белымі лапкамі (адзін увесь чорны), беларускамяўныя (ратуйце, яны ўжо бегаюць!). Т.: 507-41-98 (увечары)

### ВІТАНЬНІ

**Любую майму сэрцу Жанчыну** Наталечку Бабіну віншую з нараджэньнем Сына. Гадуйцеся на шчасьце Айчыны! Ганна Матусэвіч

**Наталку, Дзіму, Полю і Тому Бабіных** віншуем з нараджэньнем Тараса. Хай выйдзе характарам і працавістасьцю падобны да бацькоў. Сваякі

**Барыса Мускага ды Ігара Янaчкіна** з днём Анёла! Будзьма шчасьлівыя ўжо тым, што мы пасьпелі спаткацца на Зямлі. Ганна Матусэвіч

### КАНТАКТЫ

**Берасьцейскія** хлопцы і дзяўчаты! Хочаце ўдасканаліць свае веды па беларускай мове? Дык прыходзьце ў клюб «Апостраф» (заняткі бясплатныя). Т.: 798-03-42. Наталька

**Хто забыўся рэчы** на танцавальнай вечарыне ў Палацы моладзі, зьвяртайцеся па тэлефоне: 262-02-90. Ірына

**Куплю** ўзнагароды БНР, БЦР, БКА, манэты ВКЛ, Рэчы Паспалітай, фота вайскоўцаў (Беларускія нацыянальныя фармаваньні часоў Другой сусьветнай вайны). E-mail: zmagar@yahoo.com. Т.: 722-46-04

**Цікавіць інфармацыя**, дакумэнты, фота, зьвязаныя з Булак-Балаховічам, «Зялёным дубам», «Чорным катом», беларускай партызанкай — набуду. E-mail: zmagar@yahoo.com. Т.: 722-46-04

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Кніга Паўла Севярынца** «Пакаленьне Маладога Фронту», новае выданьне з фатаздымкамі. Пытайце на выставе ТБМ (12.30—18.30) ад панядзелка да пятніцы ці на сядзібе БНФ

**Абмяняю кнігу** «Быкаў на «Свабодзе» на «Дуліны ад Барадуліна», прадам «Живописная Россия: Литовское и Белорусское Полесье». Т.:283-37-45

**Прадам кнігі**: Я.Сямашка, «Армія краёва»; энцыкляпэдыі «Этнаграфія Беларусі», «Археалёгія і нумізматыка Беларусі»; «Наша Ніва», факсымільнае выданьне 1910 г.; «Беларускі арнамэнт», аўт.Кацар (вялікі фармат). Т.: 8-029-753-70-05

**Прадам кнігі**: Говард, «Сучасная культурная антрапалёгія»; Л.Геніюш, «Белы сон»; «Беларуская кераміка», альбом; энцыкляпэдыю «Беларусь у ВАВ»; творы У.Галубка, Я.Пушчы, В.Маракова ды інш. Т.: 752-70-05

**Бясплатны абмен** беларускай музыкай у фармаце MP3 ды фільмамі на CD-R або CD-RW. Перасылка па пошце. Ёсьць дыск з Майдану. Лістуйце: kjp@tut.by

**Беларуская музыка** ў Слуцку. Вялікі выбар кампакт-дыскаў, аўдыёкасэт беларускай музыкі і ня толькі розных напрамкаў ды кірункаў на розныя густы ў павільёне №153 на Базарнай плошчы

**«Нацыяналізм у XX-м ст.»** Э.Сьміта, «Асновы дзяржаўнасьці Беларусі» М.Доўнар-Запольскага, «Курапаты» Зянона, іншыя кнігі можна атрымаць дарма (пры адной умове!) на сядзібе ТБМ. Тамсама вы знойдзеце «Arche», калядныя паштоўкі, аўдыё, відэа, CD, майкі, значкі. Румянцава, 13 (з панядзелка па пятніцу), 12.30 — 19.00. Т.: 8-029-707-40-01

**Беларускія кнігі**, CD, аўдыё, відэа ў Гомелі. Шырокі выбар. Т.: 45-11-51, 632-88-52 (толькі SMS)

**У Гомелі** можна набыць часопіс «Arche» №5/2001, №1—3/2002, №1—6/2003, №1—5/2004. Т.: 45-11-51

**Прадам кнігі**: Говард, «Сучасная культурная антрапалёгія»; Л.Геніюш, «Белы сон»; «Беларуская кераміка»; энцыкляпэдыю «Беларусь у ВАВ» 1990 г.в.; творы У.Галубка, Я.Пушчы, В.Маракова ды інш. Т.: 8-029-753-70-05

**Новыя ды старыя** нумары «Arche», «Армія Краёва на Беларусі» Я.Сямашкі, «10 бітваў» М.Чарняўскага, «Анталёгія беларускай народнай песьні» (з нотамі), іншыя кнігі, слоўнікі, часопісы, энцыкляпэдыі, калядныя паштоўкі, аўдыё, відэа, CD, футболкі з нацыянальнай сымболікай на ТБМ (Румянцава, 13) 13.00 — 19.00 (апрача суботы ды нядзелі). Т.: 707-40-01

**Прадаю даведнік** «Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусі» па Гарадзенскай вобл. (па цане выдавецтва; у кнігарнях няма), «Энцыкляпэдыю гісторыі Беларусі» (нядорага). Т.: 8-029-400-45-91

### ПРАДАЮ, КУПЛЮ

**Прадаю** кампутар Cyrix 200 MHz/128/4Gb/2Mb V/52x/FDD/USB/k/m — 70 у.а.; 14-цалевы манітор «IBM» — 30 у.а.. Т.: 8-029-553-97-34, 255-50-38

**Аранжавую накідку** ці балёневую куртку — танна набуду ці прыму ў падарунак. Т.: 221-21-81

**Прадам кітайскую ружу**, кітайскую цыбулю, альвас, кактусы, бэгоніі, герані, інжыр, розныя малочнікі. Т.: 221-21-81, Слава

### ПРАЦА

**Часопіс «Arche»** шукае адміністратара (распаўсюд і інш. тэхнічныя пытаньні) на палову стаўкі. Патрабаваньні: мужчына (прыйдзецца насіць пакункі з часопісам), мянчук, здольны да арганізатарскае працы. Праца штодзённая ці амаль штодзённая. Зьвесткі пра сябе накіроўваць на электронны адрас arche@arche.org.by

**Высокакваліфікаваная настаўніца** нямецкай мовы шукае працу (рэпэтытарства ці іншае). Рыхтую да паступленьня! Т.: 202-97-20. Раіса

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17.00. Т.: 235-18-72. Юры

### СПАЧУВАНЬНІ

**Управа і Сойм Партыі БНФ** выказваюць глыбокія спачуваньні Віктару Івашкевічу з нагоды сьмерці яго МАЦІ.

### К О Ш Т Ы

На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў) на стар. 16

**Рэклямныя расцэнкі:**

— да 20 словаў (тэкставы модуль) — 4100 руб.

За кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 4000 руб. Афармленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 кв. см. — 650 руб.

Абвесткі палітычнага характару і ад грамадзкіх арганізацыяў аплачваюцца паводле рэклямных расцэнак для камэрцыйных абвестак.

Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пераказаць грошы праз пошту на разьліковы рахунак: УНП 101115521. Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», вул.Калектарная, 11. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвэстбанк», код 764. На зваротным баку блянку паштовага пераказу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца дакладна й чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і абавязкова дадаецца сказ: «За рэклямныя паслугі».

Даведкі праз т. (017) 284-73-29

### НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Дзе купіць «Arche»

**Найтаньней у Менску — усяго за тры тысячы рублёў — часопіс «Arche» можна набыць у краме УП «Марат» па адрасе вул. Інтэрнацыянальная, 11а.**

Наша Ніва

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| карэктарка | Настасься Мацяш |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3500. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 21.00 12.01.2005.

Замова № 185.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а